беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НіВА

№ 29 (67)
21 кастрычніка 1996 г.

выходзіць у панядзелкі

Менск, 19 кастрычніка



Здымак Міхася Барэзны

Так шмат казалася, так шмат людзей рыхтавалася да 19 кастрычніка, што напярэдадні можна было здагадвацца — хада падзеяў будзе іншаю, чым гэта абвяшчалася (з абодвух бакоў). Вось чаму я абраў ролю зацікаўленага назіральніка збоку, для якога важныя як тэндэнцыі, так і індывідуальныя іх праявы. Камэнтар да падзеі — на старонцы 2.

Затрыманыя пасьля мітынгу

Сямёра прадстаўнікоў анархісцкіх арганізацыяў з Гомеля, Горадні й Масквы былі затрыманыя міліцыяй у Менску 19 кастрычніка.

Пасьля заканчэньня мітынгу «Ў абарону Канстытуцыі супраць дыктатуры» яны былі адсочаныя міліцыянтамі ў цывільным і арыштаваныя ў раёне ўнівэрсаму «Рыга» з дапамогай амону. Цяпер затрыманыя знаходзяцца ў менскім прыёмніку-разьмеркавальніку. Падставы затрыманьня на момант выхаду нумару невядомыя.

Севярын Квяткоўскі

Пікет каля пасольства РБ у Вільні

18 кастрычніка каля пасольства РБ у Літве адбыўся пікет беларускіх арганізацыяў.

Удзельнічала каля 50 чалавек пад нацыянальнымі сьцягамі. Выступілі актывісты Лявон Луцкевіч, Хведар Нюнька, Сяржук Вітушка, Лявон Кароль ды іншыя. Галоўны транспарант пікету: «Луканстытуцыі — не!» Было шмат паліцыі і прадстаўнікоў прэсы. **(БРАТ)**

Здымак Анатоля Клешчука

А р х і ў

Найважнейшы ўрок гісторыі

Статыстыка сталінскіх рэпрэсіяў

Ужо ад пачатку XX ст. тысячы ўраджэнцаў Беларусі воляю лёсу апынуліся ў Сібіры. Яшчэ ў часы сталыпінскай рэформы на поўначы Заходне-Сібірскага краю апынулася больш за 70 тысяч перасяленцаў пераважна з Гарадзенскай і Магілёўскай губэрняў. Узьнікла некалькі паселішчаў з карэннымі беларускімі назвамі, напрыклад: Бабровічы, Карпаўка, Лясовічы.

Упэрыяд масавай калектывізацыі — другая хваля. Паводле пастановаў упаўнаважанага прадстаўніцтва АГПУ ў БССР, судоў, рашэньнямі пасялковых саветаў дзясяткі тысяч жыхароў Беларусі былі прылічаныя да «контррэвалюцыйнага кулацкага актыву» і высланыя за межы сваёй гістарычнай Радзімы. Частка зь іх аказалася на поўначы цяперашняй Томскай вобласьці — у Нарымскім краі. Другая — у шматлікіх лягерах Сіблагу НКВД. У выніку толькі гэтай акцыі на поўнач за 1929-32 гады было саслана звыш 100 тысяч беларускіх сялянаў. Адныя зь іх загінулі, асабліва ў першыя гады высылкі, другіх напаткаў 1937 год, частка зьбегла і змагла недзе ўладкавацца, але шмат было схоплена і адпраўлена на Калыму, Ігарку і ў іншыя месцы зьняволеньня.

У 1937-38 г. у лягерах Сіблагу НКВД аказалася яшчэ каля 48 тысяч нашых землякоў, засуджаных судовымі і несудовымі органамі на тэрыторыі БССР. Асабліва актывізавалася дзейнасьць НКВД БССР і абласных «троек» зь ліпеня 1937 году, калі згодна з загадам «зьверху» на месцах былі складзеныя сьпісы на ўвесь «контррэвалюцыйны» элемэнт.

Пасьля гэтага ў Беларусі, Заходне-Сібірскім краі ды іншых рэгіёнах пачаліся масавыя арышты і фальсыфікацыі «контррэвалюцыйных справаў» па сумнавядомых артыкулах 63 КК БССР і 58 КК РСФСР. Сэнс гэтых акцыяў зводзіўся да «стварэньня» так званых «усесаюзных контррэвалюцыйных арганізацыяў»: «контррэвалюцыйнай шпіёнска-дывэрсійнай», «антысавецкай паўстанцка-тэрарыстычнай», «эсэраўскай шпіёнскай», «контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай фашысцкай», «Польскай арганізацыі вайсковай» і многіх іншых. Праця на старонцы 3.

Л і т а р а т у р а

КРАІНА ТУРМАЎ

Казка XX стагодзьдзя пад назваю «Краіна турмаў», якую латыскі пісьменьнік Віліс Лацыс напісаў у 1933 годзе, усьпрымаецца як зусім акутальны твор і сёньня.

У адной казачнай краіне Тарабумбіі адзін казачны міністар раптам адкрыў для сябе, што самае даходнае прадпрыемства ў дзяржаве — турмы. Чаму ж тады неператварыць у адну вялікую турму ўсю краіну? — задумаўся міністар, склаў плян і прыступіў да справы... Чытайце на старонцы 14.

ІРА вяртаецца

Зранку 8 кастрычніка «блукаю» на-стройкай радыёпрыймача ў эфіры (трэба ж нечым кампэнсаваць адсут-насьць 101,2). Раптам заўважаю; што на частотах BBC адбываецца нешта цікавае. Увесь час ідзе жывы рэпартаж, фон трансьляцыі якога пэрыядычна зьбіваецца на выцьцё паліцэйскіх аўтобусаў. Напружваю ўсе свае патэнцыі ў ангельскай. Гутарка ідзе пра нейкі выбух у офісе паліцыі. Рэфрэнам гучыць абрэвіятура І.Р.А. Усё зразумела: Ірлянская Рэспубліканская Армія разарвала мірныя пагадненьні з урадам Вялікабрытаніі. Такім чынам, вайна, якая пачалася амаль 80 гадоў таму, будзе працягвацца.

Я не сымпатызант ІРА, але, калі ёсьць падстава, чаму не прыгадаць гісторыю супрацьстаяньня ІРА і Брытанскага Імпэрыялізму, тым больш што яна вартая біблейскага міту або скандынаўскай сагі.

Давядацца пра вытокі ІРА вельмі проста. Шыбуйце ў бліжэйшую бібліятэку і спытайце «Жэрміналь» Заля ці «Маці» Горкага. Паспрабуйце адчуць ярасьць клясавых боек пачатку стагодзьдзя. Так, ІРА нарадзілася ў працоўным асяродзьдзі, падчас страйкаў, калі трэба было бараніцца ад паліцыі або штрэйкбрэхераў. У 1913 годзе ў часе страйку трамвайшчыкаў Дубліна сацыялісты Д.Канэлі і Л.Панкін прапанавалі працоўным стварыць атрады самаабароны, т.зв. Ірляндзкую Грамадзянскую Армію (ІГА). Ідэалёгія ІГА была падобная на ідэалёгію ўсіх нацыянальна-рэвалюцыйных арганізацыяў таго часу. На Украіне пра гэтую генэрацыю нацыяналістаў казалі так: «У адной кішэні ў іх Шаўчэнка, у другой Маркс». Левыя ідэі зьмянілі псыхалягічную ўстаноўку нацыянальных рухаў у бок рэвалюцыйнай барацьбы за радыкальныя зьмены, напракор эвалюцыйна-згодніцкім прынцыпам лібэралаў. У Ірляндыі гэтую згодніцкую плынь рэпрэзэнтаваў рух Home Rull, які змагаўся ў ангельскім парлямэнце за аўтаномію.

У 1914 г. [illegible] закон аб самакіраваньні Ірляндыі быў прыняты, праўда з адтэрміноўкай. Трэба было заахвоціць ірляндцаў ваяваць за Англію, бо пачыналася першая сусьветная вайна. Лёндан нават дазволіў ірляндцам ствараць уласныя мілітарныя фармаваньні (т.зв. «ірляндзкія валанцёры»). «Ірляндзкія валанцёры» былі створаныя, але большасьць зь іх ехаць на фронт адмовілася. Разам з ІГА яны прыяднаіся да руху Шын Фэйн (з гэльскай — Мы Самі). Лідары шынфэйністаў па сутнасьці прапагандавалі грамадзянскую непакору Англіі. Каралеўская адміністрацыя пачала была прымяняць да Шын Фэйну жорсткія санкцыі, але марна. Рэвалюцыйныя настроі пашыраліся ў ірляндзкім грамадзтве. І тады штабы валанцёраў і ІГА ўзялі курс на ўзброенае паўстаньне. Выступ прызначылі на Вялікдзень 1916 г. Літаральна напярэдадні стала вядома, што груз зброі зь Нямеччыны перахапіў ангельскі крэйсэр. Але, нягледзячы на хістаньне кіраўнікоў, вырашылі пачынаць. Зранку 6 траўня 400 чалавек рушылі ў бой. Працяг на старонцы 4.

Новы сцэнар

Так шмат казалася, так шмат людзей рыхтавалася да 19 кастрычніка, што напярэдадні можна было здагадвацца – хада падзеяў будзе іншаю, чым гэта абвяшчалася (з абодвух бакоў). Вось чаму я абраў ролю зацікаўленага назіральніка збоку, для якога важныя як тэндэнцыі, так і індывідуальныя іх праявы.

Усё ў той дзень у Менску пачыналася з ваганьняў на плошчы Якуба Коласа – адразу было незразумела, колькі людзей зьбярэцца на маніфэстацыю пасьля кампаніі запалохваньняў. З надзеяй ці з расчараваньнем прысутныя ўглядаліся ў натоўп, які пульсаваў – то пашыраючыся, то групуючыся. Многія распавядалі, што студэнтам панаставілі ў суботу па чатыры пары ды папярэдзілі, што за пропуск выганяць з унівэрсытэтаў. Але з тых, хто прыйшоў на плошчу, палову склала менавіта моладзь. Паводле сучасных менскіх рэаліяў гэта азначала тое, што маніфэстацыя зьбярэцца. І сапраўды, у свой шлях выправілася, паводле розных ацэнак, ад 20 да 30 тысячаў чалавек. Нямала народу чакала іхняга прыходу каля Опэрнага тэатру – месца дазволенага мітынгу. Недазволенае шэсьце тым часам рушыла праз горад. Быў той нячасты, але ўжо не зусім экзатычны момант нашай сучаснай гісторыі, калі ў Менску можна было пабачыць бранятэхніку на баявым заданьні. Антураж, які стварылі ўлады, сапраўды спрацаваў супраць саміх уладаў.

Традыцыямі афіцыёзнага Менску ўжо сталі зачыненыя станцыі мэтрапалітэну, канфлікты сумных міліцыянтаў з абуранымі мінакамі, перакрытыя вуліцы. На праспэкт Машэрава было немагчыма прайсьці. Але некаторыя траплялі туды безь перашкодаў. Калёны аўтобусаў у суправаджэньні BMW зь мігалкамі праносіліся да Палаца спорту – ехалі ня надта перакананыя у сваіх дзеяньнях удзельнікі афіцыйнай нарады. У той момант я шпацыраваў праз Верхні горад – бачыў калёны міліцыянтаў і аўтобусаў, але мусіў быў спыніцца, зьдзіўлены рэакцыяй мінакоў. Гэтым людзям быў малацікавы мітынг апазыцыі каля Опэры, але калі яны пабачылі транспартыроўку ўдзельнікаў сходу, дык пачалі рагатаць і тыкаць у іх пальцамі. Для тых гэткая рэакцыя была абсалютна нечаканаю, найбольш знэрваваныя пачалі апускаць фіранкі. Хто ж уладарыць у гэтым горадзе – афіцыйная ўлада ці саркастычны натоўп? Апазыцыя, зразумела, не пры ўладзе, але на арыштаваных, якіх канваявалі ў зону, выглядалі менавіта валанцёры рэжыму. Іх і прывезьлі сюды, каб паспрабаваць пашырыць адказнасьць на большую колькасьць людзей, каб зрабіць іх саўдзельнікамі.

Зноў ажыла тапаграфія Менску. Траецкую горку, там, дзе ў першай палове XX ст. узьвялі Опэру, трымалі менчукі з дапамогаю дружынаў, што прыйшлі зь іншых гарадоў. Замак быў ужо зьнішчаны й не належаў нікому. Захопнікі забарыкадаваліся на Ніжнім рынку, а каля Татарскіх агародаў, там, дзе потым зьявіцца Палац спорту, яны стварылі свой галоўны лягер. На абарону гэтага лягеру была кінутая цэлая ваенная махіна. І мы бачылі адборныя аддзелы (што потым назавуць спэцназам), якім удалося замацавацца на Гандлёвай вуліцы ўздоўж Сьвіслачы. Але ўсе яны завязьлі ў вільготнай глебе Ніжняга гораду. Там ім было ўтульней.

Гэта адзін зрэз падзеяў. Калі ж мы перанясемся ў нашу рэальнасьць, дык зразумеем, што існаваў унутраны сцэнар 19 кастрычніка – пра гэта сьведчыць адсутнасьць жорсткіх сутычак пры ўсёй падрыхтоўцы да іх. Лідарам сёньняшняе апазыцыі сутычкі былі непатрэбныя, бо як палітычная мэта фармулявалася неабходнасьць засьведчыць цывілізаванасьць апазыцыі. Маркер цывілізаванасьці гэтым лідарам яшчэ спатрэбіцца. На рэжым жа паўплывала міжнародная рэакцыя, і ён мусіць рабіць патэнцыйна фатальныя для сябе адступленьні. У выніку – перанос даты рэфэрэндуму парушае зададзеную татальнасьць, узьнікаюць варыянты разьвіцьця падзеяў. Зразумела адно – усе газэты зачыняць зараз ня будуць.

Алег Дзярновіч

Здымак Анатоля Клешчука.

На Валадарскага скончыўся «курортны сэзон» для ўкраінцаў

Напярэдадні рэфэрэндуму ўсе судовыя працэсы, нейкім чынам зьвязаныя з палітыкай, адкладзеныя на няпэўны час. Падобна, што людзям, у якіх ёсьць ня толькі паўнамоцтвы вырашаць лёс «вязьняў сумленьня», але і проста праца і дзеці, трэба проста ў нечым упэўніцца. Хутчэй за ўсё, у тым, хто ўсё ж выйдзе пераможцам і, адпаведна, будзе дыктаваць законы, паводле якіх давядзецца судзіць іншадумцаў паводле абвінавачаньняў у хуліганстве. І пакуль айчынныя іншадумцы сваіх прысудаў не прычакалі ўвогуле, іх замежныя сябры ў няшчасьці мусяць чакаць перагляду справы ў Вярхоўным Судзе РБ. Гаворка пра сямёх асуджаных на пачатку верасьня грамадзянаў Украіны.

Як стала вядома з дасьведчаных крыніцаў, украінцы па-ранейшаму ўтрымліваюцца ў асобных камэрах, а ўмовы ўтрыманьня дазваляюць ім параўноўваць сваё жыцьцё падчас сьледзтва з курортам. Нагадаем: тады былі «толькі» насякомыя, перакрываньне паветра, сьпякота ў камэрах, сон «па зьменах» з-за колькасьці вязьняў, удвая большую за зьмястоўнасьць памяшканьня. (Мяркуючы з бачаных на судзе 21 жніўня «адмецінах» на целе некаторых хлопцаў – яшчэ і звычайнае зьбіцьцё). А што цяпер, праз паўтары месяцы пасьля абвяшчэньня прысуду?

Пакуль уладныя структуры РБ вырашаюць пытаньне зь песьні ўкраінскага барда Стаса Трызубага: «Шчо робыты з тымі ўкраінцамі – бандытамі, бандэрамі, злачынцамі?» Да Вярхоўнага Суда матэрыялы справы яшчэ не дайшлі, а МЗС чакае запыту з Украіны наконт перадачы асуджаных на іх радзіму. Тым часам «варта» былога Пішчалаўскага замку не губляе часу. У кожную з камэраў, дзе сядзіць хто-небудзь з украінскіх грамадзянаў, засылаюцца крымінальныя «аўтарытэты»... Вядома, што найбольшай павагай у сукамэрнікаў карыстаецца Андрэй Шаптыцкі, больш-менш нармальныя адносіны зь імі ў Сяргея Патапава і Уладзімера Салаўя, а частка хлопцаў мусіць атрымліваць «узнагароды» у бойках. Карацей, «на вайне, як на вайне». Ня дзіва, што на ганку СІЗО зьведваеш прыкладна такое ж пачуцьцё, пра якое распавядаюць журналісты, што рабілі матэрыялы з Чачэніі.

Самі вязьні таксама не губляюць часу. Паэт і бард Андрэй Шаптыцкі, напрыклад, піша вершы і песьні. Стан здароўя ва ўсіх, мякка кажучы, значна пагоршыўся. Шаптыцкі, не зважаючы на свае хворыя ныркі, лічыць, што «тых шасьцёх трэба адпраўляць дадому, бо за іх вельмі вялікая адказнасьць». Салавей, 53-гадовы астматык, «чарнобылец» і «аўганец», ня бачыць ніякага злачынства супраць Украіны з боку асуджаных і ехаць нікуды ня хоча: «Раз нас палічылі злачынцамі ў Беларусі, чаму адбываць пакараньне патрэбна ня тут?» Нягледзячы на ўсе спробы «зламаць» украінцаў, яны адзначаюць, што ў Беларусі «сядзець» цікавей, тлумачачы гэта так: «Тут мы – нейкая зьява, а што такое ўкраінцы ва Ўкраіне?»

Для паўнаты адказу на пытаньне пра такую зьяву, як «украінцы ў Беларусі», варта дадаць дзьве дэталі. Па-першае, апошнія два тыдні журналісты не маглі датэлефанавацца да ўкраінскага пасольства: пасьля яго пераезду ў іншы будынак чамусьці ніяк не маглі падключыць тэлефоны (супрацоўнікі тэлефанавалі з аўтаматаў на вуліцы). Па-другое, апошняя сустрэча консула Украіны зь яе грамадзянамі (інтарэсы якіх ён павінен бараніць паводле ня толькі пагадненьняў паміж нашымі краінамі, але і міжнародных канвэнцыяў) змагла адбыцца толькі праз пяць дзён пасьля яе забароны адміністрацыяй СІЗО. Для таго, каб сустрэча адбывалася, консулу давялося даслаць у беларускае МЗС ноту пратэсту. Як вядома зь веснавога досьведу зносінаў грамадзянаў з «учреждением УЖ-15/ИЗ-1» і да яго падобнымі, за пяць дзён амаль сыходзяць усялякія там «фінгалы»...

Таццяна Сьнітко

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

Музэй беларускага характару

ПОШТА

У якой зь беларускіх цэркваў падлога пакрытая лінолеўмам? У аўтэнтычнай драўлянай з Клецкага раёну ў Музэі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах. Дзе могуць пакласьці падлогу з сантымэтровымі шчылінамі між дошкамі, кожную дошку прыбіваючы тузінам цьвікоў? Дзе могуць трымаць унікальныя драўляныя пабудовы з саламянымі стрэхамі без гліняных канькоў? Дзе працуе процьма народу, а ўсё пазарастала бур'яном? У якім яшчэ музэі сустрэнеш п'яных зюзікаў апоўдні?

На жаль, пакуль адзіны менскі музэй, якім шчыра захапляюцца іншаземцы, дабудуюць, першыя экспанаты, напэўна, пасьпеюць струхлець.

Стаяць няпаленымі і недагледжанымі шэдэўры безназоўных геніяў-дойлідаў, запаўняюцца брудам несапраўдныя калодзежы, адцьвітае засеяная наготкамі ніва. Гнюсіцца і разбураецца яшчэ адзін лапік нацыянальнай спадчыны.

Алесь Бурскі

Канфэрэнцыя ў Котбусе



25-28 верасьня 1996 году ў г. Котбусе (Нямеччына) адбылася міжнародная канфэрэнцыя пад назвай «Мадэрнізацыя слоўнікавага складу эўрапейскіх нацыянальных і рэгіянальных меншасьцяў». Арганізатар канфэрэнцыі – Котбускі аддзел Сербалужыцкага інстытуту.

На канфэрэнцыі выступілі навукоўцы многіх краінаў Эўропы. Былі заслуханыя даклады, у якіх ішла гутарка пра пісьмова-кніжныя мовы фрызаў (Нямеччына), фарэрцаў (Данія), ірляндцаў, валійцаў (Вялікабрытанія), аксытанцаў (Францыя), каталёнцаў (Гішпанія), баскаў (Гішпанія), кашубаў (Польшча), градзішчанскіх харватаў (Аўстрыя), русінаў (Славаччына). Закраналіся праблемы нацыянальных меншасьцяў і іхніх моваў, а таксама праблемы іх выжываньня.

У канфэрэнцыі бралі актыўны ўдзел гаспадары – супрацоўнікі Сербалужыцкага інстытуту. Як вядома, на ўсходзе Нямеччыны жыве нацыянальная меншасьць – лужычане, або лужыцкія сербы, якія захавалі сваю мову і культуру.

Прысутнічалі на канфэрэнцыі і прадстаўнікі Беларусі. Аўтар гэтых радкоў прачытаў даклад «Вывучэньне лексыкі заходнепалескага дыялектнага арэалу».

Ф.Клімчук

Найважнейшы ўрок гісторыі

Статыстыка сталінскіх рэпрэсіяў

Працяг са старонкі 1.

«Сьледзтвам у справе выкрытай і ліквідаванай контррэвалюцыйнай шпіёнска-дывэрсійнай паўстанцкай арганізацыі «Польскай арганізацыі вайсковай» выяўлена, што ў дзейнасьці паўстанцкай арганізацыі бралі ўдзел...», — такія словы з пастановаў на арышт былі ўпісаныя ў справы многіх тысячаў палякаў і беларусаў, рэпрэсаваных у 1934-38 гады ня толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў Маскве, Пяцігорску, Растове, Новасібірску, Томску, Краснаярску... Практычна ўсіх іх абвінавацілі тады ў арганізаванай змове супраць савецкай улады. Арганізацыйнай формай гэтай змовы, на думку супрацоўнікаў НКВД, была нейкая падпольная контррэвалюцыйная арганізацыя, пад непасрэдным кіраўніцтвам якой і зь яе прамога ўказаньня павінны былі дзейнічаць «ворагі народу» з польскімі і беларускімі прозьвішчамі і імёнамі. І зусім неістотна, што такой арганізацыі ў прыродзе не існавала: яна была «створана» у нэтрах НКВД.

Справа на «Польскую арганізацыю вайсковую» — адна з самых масавых пасьля справаў «Расейскага агульнавайсковага саюзу» і «Саюзу выратаваньня Расеі» і яскравы прыклад лінейных арыштаў — арыштаў паводле нацыянальнай прыкметы. Філіі арганізацыі «ствараліся» органамі НКВД у абсалютнай большасьці ня толькі цэнтральных раёнаў СССР, але і ў Заходне-Сібірскім краі, Усходняй Сібіры, на Урале. Тым больш, што цяжкасьцяў гэта не выклікала — там працэнт палякаў і беларусаў (яны ў першую чаргу ўключаліся ў «расстрэльныя сьпісы») быў досыць высокі, сказвалася перасяленьне ў Сібір напрыканцы мінулага і ў пачатку нашага стагодзьдзя.

Прэамбула абвінаваўчага заключэньня заўжды заставалася нязьменнай, мяняліся толькі прозьвішчы ды назвы населеных пунктаў, ды «факты», ды «прыклады» варожай дзейнасьці.

«Пры допытах высьвятлялі, дзе працаваў да арышту абвінавачаны, чым займаўся, ці былі факты пажараў, атручваньня жывёлы на месцы яго жыхарства і так далей. Высьветліўшы гэтыя пытаньні, штучна прыпісвалі ў паказаньнях абвінавачаных учыненьне тых ці іншых актаў шкодніцкай ці дывэрсійнай дзейнасьці...»

(З пратаколу допыту ад 27 сакавіка 1957 г. былога супрацоўніка Навасібірскай управы НКВД ураджэнца Менскай губэрні Філіповіча С.)

У справаў на «Польскую арганізацыю вайсковую» была асаблівасьць, якая адрозьнівала гэтыя справы ад іншых — амаль усе яны былі групавыя. Успомнім хоць бы лёс жыхароў вёскі Беласток Кривашэінскага раёну Заходне-Сібірскага краю, дзе за адну ноч у сьнежні 1937 г. былі арыштаваныя ўсе мужчыны ва ўзросце ад 16 да 70 гадоў... Вярнуліся ўсяго некалькі чалавек.

Магчыма, і ня варта было б казаць пра гэтыя мітычныя цэнтры і камітэты няіснай «Польскай арганізацыі вайсковай», калі б за імі не было рэальных чалавечых лёсаў.

Напрыклад, лёс двараніна Гарадзенскай губэрні Аляксандра Сасенкі, якому вайсковая кар'ера была наканаваная яшчэ да нараджэньня: вайскоўцам быў дзед, бацька на службе ў расейскага цара дайшоў да чыну палкоўніка і, выйшаўшы ў адстаўку, жыў ў горадзе Замосьце Люблінскай губэрні.

Да пачатку першай сусьветнай вайны А.Сасенку споўнілася васемнаццаць гадоў. З блаславеньня бацькоў ён паступіў у 99-ы Івангародзкі пяхотны полк і быў накіраваны на фронт. Затым рэвалюцыя, грамадзянская вайна. У пачатку 20-х Аляксандар пачаў служыць у частках польскай арміі, якія разьмяшчалася ў Баранавічах і Берасьці, але раненьні і кантузія ўвесь час нагадвалі пра сябе. Давялося ў 1923 г. дэмабілізавацца. Жонка яго была расейка, і пасьля доўгіх ваганьняў яны вырашылі перабрацца ў Расею, да сваякоў жонкі.

Пры пераходзе мяжы А.Сасенка быў арыштаваны і за нелегальны яе пераход камітэтам ОГПУ быў асуджаны паводле артыкула 66 КК РСФСР на тры гады канцлягераў. Пасьля адбыцьця гэтых трох гадоў на Салаўках у 1927 г. яго адправілі ў высылку ў Нарымскую акругу Заходне-Сібірскага краю. Жыў ён у пасёлку Каргасок, на плытбішчы леспрамгасу ў тайзе, а з 1932 году — у горадзе Калпашава, дзе працаваў мэханікам-матарыстам на электрастанцыі.

«Як устаноўлена сьледзтвам, «Сібірскі камітэт Польскай арганізацыі вайсковай» атрымаў адпаведнае заданьне ад 2-га аддзелу польскага галоўнага штабу, разгарнуў у Сібіры шырокую вярбовачную працу і прыступіў да арганізацыі паўстанцкіх легіёнаў і да непасрэднай падрыхтоўкі ўзброенага паўстаньня. Членам «Сібірскага камітэту» Сасенкам быў распрацаваны плян узброенага паўстаньня, якім прадугледжвалася наступнае... легіёны пачынаюць выступленьне адначасова ў момант нападу на СССР з бакоў Польшчы, Нямеччыны і Японіі; у момант паўстаньня паўстанцкія атрады легіянэраў павінны разьбіць партыйна-савецкія арганізацыі, раззброіць міліцыю, ахову прадпрыемстваў, партыйна-савецкі актыў, аддаўшы забраную зброю паўстанцкім атрадам...

Разам з актыўнай падрыхтоўкай да ўзброенага паўстаньня ўдзельнікі «ПАВ» на тэрыторыі Нарымскай акругі займаліся шпіёнска-дывэрсійнай дзейнасьцю, сыстэматычна зьбіралі зьвесткі шпіёнскага характару, якія сканцэнтроўваліся ў руках агента польскага галоўнага штабу Сасенкі, і апошнім перадаваліся польскім разьведвальным органам...»

(З абвінаваўчага заключэньня ад 3 кастрычніка 1937 г. па справе №7138 на Куля Я.К. і іншых.)

Арыштавалі яго 11 жніўня 1937 г. Пасьля папярэдняга допыту ў Калпашаве адправілі ў Новасібірск. Грунтоўна «апрацаваны» спэцыялістамі сваёй справы А.Сасенка на допыце ў начальніка УНКВД па Захсібкраю маёра дзяржбясьпекі Гарбача прызнаўся ў тым, што ў 1924 г. быў нелегальна перакінуты ў СССР са спэцыяльнымі заданьнямі польскіх разьведорганаў.

У чым толькі не «прызнаўся» Сасенка сваім сьледчым на допытах. Вось толькі подпісы падсьледнага ў пратаколах адсутнічаюць. І ўсё ж, нягледзячы на такі «промах сьледзтва», копіі пратаколаў допытаў Сасенкі былі далучаныя ў якасьці доказаў да справаў соцень і тысяч сібірскіх палякаў і беларусаў, у тым ліку і жыхароў вёскі Беласток.

Пастановай Асобай Нарады НКВД СССР ад 20 кастрычніка 1937 г. Сасенка быў прысуджаны да расстрэлу, і 5 лістапада яго ня стала.

Шмат для аднаўленьня праўды пра лёсы ўраджэнцаў Беларусі зрабіў наш зямляк — сібірскі гісторык Васіль Ханевіч. Яго кніга «Беластоцкая трагедыя» ў сьнежні 1993 г. выйшла ў выдавецтве газэты «Томский вестник». У ёй прыводзяцца ўспаміны ўдзельні-



каў і сьведкаў тых трагічных падзеяў, распавядаецца пра лёсы ня толькі рэпрэсаваных ураджэнцаў Гарадзенскай губэрні, але і пра лёсы іх катаў-сьледчых і супрацоўнікаў НКВД.

Канвэер рухаўся спраўна. Калі сканчалася «сыравіна», дастаўлялі новыя партыі. «Ворагаў народу» стваралі штучна. А калі іх колькасьць таяла, пачыналіся так званыя «замаскаваныя» рэпрэсіі. Галоўным чынам яны прыпалі на другую палову 1937 і пачатак 1938 г. На месцах арыштоўваліся і там жа расстрэльваліся ў першую чаргу прадстаўнікі некарэннай нацыянальнасьці і выхадцы зь іншых рэгіёнаў. Так падтрымліваўся міт аб усеагульным распаўсюджваньні варожай дзейнасьці.

З гэтай мэтай абласныя і гарадзкія ўправы НКВД атрымлівалі разнарадку на выяўленьне пэўнай зададзенай колькасьці «ворагаў народу». Рознымі шляхамі, у тым ліку з выкарыстаньнем загадзя назапашаных даносаў і тэрмінова атрыманых патрэбных паказаньняў раней арыштаваных, складаўся сьпіс ужо канкрэтных людзей пад «разнарадку». Затым яны арыштоўваліся.

А пачыналася ўсё звычайна так. Цэнтар даваў разнарадку на выяўленьне акрэсьленай колькасьці «ворагаў народу». На падставе гэтага УНКВД Заходне-Сібірскага краю давала адпаведныя «заданьні» па раёнах і чакала на чарговы месяц ці квартал новых «канкрэтных» лічбаў. Напрыклад, Томскі гараддзел НКВД штомесяц атрымліваў кантрольныя лічбы на 3-5 тысяч чалавек. Зь іх ня менш за 60 працэнтаў меркавалася засудзіць па першай катэгорыі, г.зн. да расстрэлу.

«Партыя і ўрад падоўжылі тэрмін працы «троек» да 1 студзеня 1938 году. За два-тры дні, што засталіся да выбараў у Вярхоўны Савет, вы павінны правесьці падрыхтоўку да апэрацыі, а 13 сьнежня — пасьля выбараў у Вярхоўны Савет, пачаць «нарыхтоўку». Даю вам тры дні на «нарыхтоўку», а затым вы павінны «націснуць» і хутка закончыць «справы»...

Узроставым складам арыштаваных я вас не абмяжоўваю — давайце старых. Нам патрэбна «націснуць», бо нашыя ўральскія суседзі нас моцна «падціскаюць». Па РОВСу вы павінны даць да 1.01.38 г. ня менш за 1100 чалавек, па паляках, латышах і інш. ня менш за 600 чалавек у дзень, але ў агульнай колькасьці, я ўпэўнены, што за гэтыя дні вы «дагоніце» да 2000 чалавек. Кожны, хто вядзе сьледзтва, павінен заканчваць ня менш за 7-10 справаў у дзень — гэта няшмат, бо ў нас шафёры ў Сталінску і Новасібірску «даюць» па 12-15 справаў у дзень... Улічыце, што шэраг гараддзелаў — Кемераўскі, Пракоп'еўскі і Сталінскі — вас могуць апярэдзіць. Яны ўзялі на сябе абавязкі вышэйшыя, чым я вам цяпер прапанаваў...»

(З прамовы 10 сьнежня 1937 г. начальніка УНКВД Заходне-Сібірскага краю І.Мальцава на нарадзе опэрсаставу ў г. Новасібірску)

Існавалі нават спэцыяльныя блянкі справаздачнасьці. Даходзіла да таго, што ў агульную колькасьць азначаных у разнарадцы асобаў, якіх неабходна было арыштаваць, адразу ўключалася ўжо і колькасьць тых, хто павінен быць расстраляны.

Перавыконваць «норму» дазвалялася, але за недавыкананьне ішло сустрэчнае пакараньне — аж да вышэйшай меры «сацыяльнай абароны». Таму шырока бытавала практыка, калі арыштаваных тут жа ў «прыдатным» месцы — лесе, лагчыне, на могілках — расстрэльвалі, а потым, задняй датай афармлялі справы з патрэбнымі паказаньнямі.

«У жніўні 1937 году начальнік Томскага гараддзелу НКВД І.Аўчыньнікаў выклікаў мяне да сябе ў кабінэт і папытаўся, колькі справаў я і мае сьледчыя закончылі і на колькі чалавек. Я адказаў, што пакуль яшчэ ніводнай справы ня скончана, таму што ўмовы для сьледчай працы ня створаныя, дый часу яшчэ недастаткова (прайшло 7-10 дзён).

Аўчыньнікаў даў мне тэрмін у 5 дзён і папярэдзіў, каб на працягу гэтага тэрміну ад нас паступіў шэраг справаў. На працягу 5 сутак адзін ці два сьледчыя атрымалі патрэбныя паказаньні, здаецца, двух абвінавачаных пра іх антысавецкую дзейнасьць. Але цалкам скончыць зноў жа ніводнай справы не ўдалося. Пра што я і паведаміў Аўчыньнікаву.

Выслухаўшы мяне, Аўчыньнікаў вылаяўся нецэнзурна, назваў мяне апартуністам і паабяцаў расправіцца са мной, калі я буду працягваць сабатаваць мерапрыемствы партыі і ўраду. Тады ён заявіў мне прыкладна так: «У нас у гараддзеле адзін сьледчы дае па 10 справаў у суткі, а ад цябе і тваіх сьледчых на працягу 10 дзён не паступіла ніводнай справы. Колькі ж гадоў спатрэбіцца табе, каб скончыць сьледзтва па справах усіх арыштаваных пры такіх вашых тэмпах? Калі так будзеш працягваць і надалей, дык я пастаўлю пра цябе пытаньне перад начальнікам УНКВД...»

(З паказаньняў былога начальніка Кажэўнікаўскага райаддзелу НКВД Л.Салтымакава 24 верасьня 1956 г./

Для актывізацыі «работы» паміж гарадзкімі і раённымі аддзяленьнямі НКВД было разгорнута «спаборніцтва» паводле прынцыпу: хто болей арыштуе «ворагаў народу» ў пазначаных катэгорыях. Па выніках 1937 г. сярод гараддзелаў НКВД Заходне-Сібірскага краю пераможцам стаў Томск, за што начальнік гараддзелу капітан дзяржбясьпекі І.Аўчыньнікаў быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам Леніна.

Зь лістапада 1939 г. у Сібір пацягнуліся эшалёны дэпартаваных жыхароў заходніх абласьцей Беларусі. У гэтай плыні аказалася больш за 60 тысяч беларусаў, палякаў, габраяў... З улікам колькасьці грамадзян, рэпрэсаваных несудовымі і судовымі органамі, у адміністратыўным парадку гэтая лічба перавышае 85 тыс. чалавек. Вывучэньне архіўных дакумэнтаў і матэрыялаў органаў дзяржбясьпекі, МВД, судоў і пракуратуры Расейскай Фэдэрацыі дазваляе зрабіць папярэднюю выснову, што на тэрыторыі Заходне-Сібірскага краю (цяпер Новасібірская, Кемераўская і Томская вобласьці) у пэрыяд 30-40-х гадоў толькі судовымі органамі было рэпрэсавана ня менш за 25-30 тысячаў ураджэнцаў Беларусі. Галоўны ўдар рэпрэсіўнай машыны быў скіраваны супраць сялян і рабочых (да 64%); асноўнымі матывамі арышту (да 90%) былі «контррэвалюцыйныя злачынствы»; да 70% грамадзян было асуджана ў 1937-38 гады, каля 80% усіх асуджаных было расстраляна, а найменшае пакараньне — пяць гадоў — атрымала ня больш за 2 працэнты.

Такім чынам, пэўная статыстыка ўсё ж існуе. Але, мяркуецца, агульная лічба жыхароў Беларусі, якіх рэпрэсавалі ў 20-40-я гады будзе далёка няпоўная, калі не ўлічыць тых, хто трапіў у пашчу таталітарнага Малоху на тэрыторыі іншых рэспублік былога СССР, хто паўторна быў рэпрэсаваны ў лягерах і турмах ГУЛАГу НКВД СССР, хто быў высланы і зьнішчаны па разнарадцы, ня трапіўшы нават ні ў якія сьпісы.

Нельга пагадзіцца з такім падыходам, калі пры азначэньні агульных стратаў рэпрэсіўнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, як і іншых дзяржаваў, біруцца за аснову толькі зьвесткі органаў дзяржбясьпекі і ўнутраных справаў. Бо афіцыйная статыстыка зыходзіць з таго, што вызначае колькасьць рэпрэсаваных наяўнасьцю архіўна-сьледчых справаў на захаваньні ў архівах дзяржбясьпекі. А як быць зь дзясяткамі тысячаў тых, якіх расстралялі, выслалі, паўторна рэпрэсавалі без усялякіх «фармальнасьцяў»? Чаму не бярэцца ў разьлік тая частка архіўна-сьледчых справаў НКВД, сьледчых матэрыялаў пракуратур, судоў, вайсковай котрразьведкі, сьпісы рэпрэсаваных у адміністратыўным парадку, якія былі зьнішчаны ці захоплены падчас імгненнага наступу нямецка-фашысцкіх войскаў у чэрвені-ліпені 1941 году? Чаму сёньня адбываецца падзел на «нашых», рэпрэсаваных на тэрыторыі Беларусі, і «ня нашых», косткі якіх ляжаць у Сібіры, на Ўрале, Поўначы і ў іншых рэгіёнах?

Найважнейшы ўрок гісторыі: да праўды мы павінны ісьці да канца. Паўмерамі цяпер нічога не даб'есься, бо толькі поўная праўда зьяўляецца гарантыяй ад рэстаўрацыі крывавага таталітарызму.

Томск-Менск

Ігар Кузьняцоў

Міжнародны камэнтар

Расея падтрымала свайго

Стаўленьне Расеі да спробы дзяржаўнага перавароту ў Беларусі пацьвярджае паліталягічную тэорыю зьнешнепалітычных інтарэсаў. Расея яшчэ не зразумела, што лепей мець высакароднага суседа, чым крывадушнага слугу. Адсюль выснова маскоўскіх патрыятычных і дэмакратычных палітолягаў пра неабходнасьць падтрымаць той бок у беларускім канфлікце, які ўжо засьведчыў сваю адданасьць.

Тымчасам Лебедзя адправілі ў вырай. Лебедзь шмат чаму навучыўся ў «малодага брата». Лебедзь — вайсковая копія прэзыдэнта Беларусі. Ён гэтак жа прагне ўлады. Дзеля ўлады ён гатовы перайсьці пад любыя сьцягі, абы яны былі папулярныя сярод народу. Ён гатовы заключаць альянсы зь любымі цёмнымі групоўкамі, абы ў тых сілаў было шмат грошай на будучыя выбарчыя кампаніі. Ягонай «антыкарупцыйнай камісіяй» стала камісія па Чачэніі. З паплечнікамі ён разьвітваецца гэтак жа лёгка, як і наш: вось ужо свайго пратэжэ генэрала Радыёнава назваў чалавекам, які страціў сумленьне і арыентыроўку ў часе. Гэтак жа штодня абвяшчае, што ў яго ёсьць кампрамат, што яму вядомыя імёны тых, хто вінаватыя ў здачы Грознага, у чачэнскай вайне, і гэтак жа ўпарта не называе іх, і можна меркаваць, не назаве ніколі. Размаўляе Лебедзь таксама, як сярэдні жыхар расейскай глыбінкі. Іміджу трымаецца старанна і паслухмяна. Гэткая ж манія велічы праглядаецца за ягонымі словамі. Гэтаксама ў Расеі кажа адно, а ў Эўропе іншае. Гэтак жа дыстанцуецца ад левых радыкалаў, ведаючы, што тыя ўсё адно яго падтрымаюць. Не прапускае ніводнай нагоды, каб упікнуць дэмакратаў, бо ведае, што іх ненавідзіць люмпэн. Адчувае ўласную сілу, бо ведае: за ім стаяць мільёны люмпэнаў, гома саветыкусаў. Калі Лебедзь некага абвінавачвае, значыць, той нехта — злачынца. Калі ганяць Лебедзя, значыць, абгаворваюць і брэшуць.

Адстаўка, трэба думаць, толькі ўздыме аўтарытэт «чэснага», несправядліва пакрыўджанага генэрала. Міратворцы, які змог прадставіць капітуляцыю расейскіх войскаў у Чачэніі, як высакародна дараваны мір.

Але ці паслабіць расейскую падтрымку Лукашэнкі адстаўка Лебедзя?

Калі меркаваць з колькасьці візытантаў з Масквы ў Менск і зь Беларусі ў Маскву, авіякампаніям неўзабаве давядзецца павялічваць колькасьць рэйсаў на лініі Менск — Масква. Туды-сюды, туды-сюды... Якая ўжо басота толькі не перабывала ў нас... Затулін, Тулееў, Зюганаў... І ўсіх адразу прымае кіраўнік дзяржавы, і ўсіх адразу паказваюць у тэлебачаньні... А нашыя канстытуцыйнікі ўсё лётаюць у Маскву, усё сустракаюцца, а дэмакратычныя газэты ўсё мрояць: «Шарэцкі нічога не сказаў, значыць... Карпенку нічога не абяцалі, значыць...»

Восень'96, мабыць, навучыць усіх нашых нехалуйскіх палітыкаў: няма чаго спадзявацца на Расею. Свае сваіх не аддаюць. Гэтага ня могуць не зразумець ні лібэралы, ні дзядзька Шарэцкі, ні нават нацыянал-камуністы.

Гэтак жа як вясной, асабліва 1 траўня, яны не маглі не зразумець, наколькі больш пэрспэктыўна абапірацца на моладзь, чым на вэтэранаў.

Сваёй жахлівай роляй у тым, што адбылося ў Беларусі, Расея сама нам кажа: «На нас надзейся, а сам не плашай».

«Без Расеі!» — гэты лёзунг зараз усьвядомяць усе, але ўголас прамаўляць ня будуць, бо ўжо сталі разумныя. Час Беларусі няўмольна набліжаецца. І ніякія спэцыялісты-інструктары расейскіх амонаў, і ніякія «свае», і ніякая жорсткасьць ня выратуюць сьмяротна хворую акупацыю.

Андрэй Рудкоўскі

Kalandar

21 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: Alfred Nobel (1833-96), švedzki chimik i pramysłoviec, vynachodnik i vytvorca dynamitu, a taksama fundatar Nobeleŭskaj Premii; Uładzimier Pičeta (1878-1947), biełaruski historyk; kardynał Kazimier Šviontak (1914), hałoŭny herarch katalickaje carkvy ŭ Biełarusi.

22 kastryčnika

U hety dzień... naradziŭsia vuhorski kampazytar i pijanist Ferenz Liszt (1811-86).

23 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia Adam Płuh (1823-1903), biełaruski piśmieńnik; a taksama brazylski futbalist Pele (Edson Arantes do Nascimento) (1940).

24 kastryčnika

U hety dzień... u 1945 h. rasstralany Vidkund Quisling, narveski palityk, jaki supracoŭničaŭ ź niemcami padčas akupacyi Narvehii ŭ druhuju suśvietnyju vajnu.

Stvorana Arhanizacyja Abjadnanych Nacyjaŭ (1945).

25 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: francuski kampazytar Georges Bizet (1838-75), aŭtar pamiž inšym opery «Carmen»; hišpanski mastak Pablo Picasso (1881-1973).

26 kastryčnika

U hety dzień... naradziŭsia François Mitteran prezydent Francyi ŭ 1981-95 h.

27 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: James Cook (1728-79), anhielski padarožnik; italjanski kampazytar i skrypač Niccolo Paganini (1782-1840); prezydent USA Theodore Roosevelt (1858-1919).

Паўночная Ірляндыя: усё пачыналася з шэсьця

У 1968 годзе ў паўночнаірляндзкім горадзе Лёндандэры адбылося шэсьце ў абарону правоў чалавека. З гэтага аднавілася ба-рацьба за нацыянальнае вызваленьне.

Лёндан не схацеў саступіць, прыслаў у Ольстэр 500 карнікаў, каб сілай раздавіць зародкі нацыянальнай годнасьці ірляндцаў. Калі Шын Фэйн, партыя ірлянцаў-каталікоў, аднойчы перад выбарамі вывесілі над сваёй штаб-кватэрай нацыянальны трыкалёр, 350 агентаў пратэстанцкіх сілаў бясьпекі заатакавалі каталіцкі квартал пры дапамозе бронемашын і ведамётаў. Каталіцкія газэты забараняліся, не дазвалялася ўшаноўваць памяць паўстаньня 1916 году...

Але прымус і рэпрэсіі не зламілі паўночнаірляндцаў, а, наадварот, згуртавалі іх. Менавіта ўжываньне сілы змусіла іх саміх да самаабароны. Праз тры гады, у 1971 годзе, загінуў першы брытанскі салдат. Калі людзей пазбаўляюць элемэнтарных правоў, у іх нараджаецца жаданьне атрымаць правы поўныя.

Гады, калі адраджалася Ірляндзкая Рэспубліканская Армія, былі гадамі вайны ў Віетнаме, «Бітлз», бурных студэнцкіх паўстаньняў, маршаў амэрыканскіх нэграў супраць расізму. Тэлевізія дазволіла маладым паўночнаірляндцам убачыць, што паўстаньне магчымае. ІРА стварылі дваццацігадовыя. Гэта адбывалася ў атмасфэры ўсеагульнага энтузіязму. Шэсьці, мітынгі і галадоўкі ператвараліся ў моманты нацыянальнага яднаньня.

З кожным разгонам маніфэстацыі да маладых ірляндцаў, апантаных ідэямі роўнасьці правоў і свабоды, прыходзіла разуменьне таго, што толькі ўзброеная барацьба можа зьмяніць стан рэчаў. Тактыка ўзброенай барацьбы — гэта выклік, пераадоленьне сябе, крок, пасьля якога шляхі да адступленьня адрэзаныя. Байцы ІРА і цяпер лічаць, што калі б ня ўзброеная барацьба, сьвет так і не даведаўся б, што існуе паўночнаірляндзкая праблема. Цяпер, пасьля 25 гадоў крывавай вайны, што забрала амаль 3000 жыцьцяў, лічаць яны, да свабоды Ірляндыі застаўся адзін крок.

Тры выбухі апошніх тыдняў — гэта чарговая адчайная спроба прымусіць Брытанію зрабіць гэты крок.

Сапраўдная адказнасьць за гэтыя выбухі і за тысячы сьмерцяў ляжыць на тых, хто тады, у 1969 годзе вынайшаў ідэю справакаваць моладзь на ўзброеную барацьбу, каб скампрамэтаваць увесь рух. Кроў не даруюць.

Андрэй Дынько

ІРА вяртаецца

Працяг са старонкі 1.

Паўстаньне працягвалася шэсьць дзён. Шэсьць дзён паўстанцы ўтрымлівалі цэнтар Дубліна. За гэты час быў створаны часовы ўрад Ірляндзкай Рэспублікі, які дэкляраваў незалежнасьць краіны. Нарэшце, 12 траўня ангельцы прымусілі капітуляваць апошніх абаронцаў Галоўнай Пошты, дзе быў штаб бунтаўнікоў. За выключэньнем некалькіх асобаў (сярод іх быў будучы кіраўнік Ірляндыі Дэ Валера), усіх дзеячоў часовага ўраду расстралялі. Пад выглядам барацьбы з агентамі «нямецкай разьведкі» былі забароненыя ўсе апазыцыйныя групоўкі. Так Імпэрыя нанесла ўдар у адказ.

Але жорсткасьць ангельцаў стала прычынаю новай хвалі ірляндзкага супраціву. Уся краіна абагаўляла пакутнікаў велікоднага паўстаньня і ўдзельнічала ў антыімпэрыялістычных выступах. Наступныя выбары адлюстравалі гэта. У парлямэнт прайшоў амніставаны Дэ Валера, які, дарэчы, перамог на сваім участку кандыдата Home Rull.

Сярод арыштаваных за ўдзел у «велікодным бунце» быў непрыкметны банкаўскі клерк М.Колінс. Яго інтэрнавалі ў Уэльсе, дзе ён пачаў рэарганізацыю руху валанцёраў. Паступова арганізацыя адрадзілася. У верасьні 1917 г. падчас пахаваньня ў Дубліне славутага ірляндзкага патрыёта Т.Айчла, М.Колінс вывеў на вуліцы амаль 9000 валанцёраў. Тым самым ён засьведчыў сілу і амбіцыі новай арганізацыі, якая з 1918 г. пачынае называцца Ірляндзкая Рэспубліканская Армія.

Першыя пасьляваенныя выбары прынесьлі Шын Фэйну сапраўдны трыюмф. З 105 дэпутацкіх вакансіяў 75 былі за «шынфэйністамі» (амаль усе новаабраныя дэпутаты год назад яшчэ сядзелі ў турмах). Сабраўшыся ў Дубліне, фракцыя Шын Фэйна адмовілася ехаць у Лёндан і стварыла свой нацыянальны сход — Дайль. Дайль маніфэстаўваў незалежнасьць Ірляндыі.

Побач зь сьцягам рэспублікі пад будынкам, дзе праходзілі паседжаньні Дайля, быў падняты сьцяг Злучаных Штатаў. Гэта быў сымбаль надзеі, што пераможцы сусьветнай вайны справядліва выраашаць ірляндзкае пытаньне. Але ірляндцаў нават не пусьцілі на Парыскую канфэрэнцыю, дзе выпрацоўваліся падставы новага сусьветнага парадку. Што да Англіі, то яна ігнаравала Ірляндзкую

Рэспубліку і адмаўляла яе інстытуты. І фракцыя Home Rull працягвала сядзець у ангельскім парлямэнце.

Халодным студзеньскім ранкам 1919 г. у мястэчку Солахсадбэрг валанцёры ІРА расстралялі 2-х каралеўскіх канстэбляў. Абодва паліцэйскія былі ірляндцамі. Іхняя віна палягала ў тым, што яны супрацоўнічалі з акупантамі. Так пачыналася партызанская вайна, якую абвясьціла ІРА Вялікабрытаніі. За студзень 1919 г. было забіта 18 калябарантаў. Гэта быў выклік.

У адказ Лёндан рэкрутаваў каля 7000 наёмнікаў, як правіла, былых крымінальнікаў. У дадатак у Ірляндыю быў уведзены корпус «памочнікаў», якіх набіралі з афіцэраў-вэтэранаў вайны. Увогуле ўзброеныя сілы Англіі ў Ірляндыі сталі налічваць 200.000 чалавек. У канцы 1920 г. у краіне было ўведзена ваеннае становішча. Членаў ІРА пачалі расстрэльваць без суду. Дапамога рэспубліканцам таксама каралася сьмерцю.

ІРА адказвала тым самым. Так 28 лістапада 1919 г. у Макроме валанцёр кінуў бомбу ў атрад «памочнікаў». Дзевяць чалавек загінула на месцы. У памяць пра падзею рэспубліканцы склалі песьню.

Ірляндзкі народ, які аказаўся ў асяродку гэтай канфрантацыі, усё ж аддаў перавагу ІРА. Нематываваны тэрор ангельцаў выклікаў контррэакцыю. Цяпер нідзе ніводзін прадстаўнік ураду ня мог адчуваць сябе спакойна: ні ў Дублінскім замку, ні на вуліцы. Тэрарысты ІРА былі паўсюль. У выніку інстытуты ўлады проста перасталі функцыянаваць. Да іх ніхто не зьвяртаўся. У правінцыі цэлыя графствы пераходзілі пад кантроль рэспубліканцаў. Гэта была жудасная параза Брытанскай Імпэрыі. Нават Уладзімер Ільліч Ленін, шэф сусьветнага пралетарыяту, агітуючы на барацьбу з Антантай, цяпер спасылаўся на ірляндзкія ўрокі.

Крызыс ангельскай палітыкі ў Ірляндыі прымусіў Лёндан прызнаць самастойнасьць краіны. 4 ліпеня 1922 г. прадстаўнікі Ірляндзкай Рэспублікі падпісалі пагадненьне пра статус Ірляндыі ў складзе Брытанскай Імпэрыі. Ірляндыя атрымала правы даміліёну. Але такое палітычнае рашэньне не задаволіла значную частку шынфэйністаў на чале з Дэ Валера. Галоўных пунктаў крытыкі было два. Па-першае, пытаньне Ольстэра. Па-другое, прысяга каралю, якую дэпутаты Дайля, згодна зь мірным пагадненьнем, павінны былі даваць публічна. Хутка дыскусія выйшла за рамкі дэпутацкіх паседжаньняў. М.Колінс і А.Грыфіц, прыхільнікі пагадненьня, згуртавалі вакол сябе верныя часткі ІРА. Другая частка ІРА, так званая ІРА anti-traity ператварыла Дублінскі замак у бастыён апазыцыі.

Летам 1922 г. М.Колінс перайшоў у наступ. Ён абвінаваціў апазыцыю ў дачыненьні да крымінальнай справы аб крадзяжы дзяцей і выставіў ультыматум. На роздум давалася ўсяго 12 хвілін. Яшчэ праз гадзіну пачаўся абстрэл Дублінскага замку. ІРА anti-traity 8 дзён вяла вулічныя баі, але нарэшце пакінула сталіцу. У краіне пачалася грамадзянская вайна.

Былыя таварышы сталі ворагамі. М.Колінс зьвярнуўся па дапамогу ў Лёндан, адкуль атрымаў зброю і нават былых канстэбляў-калябарантаў. Між тым, у жніўні 1922 г. памёр заснавальнік Шыйн Фэйну А.Грыфіц. Пахаваць патрыярха Ірляндзкага руху плянавалі ў Корку, дзе, дарэчы, былі моцныя пазыцыі ІРА anti-traity. М.Колінс цьвёрда вырашыў ехаць на пахаваньне. «Што яны могуць зрабіць мне ў маёй краіне», — жартаваў герой антыангельскага супраціву. 22 жніўня 1922 г. Колінс прыбыў у Корк. З самага ранку яго ўжо чакалі валанцёры ІРА anti-traiti. Пачаўся бой, які цягнуўся амаль гадзіну. Нарэшце, М.Колінс, заснавальнік ІРА, быў забіты. Забіў яго невядомы валанцёр ІРА.

Працяг будзе.

Лёлік Ушкін

№ 29/96

21-27 кастрычніка

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

інфарматар НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы – штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

ДЫПЛЯМАТЫЧНЫ КОРПУС У МЕНСКУ

Міжнародны валютны фонд Адрэса: г. Менск, вул.Станкевіча, 1, к.218. Тэлефон: 20-91-72. Факс: 20-30-19. Прадстаўнік сп. Іштван Салкай.

Выканаўчы сакратарыят СНД Адрэса: г. Менск, вул.Кірава, 17. Тэлефон: 22-35-17. Факс: 27-23-39. Выканаўчы сакратар СНД сп. Іван Міхайлавіч Каратчэня.

Эўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця Адрэса: г. Менск, вул.Савецкая, 7. Тэлефон: 20-32-39, 20-15-37. Факс: 20-76-68. Прадстаўнік сп. Алян Папофф.

Сусьветны банк Адрэса: г. Менск, Партызанскі прасп. , 6а. Тэлефон: 26-06-44. Факс: 26-06-48. Прадстаўнік сп. Крыстафэр Уілоўбі.

Міжнародная фінансавая карпарацыя (Каардынацыйны цэнтар) Адрэса: г. Менск, вул. Ф.Скарыны, 25. Тэлефон: 68-49-59/62, 68-59-88. Факс: 66-69-19. Галоўны адміністратар сп. Джыл Цэтына.

Міжнародная фэдэрацыя Таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца Адрэса: г. Менск, вул.Маякоўскага, 14. Тэлефон: 21-72-37, 21-34-46. Факс: 21-90-60. Кіраўнік прадстаўніцтва сп. Бэрнхард Гофман.

Пасы па сумяшчальніцтву

1. **Пасольства Аўстраліі** Адрэса: г.Масква, Крапоткінскі зав., 13. Тэлефон: 956-60-70. Факс: 956-61-70. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джэфры Бэнтлі.

2. **Пасольства Аўстрыйскай Рэспублікі** Адрэса: Масква, Стараканюшны зав., 1. Тэлефон: 201-73-19/07/79. Факс: 230-23-65. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Вальтэр Зігель.

3. **Пасольства Гішпаніі** Адрэса: г.Масква, вул.В. Нікіцкая, 50, 8. Тэлефон: 202-21-61/80, 202-26-10/57. Факс: 200-12-30. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Эўхензо Брэгалат.

4. **Пасольства Фінляндзкай Рэспублікі** Адрэса: ul.Klaipedas, 6, Vilnius, Lithuania. Тэлефон: 22-27-75. Факс: 22-24-63. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Тайста Талванэн.

5. **Пасольства Каралеўства Швэцыя** Адрэса: г.Масква, вул.Масфільмаўская, 60. Тэлефон: 956-12-00(01). Факс: 956-12-02. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Свэн Хірдман.

6. **Пасольства Сацыялістычнай Рэспублікі Віетнам** Адрэса: г.Масква, вул.Пірагоўская, 13. Тэлефон: 247-02-12. Факс: 245-10-92. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Хуан Нгіем.

7. **Пасольства Новай Зэляндыі** Адрэса: г. Масква, вул.Паварская, 44. Тэлефон: 956-35-79. Факс: 256-35-83.

8. **Пасольства Каралеўства Нідэрлянды** Адрэса: ul. Chocimska, 6, 00-791 Warszawa, Polska. Тэлефон: 49-23-51/2. Факс: 48-83-45. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джорджэс Вэры.

9. **Пасольства Вялікага Герцагства Люксэмбург** Адрэса: г.Масква, Хрушчоўскі зав., 3. Тэлефон: 202-21-71. Факс: 200-52-43.

10. **Пасольства Каралеўства Данія** Адрэса: г.Масква, зав.Астроўскага, 9. Тэлефон: 201-78-60/68. Факс: 201-53-57. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Хэнрык Р. Івэрсэн.

11. **Пасольства Канады** Адрэса: г.Масква, Стараканюшанны зав., 23. Тэлефон: 956-66-66, 256-61-58. Факс: 241-44-00. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джэрэмі Кінсман.

12. **Пасольства Рэспублікі Зымбабвэ** Адрэса: г.Масква, Серпаў зав., 6. Тэлефон: 248-43-64/67, 256-31-50. Факс: 230-24-97.

13. **Пасольства Вугорскай Рэспублікі** Адрэса: ul. Kronina, 2,00-559, Warszawa, Polska Тэлефон: 628-44-51/55. Факс: 621-85-61. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Габар Харс.

14. **Пасольства Швайцарскай Канфэдэрацыі** Адрэса: Al. Ujazdowskie, 27, 00-540 Warszawa, Polska Тэлефон: 628-04-81/82. Факс: 621-05-48. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Жан-Аліўе Кэнш.

15. **Пасольства Рэспублікі Карэя** Адрэса: г.Масква, вул.А.Талстога, 14. Тэлефон: 956-14-74, 956-24-34. Факс: 956-24-34. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Кім Сок Кю.

16. **Пасоольства Каралеўства Нарвэгія** Адрэса: г.Кіеў, вул.Стралецкая, 15. Тэлефон: (044) 224-00-66, 212-43-85. Факс: 224-06-55. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Ойвінд Нордслетэн..

17. **Пасольства Ўругвая** Адрэса: г.Масква, Ламаносаўскі прасп. , 38. Тэлефон: 143-04-04. Факс: 938-20-45. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Пэдра Донда.

18. **Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран** Адрэса: г.Кіеў, вул.Круглаўнівэрсытэцкая, 12. Тэлефон: (044) 229-44-63, 229-34-66, 31-11-39, 33-75-82, 33-78-08 (сакратар у Менску). Факс: 229-32-55. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Бахзад Мазахеры.

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі

АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

ПВ	месца	Літэр

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА

на газэту **63125**

НАША НІВА

Кошт	падпіскі ____ руб.	Колькасьць камплектаў
	пераадрас. ____ руб.	

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

Інфарматар НАША НІВА №29

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 14 КАСТРЫЧНІКА:

ТАЛІБЫ. ***(Аўганістан).*** Войскі Ахмад Шах Масуда адкінулі талібаў ад Пандшэрскай даліны і перавала Саланг. Баі ідуць каля ваеннай базы Баграм у 10 кілямэтрах ад Кабулу. Ахмад Шах Масуд, Рашыд Дустум і Бурханудзін Рабані сустрэліся на перавале Саланг.

ПАКІСТАН. Прэм'ер-міністар Пакістана Бэназыр Бхута прызналася, што аддзелы талібаў рыхтаваліся на тэрыторыі Пакістану пры ўдзеле Савудаўскай Арабіі, Вялікабрытаніі і ЗША.

"АПОСТАЛ". ***(Расея).*** Маскоўская міліцыя вярнула Дзяржаўнай Гістарычнай Бібліятэцы скрадзенага на прыканцы верасьня "Апостала", выдадзенага Іванам Фёдаравым у 1564 годзе. Было вернута таксама яшчэ 197 скрадзеных кніг.

СУД. ***(Бэльгія).*** Бэльгійскі вышэйшы суд адхіліў сьледчага Жана-Марка Канэрота ад вядзеньня справы Марка Дзютру, які падазраецца ў пэдафіліі і катаваньні дзяцей.

СУСТРЭЧЫ. ***(Эгіпет).*** Прэзыдэнт Ізраіля Вэйцман сустрэўся з прэзыдэнтам Эгіпту Хосьні Мубаракам. Гэта яшчэ адна спроба ўратаваць мір у рэгіёне.

ВАЙНА. ***(Ірак).*** Войскі Патрыятычнай уніі Курдыстану Джалала Талабана пасьля цяжкіх баёў выбілі аддзелы праіракцкай Дэмакратычнай партыі Курдыстану з горадоў Куй - Санджак і Дэгалі на поўначы і Галабжы на поўдзені краю. Тым самым яны адбілі значныя тэрыторыі, захопленыя месяц таму войскамі Масуда Бажана.

АЎТОРАК, 15 КАСТРЫЧНІКА:

ВІЗЫТ. ***(Палестына).*** Кароль Ярданіі Хусэйн наведаў Заходні бераг ракі Ярдан, дзе сустрэўся зь Ясірам Арафатам.



ВАЙНА. ***(Ірак).*** Пасьля цяжкіх баёў аддзелы Патрыятычнай уніі Курдыстану падыйшлі да сталіцы краю — Ірбілу. Горад ахоўваецца іракцкімі войскамі.

ДЭМАНТАЖ. ***(Атол Мururoa).*** Францыя пачала дэмантаж ядзернага палігону на атоле Мурурoа, пасьля сканчэньня сваіх выпрабаваньняў. Дэмантаж плянуецца завяршыць да канца 1998 году.

ПАПА. ***(Ватыкан).*** Папа рымскі Ян Павал II пакінуў шпіталь, у якім праходзіла ягоная апэрацыя на апэндыцыт.

ПРАТЭСТ. ***(Беларусь).*** Каля 25-ці беларускіх партыяў і арганізацыяў выказаліся супраць правядзеньня "прэзыдэнцкага" рэфэрэндуму 7 лістапада. Ідэя Ўсебеларускага Народнага Сходу ахарактарызаваная ў заяве як спроба дзяржаўнага перавароту.

ТЭРАКТ. ***(Альжыр).*** Мусульманскія фундамэнталісты забілі 43-гадовага рэдактара газэты "Эзурук". З 1992 году ў Альжыры загінула каля 50 тысячаў чалавек.

ДЫСЫДЭНТ. ***(Кітай).*** Буйнейшы кітайскі дысідэнт Ванг Дам, які быў адным з кіраўнікоў выступу на плошчы Цяньаньмэнь прадстане перад судом. Пра гэта заявіў замежным журналістам ягоны бацька.

СЕРАДА, 16 КАСТРЫЧНІКА:

ПРЫЕЗД. ***(Расея).*** Прэзыдэнт Беларусі А.Лукашэнка сустрэўся ў Маскве прэзыдэнтам Расеі Б.Ельцыным, патрыярхам Алексіем II і прэм'ер-міністрам В.Чарнамырдзіным. Паводле словаў Лукашэнкі, у яго склаліся "цудоўныя адносіны" як з Ельцыным, так і з Алексіем II, і з Чарнамырдзіным.

NATO. ***(Бэльгія).*** Штаб-кватэру NATO наведаў прэзыдэнт Літвы Альгірдас Бразаўскас. Пасьля сустрэчы з генэральным сакратаром Хаўерам Саланам ён заявіў, што Літва мусіць уступіць у паўночнаатлянтычны альянс адной зь першых.

КАТАСТРОФА. ***(Балтыка).*** Швэдзкі самалёт-разьведнік "Віген" упаў у Балтыцкае мора пры аблёце новага расейскага атамнага крэйсэра "Пётар Вялікі". Цела загінулага капітана Ёрана Карласана знайшлі маракі крэйсэра.

ПАДЗЕЛ. ***(Расея).*** Дзяржаўная Дума Расеі прыняла заяву, у якой гаворыцца пра недапушчальнасьць падзелу Чарнаморскага флёту.

АРЫШТЫ. ***(Беларусь).*** Шахцёры Салігорска, якія выйшлі маршам на Менск у падтрымку Кангрэса ў абарону дэмакратыі, былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі.

ПАСАДА. ***(Ічкерыя).*** Аслан Масхадаў вылучаны на пасаду прэм'ер-міністра Ічкерыі. Разам з тым ён захоўвае і пасаду міністра абароны.

ПЕРАВАРОТ. ***(Расея).*** Міністар унутраных справаў Расеі Кулікоў абвінаваціў Аляксандра Лебедзя ў спробе дзяржаўнага перавароту. У прыватнасьці, у стварэньні ўласнай сілавой структуры пад назовам "Рускі Легіён".

ВЯРТАНЬНЕ. ***(Францыя).*** Рада Эўропы прыняла пастанову ў якой заявіла аб тым, што Харватыя застанецца ў складзе арганізацыі.

ТРАГЕДЫЯ. ***(Гватэмала).*** Прынамсі 83 чалавекі загінула і каля 500 паранена у выніку перапоўненасьці стадыёна "Матэа флорэс" у сталіцы Гватэмалы. Катастрофа адбылася пад час футбольнай гульні паміж зборнымі Гватэмалы і Коста-Рыкі ў адборачным турніры да чэмпіянату сьвету 98г.

ЧАЦЬВЕР, 17 КАСТРЫЧНІКА:

АДСТАЎКА. ***(Расея).*** Барыс Ельцын падпісаў загад аб вызваленьні Аляксандра Лебедзя з пасадаў Сакратара Рады Бясьпекі Расеі і паўнамоцнага прадстаўніка прэзыдэнта Расеі ў Чачэніі.

АКЦЫЯ. ***(Беларусь).*** У Менску, на пляцы Свабоды, адбылася акцыя Фэдэрацыі Прафсаюзаў Беларусі ў падтрымку Кангрэса ў абарону Канстытуцыі.

СЬМЕРЦЬ. ***(Беларусь).*** На сходзе Саюза Пісьменьнікаў Беларусі пры абмеркаваньні праекту зьліцьця калектываў газэтаў "Культура", "Наша Слова" і часопіса "Спадчына" ад сардэчнай нястачы памёр пісьменьнік Аляксандар Капусьцін. Сход выступіў супраць плянаў зьліцьця рэдакцыяў.

ПЯТНІЦА, 18 КАСТРЫЧНІКА:

КАНГРЭС. ***(Беларусь).*** У Менску праведзены Кангрэс у абарону Канстытуцыі супраць дыктатуры. На Кангрэсе была створаная грамадзкая камісія па расьледаваньні злачынстваў рэжыму на чале зь Юрыем Захаранкам.

ЗБРОЯ. ***(Украіна).*** Украінскі парлямэнт прыняў пастанову аб прыпыненьні дзейнасьці Дамовы пра нераспаўсюджаньне ядзернай зброі на тэрыторыі Украіны. Гэта адказ украінскіх парлямэнтараў на заяву Дзяржаўнай Думы Расеі пра непадзел Чарнаморскага флёту.

ВАЙНА. ***(Аўганістан).*** Войскі Ахмад Шах Масуда пры падтрымцы тэхнікі Рашыда Дустума ўзялі авіябазу Баграм.

ТРАНСПАРТ. ***(Балканы).*** У былой Югаславіі ўпершыню з пачатку вайны пачала працаваць аўтобусная лінія Бялград — Сараева.

ПАДТРЫМКА. ***(Расея).*** Дзяржаўная Дума Расеі падтрымала зьняцьцё з пасады Сакратара Рады бясьпекі Аляксандра Лебедзя.

ПРЫЗНАНЬНЕ. ***(Японія).*** Сёку Асахара, заснавальнік сэкты "Аум Сэнрыкё", пад час чарговага допыту заявіў, што бярэ ўсю адказнасьць за зарынавую атаку ў такійскім мэтро на сябе. На прызнаньне, зь ягоных словаў, яго падштурхнуў Усявышні.

СУБОТА, 19 КАСТРЫЧНІКА:

МІТЫНГ. ***(Беларусь).*** У Менску адбыўся мітынг супраць прэзыдэнцкага рэфэрэндуму 7 лістапада. Па розных ацэнках у ім прыняло удзел каля 30 тысячаў дэманстрантаў.Увечары улады првялі арышты . Сярод затрыманых грамадзяне Францыі і Расеі.

ЗАЯВА. ***(Беларусь).*** Прэзыдэнт Беларусі Лукашэнка заявіў на Ўсебеларускім Народным Сходзе што ён згодны на перанос рэфэрэндуму на 24 лістапада. Таксама ён заявіў, што хаця і парушаў законы, але рабіў гэта на карысьць народа. Апроч таго, ён сьцьвердзіў, што менавіта ён зьяўляецца першым абаронцам народу ("не прафсаюзы, не Вярхоўны Савет, а я").

ТЭЛЕБАЧАНЬНЕ. ***(Беларусь).*** У Беларусі было спыненае вяшчаньне Расейскіх каналаў ОРТ і РТР. Замест іх дзяржаўнае тэлебачаньне трансьлявала прамову прэзыдэнта на Ўсебеларускім Народным Сходзе.

ПРЫЗНАЧЭНЬНЕ. ***(Расея)*** .Замест Аляксандра Лебедзя на пасаду Сакратара Рады Бясьпекі і паўнамоцнага прадстаўніка прэзыдэнта ў Ічкерыі прызначаны былы сьпікер Дзяржаўнай Думы Расеі Іван Рыбкін.

ВІЗЫТ. ***(Узбэкістан).*** Прэзыдэнт Пакістана Фарух Лігары прыбыў з афіцыйным візытам у Ташкент. На сустрэчы з Іcламам Карымавым абмяркоўвалася сытуацыя ў Аўганістане. Мяркуецца прыезд на сустрэчу Рашыда Дустума.

НЯДЗЕЛЯ, 20 КАСТРЫЧНІКА:

СХОД. ***(Беларусь).*** У Менску завяршыўся Ўсебеларускі Народны сход. Рэзалюцыя сходу пра падтрымку прэзыдэнта была прынятая амаль аднагалосна. Але на прапанову з прэзыдыюма нязгодным узьняцца, ніхто не адклікнуўся.

САТАНІЗМ. ***(Беларусь).*** У Заслаўі сатаністы спалілі праваслаўную царкву (былы кальвінскі збор 16 ст.). Вандалы пакінулі на мурах надпіс: "сьмерць хрысьціянам".

ВЫБАРЫ. ***(Літва).*** Выбары ў парлямэнт рэспублікі паводле прагнозаў мусяць скончыцца паразай партыі прэзыдэнта Бразаўскаса і перамогай кансэрватараў на чале з Ландсбэргісам. Тлумачыцца гэта расчараваньнем людзей чатырохгадовым кіраваньнем левых.

ВЫБАРЫ. ***(Нікарагуа).*** На пост прэзыдэнта Нікарагуа прэтэндуюць два асноўныя кандыдаты - лідар сандыністаў Артэга і лібэрал Алеман.

ВЫБАРЫ. ***(Японія).*** На парлямэнцкіх выбарах паводле прагнозаў правячая лібэральна-дэмакратычная партыя на чале з прэм'ер-міністрам Хасімота ня здолее перамагчы і ёй прыйдзецца шукаць хаўрусьнікаў для стварэньня кааліцыйнага ўраду.

ВЫБАРЫ. ***(Эстонія).*** У Эстоніі праходзяць выбары ў мясцовыя органы самакіраваньня.

ПРАТЭСТ. ***(Бэльгія).*** Стотысячная дэманстрацыя прайшла ў сталіцы Бэльгіі Брусэлі. Яна зьявілася адказам на рашэньне Вышэйшага Суда Бэльгіі аб адхіленьні сьледчага Жана-Марка Канэрота, які вёў справу Марка Дзютру. Той абвінавачаны ў пэдафіліі, зьдзеку і забойствах маленькіх дзяўчат.

Кампутарныя энцыкляпэдыі

Знаёмая, напэўна, ледзь ня кожнаму навукоўцу, настаўніку ці студэнту выява: завалены кнігамі ды паперамі стол, ліхаманкавае гартаньне старонак у пошуках тэрміна, прозьвішча, даты... Нечага заўсёды не хапае і трэба даставаць новыя кніжкі, цягнуцца ў бібліятэку, дзе тымі даведнікамі застаўленыя цэлыя лябірынты, нешта замаўляць, губляць гадзіны і дні. А ў выніку — ізноў чагосьці не стае, няма партрэта ці схемы, і трэба йзноў шукаць, гартаць, пераглядаць... Вось каб, скажам, ЭЛіМБел ці нават усю Брытаніку можна было заўсёды ня толькі мець на рабочым стале, а, напрыклад, і цягаць за сабою на ўсялякі выпадак ў кішэні марынаркі...



AppleTalk allows you to work with MS

Яшчэ некалькі гадоў таму словы "мультымэдыя", "гіпэртэкст", CD-ROM гучалі як загадкавыя магічныя замовы. Сёньня тэхніка для ўжываньня так званых аптычных дыскаў уваходзіць у звычайны стандартны мінімум — безь яе цяжка ўявіць сабе сучасны кампутар. Найдаўней знаёмыя такія дыскі аматарам музыкі, але звычайны музычны "кампакт" утрымлівае ў сабе толькі каля гадзіны музыкі. Падобны CD-ROM-дыск, але ў кампутарным фармаце, нясе каля 650 мэгабайт інфармацыі, прычым практычна любой: тэкстаў, малюнкаў, музычных запісаў, відэакліпаў, —гэта ўсё, па-сутнасьці, і ёсьць "мульты—мэдыя", што значыць, "шматкрынічная" інфармацыя.

Пакуль асноўныя спажыўцы CD-ROMаў у нас —прафэсіяналы-кампутаршчыкі (на адным такім дыску можна мець сотні карысных праграмаў) ды апантаныя аматары гульняў (самыя складаныя пэрыпэтыі, самыя ўразныя "жывыя" анімацыі даступныя цяпер толькі праз аптычныя дыскі. Але, магчыма, найбольш цікавы і карысны спосаб ужываньня CD-ROMаў — гэта менавіта захоўваньне, арганізацыя і прэзэнтацыя вялікіх аб'ёмаў рознай інфармацыі: ад самай звычайнай, накшталт кухарскіх парадаў, да высокаспэцыяльнай, прафэсійнай. Прасьцей кажучы — стварэньне даведнікаў, слоўнікаў, энцыклапэдыяў, атлясаў, альбомаў...

Кампутарная энцыкляпэдыя — гэта ня проста набор артыкулаў з дваццаці-трыццаці тамоў звычайнай энцыкляпэдыі, раскладзеных у альфабэтным парадку і запісаных на аптычны дыск. Гэта эфэктыўная сыстэма пошуку практычна любой неабходнай інфармацыі, заснаваная на прынцыпе гіпэртэксту. Сыстэма спасылак (часьцей за ўсё патрэбнае слова пазначана колерам) прыводзіць нас да іншых артыкулаў, імёнаў, назваў, кожная зь якіх таксама выводзіць на новы ўзровень тэксту. Карыстаньне такой сыстэмай можа быць амаль бясконцай захапляльнаю прыгодай у сьвеце ведаў.

Напрыклад, ад тэксту пра кампазытара Баха можна накіравацца ў артыкулы пра пабудову арганаў альбо пра мастацтва барока, праз барока выйсьці на Рубэнса ці Рэмбранта, ад Рэмбранта, скажам, — да тэхналёгіі алейнага жывапісу, адтуль — да вытворчасьці расьліннага алею, далей — у гісторыю гандлёвых шляхоў, потым — да вялікіх геаграфічных адкрыцьцяў, ад іх — у эпоху адраджэньня, затым — да гісторыі мастацтваў і музыкі і, нарэшце, ізноў вярнуцца да Баха. Але пры неабходнасьці можна і хутка, літаральна за некалькі сэкундаў "выхапіць" неабходны разьдзел, не губляючы часу на гартаньне дзясяткаў тамоў і соцень старонак. Прычым большасьць артыкулаў звычайна дапоўненыя ілюстрацыямі. Пры жаданьні можна праслухаць некалькі ўрыўкаў з твораў таго самага Баха, ці нават паглядзець у відэафармаце, як амэрыканскія астранаўты высаджваюцца на Месяцы, ці як Мікіта Хрушчоў махае чаравікам у залі ААН.

Часьцей за ўсё тэксты ды іншую інфармацыю з кампутарных энцыкляпэдыяў няцяжка перанесьці ў свае файлы ды выкарыстаць у працы. "Сярэдняя" энцыкляпэдыя мае да некалькіх дзясяткаў тысячаў артыкулаў, тысячы малюнкаў і фотаздымкаў, па некалькі гадзінаў гуказапісаў, дзясяткі (пакуль даволі каротких) відэакліпаў. У большасьць энцыкляпэдыяў "укладзены" геаграфічныя ды гістарычныя мапы. Амаль у кожнай ёсьць свае арыгінальныя "прыдумкі" — напрыклад, гукавыя лінгвістычныя даведнікі альбо магчымасьць ствараць уласныя слайдфільмы. Ды й самі энцыкляпэдыі бываюць розныя: ёсьць "агульныя" — усё пра ўсё; ёсьць дзіцячыя, гістарычныя, мастацкія, энцыкляпэдыі палітыкаў або дыназаўраў, футболу або катоў, зброі, аўтамабіляў, сэксу. Асобным разгалінаваным жанрам зьяўляюцца электронныя геаграфічныя атлясы, дзе можна пазнаёміцца з мапамі краінаў і плянамі местаў, даведацца пра іхнюю сымболіку, гісторыю, эканоміку. Убачыць краявіды і выдатныя помнікі. Дарэчы, ва ўсіх такіх атлясах, што мне давялося пераг-



лядаць, я яшчэ ні разу не сустракаў лукашэнскі візуальны тэст на псыхічную непаўнавартасьць — усюды зьзяе бел-чырвона-белы колер.

Набыцьцё кампутараў з мультымэдыйным абсталяваньнем, нягледзячы на адносна высокую пакуль цану, ужо становіцца фінансава апраўданым. Гэта эканомія ня толькі месца й часу —самыя кнігі цяпер каштуюць як кампакт-дыскі, а многія тамы сучасных энцыкляпэдыяў пацягнуць ужо на дзясяткі, а то й на сотні даляраў. У нашай жа беларускай сытуацыі, пры татальным наступе рэжыму на свабоду інфармацыі, CD-ROMы, як і сусьветная сетка Інтэрнэт, набываюць адмысловы сэнс, застаючыся "вокнамі волі".

Вядома, па-сапраўднаму пазнаёміцца з электроннай энцыкляпэдыяй магчыма толькі праз кампутар. Але нават і ўладальнікам адпаведнай тэхнікі не заўсёды вядома, што існуе на рынку, што вартае ўвагі, што можа стаць незаменным памочнікам, а што —ня болей чым прыгожая забава. "Наша Ніва" паспрабуе час ад часу знаёміць свайго чытача зь цікавосткамі і навінкамі інфармацыйных кампакт-дыскаў. Адразу ж трэба заўважыць, што так званага цывілізаванага рынку такой прадукцыі ў нас амаль няма і большасьць дыскаў трапляе ў Беларусь у "пірацкіх" варыянтах. Гэта, вядома, асобная праблема, але піраты сёньня, на жаль, не гарантуючы выдатнай якасьці, часам даюць нам магчымасьць набыць за 5-10 даляраў тое, што на самой справе можа каштаваць у дзясяткі разоў болей. Пры сярэднім заробку беларуса гэта, бадай, адзіны шанец далучыцца да сусьвету кампутарных энцыкляпэдыяў. Пры ўмове, вядома, што вы больш менш разумееце хаця б ангельскую мову, — беларускія энцыкляпэдыі застаюцца нязьдзейсьненай марай (ці актуальнай задачай?), і нават неблагое веданьне расейшчыны ня выратуе вас у гэтай сытуацыі — расейскамоўны прадукт таксама на рынку рэдкасьць.

Вацлаў Арэшка

Гісторыя Сьвету на CD-ROM



Oksfordzka Encyklopedia Historii Świata. Od prehistorii do 1800 r. PROmedia CD. 1996.

Зусім нядаўна на польскім рынку зьявілася ліцэнзійная вэрсія англамоўнай Оксфардзкай Энцыкляпэдыі Сусьветнае Гісторыі ў польскім варыянце. Гістарычныя электронныя даведнікі ўвогуле даволі рэдкі ў нас прадукт, а польскі асабліва цікавы тым, што зразумелы для большасьці зацікаўленых гісторыяй жыхароў Беларусі ды больш-менш даступны (праз кантакты з Польшчаю). Такім чынам, перад намі першы том — ад дагістарычнага пэрыяду да 1800 году. Другі, абяцаны неўзабаве, ахопіць час ад 1800 — да сучаснасьці.

Станоўчы бок энцыкляпэдыі — гэта простае карыстаньне. Аўтары прапануюць даволі ўдалы інтэрфэйс, які складаецца са звычайнага мэню, адпаведных іконак і так званых "Тэматычных старонак", якіх мы маем тры: "Энцыкляпэдыя", "Дынастыі сьвету" і дапаўненьне польскіх выдаўцоў — "Пералік польскіх каралёў", у які ўваходзяць, пачынаючы зь Ягайлы, і літоўскія вялікія князі. Вядома, адразу прываблены апошняй старонкай, я, прызнаюся, быў крыху расчараваны — біяграфічныя даведкі даволі сьціплыя, амаль няма генэалягічных зьвестак. Затое можна знайсьці каляровыя партрэты большасьці манархаў. "Дынастыі сьвету", увогуле, — гэта табліцы зь мінімальнай інфармацыяй.

Найцікавейшая старонка, зразумела, самая Энцыкляпэдыя. Экран з гэтай старонкай дзеліцца на некалькі частак: тэкставая панэль — з асноўным тэкстам артыкулаў, панэль ілюстрацыяў ды панэль індэксаў, дзе можна набраць ці адшукаць з агульнага сьпісу неабходнае слова. Невялікая выява зямной кулі ўказвае геаграфічны локус. Пошук тэрмінаў адбываецца вельмі проста: на панэлі індэксаў у полі "Пошук слова" трэба набраць тэрмін ці імя, што зацікавіла Вас, і, націснуўшы курсорам мышы на клавішу "Шукай", пачакаць пару сэкундаў, пакуль слова не аб'явіцца на полі "Знойдзеныя словы". Затым націснуць на "Пакажы" і знаёміцца з артыкулам у тэкставым полі. Калі вы ня ведаеце, чаго вам хочацца, можна прагартаць усе 2500 артыкулаў энцыкляпэдыі. У артыкуле, які вас зацікавіў, можна пабачыць, калі яна ёсьць, адну з 700 ілюстрацыяў, паслухаць музычны запіс (агульная колькасьць — 90 хвілінаў гучаньня), праглядзець адзін з 25 відэакліпаў (такіх, як "Вэрсаль", "Дракула", "Маўры"...) ці пазнаёміцца з адной з 47-мі інтэрактыўных мапаў. На мапах, націснуўшы на выдзеленыя кропкі, можна раскрыць дадатковы артыкул альбо ілюстрацыю. У самім тэксьце выдзеленыя словы адсылаюць Вас да асобных артыкулаў у невялікай панэлі спасылак.

У прынцыпе, каб разабрацца ў тым, як карыстацца энцыкляпэдыяй, нават ня надта дасьведчанаму ў кампутары чалавеку дастаткова некалькіх хвілінаў. Для больш прафэсійных карыстальнікаў ёсьць і дадатковыя выгоды, напрыклад, панэль "Фільтры", на якой можна выбраць патрэбную табе тэму, абмежаваўшы колькасьць артыкулаў для прагляду, ці панэль пошукаў, якая дапаможа знайсьці ўсе згадкі пра той ці іншы тэрмін, прозьвішча ці назву. Пры неабходнасьці тэкст ці мэдыя-файл можна перанесьці з энцыкляпэдыі ў свой уласны дакумэнт.

Слабым бокам Оксфардзкай энцыкляпэдыі можна палічыць адносна невялікі аб'ём мэдыя-файлаў, ня надта моцны ўзровень гіпэртэксту. Па-сутнасьці, гэта ня столькі навуковая, колькі сямейная, аматарская энцыкляпэдыя, якая нясе веды хутчэй для "проста зацікаўленых", чым для тых, хто сур'ёзна вывучае сусьветную гісторыю.

"Цікава, як мы самі ўспрымаемся ў кантэксьце гэткай англа-амэрыканскай хатняй агульна-сусьветнай гісторыі", —зусім натуральна падумаў я. І ў каторы раз адчуў квасны прысмак агіды, матляючыся па артыкулах "Оксфарда". Бо — аніяк! Ёсьць артыкулы Польшча, Расея, Украіна, Інфлянты... Ёсьць Ян Сабескі, Ягелоны, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі... Няма ні Беларусі, ні Вялікага Княства Літоўскага, ні хаця б проста Літвы, хоць апошняя згадваецца некалькі разоў і нават у "Дынастыях сьвету" ёсьць пералік "літоўскіх князёў" да Жыгімонта Старога. Не са злосьці — проста забылі. Сапраўды, чаго ж ім за нас помніць?! Але ня толькі Беларусі не хапае у гэтай энцыкляпэдыі, вельмі сьціпла падаецца і большасьць тэмаў па-за межамі Эўропы ці Паўночнай Амэрыкі, адсутнічаюць артыкулы, прысьвечаныя мэтадалёгіі, структуры гістарычных ведаў. Не перашкодзіла б і звычайная ў вялікіх кампутарных энцыкляпэдыях "Time Line" — "страла часу" з паказам храналёгіі сусьветных падзеяў. Але што ёсьць — тое і ёсьць. І гэтак Оксфардзкая Энцыкляпэдыя Сусьветнае Гісторыі будзе неблагім дапаможнікам для студэнта, а асабліва настаўніка ці выкладчыка, карыснаю для сямейнае навукі зь дзецьмі. Дарэчы, — і натхняльным прыкладам для нашых энтузіястаў электронных даведнікаў...

Той, хто захоча набыць Оксфардзкую Энцыкляпэдыю, павінен мець на ўвазе, што калі ён карыстаецца ангельскім ці расейскамоўным, а ня польскім Windows'ам, то яго чакаюць праблемы са спэцыфічнымі польскімі літарамі. Іх можна вырашыць, калі пакорпацца ў мэханізмах Windows, альбо проста пазначыўшы сабе, які знак якой літары адлавядае. Калі вы крыху ведаеце пальшчызну, гэта ня надта складана. Каштуе кампакт у польскіх крамах каля сарака даляраў. Нямала, але пірацкіх вэрсіяў пакуль не чакаецца.

Вацлаў Арэшка

Навіны



ОФІС НА РУЦЭ

Па меры таго, як тэхналёгія вядзе да меншага, менш груваcткага і менш энэргаспажывальнага абсталяваньня Брытанскі Тэлеком выпусьціў на рынак рабочы прататып "Офісу на руцэ", пра пляны стварэньня якога было абвешчана два гады таму, што гучала тады як чыста футурыстычная ідэя.

Распрацаваная ў лябараторыі фірмы ў Мартлешаме, што на ўсходзе Англіі, абсталяваньне мацуецца раменчыкам на руку і выкарыстоўваецца ў камплекце з шлемам віртуальнай рэальнасьці ды мікрафонам.

[На фатаздымку паказаны прататып абсталяваньня, якое выпрабоўвае супрацоўніца Брытанскага Тэлекому].

Пры выкарыстаньні мабільнай тэлефоннай сувязі кампутар можа напрамую зьвязвацца зь іншымі кампутарамі ў офісе карыстальніка ці яго калегаў.

У склад абсталяваньня ўваходзіць вадкакрышталёвы каляровы дысплей фірмы "Casio", мікрапрацэсар фірмы "Apple Macintosh", апэратыўная памяць на 32 мэгабайты, жорсткі дыск на 500 мэгабайтаў ды мініятурная клявіятура. Сыстэма распазнаваньня голасу дазваляе праз мікрафон аддаваць кампутару каманды без дапамогі клявіятуры.

ПАНЯДЗЕЛАК, 21

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Мультфільм.
8.40 "Цягнік са станцыі дзяцінства". М/ф. С. 1.
9.45 Фінансавы час.
10.05 Цёмны пакой.
10.35 "Вандроўка па Браслаўу". Д/ф.
10.45 З фонду БТ.
11.45 "Вазьмі мяне з сабой". М/ф.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільм.
15.20 Студыя "Вакно".
15.45 ТБ — школе.
16.05 Майстроўня.
16.30 "На добры лад".
16.45 Крок.
17.15 "Пазнай сябе".
17.45 "Гэтага мы не праходзілі..."
18.00 Фінансавы час.
18.25 Музычны антракт.
18.40 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.45 Вэртыкаль.
20.15 Люстэрка.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Вышыня". М/ф.
23.20 Тэлевізійны Дом кіно.
23.55 Навіны.

ОРТ

17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Адгадай мэлёдыю.
19.00 "Мы".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 "Багз — электронныя жучкі". "Пульс".
21.45 "Жыццё цудоўных людзей".
22.10 Навіны.
22.20 "Лінія кіно". "У чацьвер і болей ніадкуль".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

17.05 Технадром імя І.П.Кулібіна.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант ісьціны.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.00, 23.00 Весткі.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Джэнтльмэн-шоу.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "На вастрыі нажа". М/ф.
22.00 Тэлескоп.
22.30 Арт-абстрэл.
23.25 Тавары — поштай.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бясьпекі.
13.55, 15.55, 18.55, 24.00 Інфарм ТБ.
14.10 "Першае каханьне".
14.55 Мультфільм.
15.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
16.05 Міжнародны агляд.
16.35 "Інспэктар Гэджэт".
16.55 "Парад парадаў".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 "Хатлянта" — дыксілэнд.
20.50 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 Гістарычныя досьледы.
22.50 Чэмпіянат Эўропы па дзюдо.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 Анонс тыдню.
7.25 "Майсей заканадаўца".
8.15 "Чалавек у масцы".
8.50, 12.50 Лятынамэнія.
9.125 М/ф "Наш двор".
10.40 Доктар Угал.
11.15 М/ф "Баракуля".
13.15 Расейскі альбом. Гурт "Машына часу".
13.30 Вынікі.
15.45 Урокі Фэміды.
16.15 ВГІК. Далягляды кіно і відэа.
16.40 Навіны.
17.00 "Горац".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. "Вялікія вогненныя шары".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
22.30 Часінка.
23.20 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 22

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Абібок.
8.45 "Гэтага мы не праходзілі..."
9.00 ТБ — школе.
9.20 "Дзяжурная аптэка".
10.20 Тураб'ектыў.
10.40 Мультфільмы.
11.05 "Цягнік са станцыі дзяцінства". С. 2.
12.10 Акаляда.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.45 ТБ — школе.
16.05 "Усё пра ўсё".
16.30 Радавод.
16.55 Падагагічны экран.
17.40 Творцы.
18.10 Будзьце здаровыя.
18.25 Музычны антракт.
18.40 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 "Трапічная сьпёка". Сэрыял.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.15 М/ф "Мой сябра Іван Лапшын".
23.50 Дзённік фэстывалю "Залаты шпігер".
24.00 Навіны.

ОРТ

11.00 Навіны.
11.10 "Мы і рынак".
11.55 "ТАСС мусіць заявіць..."
13.00 "Жоўты бусел". Мультфільм.
13.10 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак".
14.45 Квар'ета "Вясёлая кампанія".
14.55 Мульціпролія.
15.10 Чароўны сьвет, ці Сынэма.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 ...Да шаснаццаці і болей.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Адгадай мэлёдыю.
19.00 Тэма.
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 Фільм "Вялікае жыцьцё".
23.50 Навіны.
0.00 Сэрыял "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Экспа-весьнік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Санта-Барбара". М/ф.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чаленджэрс".
17.10 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.20 Сьпяваюць драматычныя артысты.
17.45 Надзвычайны канал.
18.15 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Раз ны тыдзень.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Ад форта да пьяна.
21.30 "Ускрыцьце прыхадня — факт ці фантазія". Д/ф.
22.30 Эх, дарогі!
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Хто на што здатны".
24.00 Гукавая дарожка.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.20 Інфарм ТБ.
12.10 "Першае каханьне".
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
14.55 Чэмпіянат Эўропы па дзюдо.
16.05 Тата, маці і я — спартовая сям'я.
16.35 "Інспэктар Гэджэт".
16.55 Дзіцячае ТБ: "Дзецям пра жывёлаў".
17.20 Мультфільм.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Формула згоды.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 "Крах інжынэра Гарына". М/ф. С. 1.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Майсей заканадаўца".
8.05 Лепшыя цыркі сьвету.
9.15 М/ф "Лурджа Магданы".
10.20 Лятынамэнія.
10.45 Доктар Угал.
11.15 М/ф "Чалавек са страхавой кампаніі".
12.45 Расейскі альбом. Гурт "Брава".
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
14.55 "Знакаміты штукар Мацьвей Казакоў". Д/ф.
15.15 Ю.М.Лотман. Гутаркі пра расейскую культуру.
16.00 Заняткі маляваньня.
16.15 ВГІК. Далягляды кіно і відэа.
16.40 Навіны.
17.00 "Горац".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Фільм "Псыхатэрапэўт".
20.40 Расейскі альбом. Гурт "Божая кароўка".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
22.30 Часінка.
23.20 Вялікі рынг.
23.50 Мэлямэнія. "Эрык Клэптан".

СЕРАДА, 23

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 ШАНС.
8.45 "Той, хто крочыць у цемры, ня ведае, куды ідзе". Д/ф.
9.00 ТБ — школе.
9.20 Мультфільм.
9.30 "Выспа натхненьня". Спэкт.
10.05 "Трапічная сьпёка".
11.05 Кампутарны палігон.
11.35 Відэьма-нявідзьма.
12.35 "Я зьвярнуў правасуддзе". М/ф.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.50 Маёнтак.
16.15 Канцэртны сэзон.
17.10 Крэда.
17.30 Госьці ў хату.
18.00 "Жывая душа дрэва". Д/ф.
18.25 Музычны антракт.
18.40 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.30 "Хто гэта?"
19.40 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 "Дамскае танга". М/ф.
23.45 Супэргол.
0.15 Навіны.
0.30 Караліеўскае паляваньне.

ОРТ

11.00 Навіны.
11.10 Кантакт.
11.55 "ТАСС мусіць заявіць..."
13.00 "Суседзі". Мультфільм.
13.10 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак".
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Тэт-а-тэт.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 Адгадай мэлёдыю.
19.05 "Парыскія тайны Эльдара Рязанова".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 Фільм "Тэс".
23.45 Навіны.
23.55 "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У сьвеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 М/ф "Людзі і манэкены". С. 1.
16.20 Блёк-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.15 Астралёгія каханьня.
17.45 Вашае права.
18.15 Клюб губэрнатараў.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 "Барылка мёду".
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Боб Робэртс". М/ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Хто на што здатны".
24.00 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.15 Інфарм ТБ.
12.10 "Першае каханьне".
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
14.55 "Тэатральная правінцыя?.."
15.25 "Пад небам Бэрліна". Т/ф.
16.05 Асабістая справа.
16.35 "Інспэктар Гэджэт".
16.55 "Балетная сюіта". Т/ф.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Да 200-годзьдзя Гатчыны.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 "Крах інжынэра Гарына". С. 2.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Майсей заканадаўца".
8.05 Лепшыя цыркі сьвету.
9.15 М/ф "Дзень апошні, дзень першы".
10.35 М/ф "Цудоўныя гады".
11.15 М/ф "Таемныя жарсьці".
12.50 Лятынамэнія.
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
14.55 "Канстанцін Ваншэнкін. Пошукі сябе". Ч. 3.
15.55 Расейская мова.
16.15 ВГІК. Далягляды кіно і відэа.
16.40 Навіны.
17.00 "Горац".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 Фільм "Зацятыя махляры".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
22.30 Часінка.
23.20 Такое спартовае жыцьцё.
23.50 Кавярня "Абломаў".

ЧАЦЬВЕР, 24

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 "Купалінка". Д/ф.
9.00 Каралеўскае паляваньне.
9.40 Мультфільм.
9.55 Тэлебом-дыскатэка.
10.40 "Трапічная сьпёка".
11.40 Госьці ў хату.
12.10 Музыка бязь межаў.
12.40 М/ф "Бацькі".
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.50 Студыя "Вакно".
16.15 ТБ — школе.
16.45 Беларускі дом.
17.05 Збройня.
17.35 Памежжа.
18.00 Творцы.
18.25 Музычны антракт.
18.40 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 Гадзіна аркестра.
22.55 "Оскар".
23.55 Навіны.

ОРТ

8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.00 "Парыскія тайны Эльдара Рязанова".
9.40 Клюб вандроўнікаў.
10.25 "Стары і жураўель". Мультфільм.
10.35 Смак.
11.00 Навіны.
11.10 "Пад дахам сьвету".
11.55 М/ф "Расейскі транзыт". С. 1.
12.50 "Прыгоды Коскі і Кропкі". Мультфільм.
13.05 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак".
14.45 Лега-га!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Рок-урок.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.05 Гадзіна пік.
18.30 Грай, гармонік любы!
19.00 "Мая сям'я".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 М/ф "Маратонец".
23.10 Навіны.
23.20 "Абоз".
0.10 "Пятніца, 13".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Экспа-весьнік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Людзі і манэкены". С. 2.
16.20 Блёк-нот.
16.35 Цыкляль "Галерэя".
17.10 Экспа-весьнік.
17.20 Царская ложа.
17.45 "Цёмная" для П.Маставога.
18.00 Новае пятае кола.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Лята-мільён.
20.45 Рэк-тайм.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Луна-парк". М/ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 "Хто на што здатны".
24.00 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.30 Інфарм ТБ.
12.10 "Першае каханьне".
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
14.55 Дырыжуе Георг Шолці. 6-я сымфонія П.І.Чайкоўскага.
15.45 "Адроджаны звон". Т/ф.
16.10 Парадоксы гісторыі.
16.35 "Інспэктар Гэджэт".
17.00 Дзіцячае ТБ: "Казка за казкай".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Асабістая справа.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 "Закуліссе".
22.50 Тэлекампакт.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Майсей заканадаўца".
8.05 М/ф "Цудоўныя гады".
8.50 Лятынамэнія.
9.15 М/ф "Ну і моладзь!"
10.50 Доктар Угал.
11.15 М/ф "Каханьне і хлусьня".
12.50 Расейскі альбом. Гурт "Ноль".
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
14.55 Амплітуда пасылеху.
15.10 "Слаўны майстар Васіль Бажэнаў". Д/ф.
15.35 Ю.М.Лотман. Гутаркі пра расейскую культуру.
16.15 ВГІК. Далягляды кіно і відэа.
16.40 Навіны.
17.00 "Горац".
17.30 "Вуліца Сэзам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Анёл цемры".
20.35 Расейскі альбом. Гурт "Дзюна".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
22.30 Часінка.
23.20 Кіно не для ўсіх. "Джульета і духі".

ПЯТНІЦА, 25

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Мультфільмы.
8.30 Аксаміта вы сэзон.
9.00 ТБ — школе.
9.30 "Уся справа ў калтуры".
10.00 "Трапічная сьпёка".
11.00 Люстэрка.
11.20 З фондаў БТ.
12.15 "Меншы сярод братоў". М/ф.
15.00 Навіны.
15.15 Мультфільмы.
15.55 "Як нараджаецца музыка?"
16.15 Да 300-годзьдзя Расейскага флёту.
16.40 "Крок".
17.10 Кантрасты.
17.40 Эканамікст.
17.50 "Сталіца".
18.50 Навіны.
19.35 "Трапічная сьпёка".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 "Леў Талстой". М/ф. С. 1.
23.40 "12, ці На ноч глядзячы".
24.00 Навіны.
0.15 Акаляда.

ОРТ

8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.10 "Мая сям'я".
9.50 Пакуль усе дома.
10.30 Ранішняя пошта.
11.00 Навіны.
11.10 Ад пятніцы да пятніцы.
11.55 "Расейскі транзыт". С. 2.
12.50 "Чароўная палачка". Мультфільм.
13.05 Брэйн рынг.
14.00 Навіны.
14.20 "Горад сабак".
15.00 "Марыць ня шкодна".
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Дзейсныя асобы.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.15 Чалавек і закон.
18.45 Поле цудаў.
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.40 М/ф "Калёмба ідзе на гільятыну".
22.25 Погляд.
23.10 Навіны.
23.20 Начная кіназаля. "За дзесяць хвілінаў да поўначы".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У сьвеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 Гандлевы дом "Ле Монц".
10.35 "Людзі і манэкены". С. 4.
16.20 Блёк-нот.
16.35 Часопіс часопісаў.
16.45 Імпэрыя гульняў.
17.35 Крок за крокам.
17.45 Вэрхаль.
18.10 Бясконцае вандраваньне.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Футбол. Чэмпіянат Расеі.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Адамаў яблык.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.15 Інфарм ТБ.
12.10 "Першае каханьне".
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.10 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
14.55 "Брава, маэстра!"
15.15 "Тэлекампакт".
16.05 Ток-шоў "Наўздагад".
16.35 "Інспэктар Гэджэт".
16.55 "Закуліссе".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 "Бяз назвы".
20.55 Спартовы агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мэйкпіс".
21.55 Падзея.
22.10 "Крах інжынэра Гарына". С. 3.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёньня.
7.15 "Майсей заканадаўца".
8.05 М/ф "Цудоўныя гады".
8.50 Лятынамэнія.
9.15 М/ф "Апошні ваяр".
10.45 Расейскі альбом. Гурт "Дзюна".
11.15 М/ф "Шэпт".
12.45 Доктар Угал.
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Жанчыны зь Дзікага захаду".
15.00 Мінарэт.
15.35 "Стваральнік Масквы Осіп Бавэ". Д/ф.
15.55 Расейская мова.
16.10 ВГІК. Далягляды кіно і відэа.
16.40 Навіны.
17.00 М/ф "Дзеці супраць монстраў". С. 1.
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф "Каўказкая палоньніца, ці Новыя прыгоды Шурыка".
20.25 Расейскі альбом. Гурт "Машына часу".
21.35 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
23.20 "Эмітывілскі жах". М/ф.
1.20 Начны канал. Эратычныя шоў сьвету.

СУБОТА, 26

БТ

8.00 Навіны.
8.15 "Сугучнасьць".
8.35 Сутнасьць.
9.05 Лёс мой і надзея.
9.40 Здароўе.
10.10 Усё пра ўсё.
10.35 Вандроўнік.
10.50 Шматгалосьсе.
11.20 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
11.40 "Вока".
12.05 "Подых навальніцы". М/ф.
14.25 Каляж.
14.55 Творцы.
15.40 "Выспа нашай маладосьці".
16.55 "Гісторыя каханьня".
17.15 Прэс-імпрэза.
17.55 Беларускі дом.
18.35 Галерэя.
19.05 V Міжнародны фэстываль мастацтваў "Славянскі базар-96". Ч. 2.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.45 Музычны антракт.
21.55 С.Блатун. "Палын бясьсмерця". Спэкт.
22.20 "Леў Талстой". С. 2.
23.50 Відэьма-нявідзьма.

ОРТ

7.00 М/ф "Груз без маркіроўкі".
8.30 Слова пастыра.
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00 Навіны.
9.15 Не пазяхай!
9.45 Ранішняя пошта.
10.20 Смак.
10.45 Вяртаньне Трацьцякоўкі.
11.10 Фільм "Пікавая дама".
12.45 Разумнікі і разумніцы.
13.30 Пад знакам "Пі".
14.00 Навіны.
14.20 "Вяртаньне на Выспу скарбаў".
15.10 "Вакно ў Эўропу".
15.40 У сьвеце жывёлаў.
16.10 "Кола гісторыі".
17.00 Навіны.
17.20 Ералаш.
17.45 Фільм "Верныя сябры".
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Час.
20.50 "Вэтнам. Да запатрабаваньня".
21.45 "Калямбур".
22.15 Фільм "Жуль і Джым".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Лукамор'е.
7.35 Мультфільм.
8.05 "Мак і Матлі".
8.30 Па вашых лістах.
9.00 Экспартлес.
9.15 Парлямэнцкі тыдзень.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Кнігарня.
10.30 Добрай раніцы.
11.00 21-ы кабінэт.
11.25 Ананімныя суразмоўцы.
11.55 "Паэт у Расеі — болей, чым паэт..."
12.25 Прасыцей простага.
13.00, 19.00, 23.55 Весткі.
13.20 "Тайна Сахары". С. 5.
14.15 Нічога, апроч...
14.30 Дэ факта.
14.55 Сад культуры.
15.25 Сваая гульня.
15.50 Песьня Расеі.
16.45 Старая кватэра.
18.00 "Каралева Марго". С. 14.
19.35 Суботні вечар зь Зіновіем Гертам.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 Падвойны партрэт.
22.05 "Гары Трэйс". М/ф.
0.10 Праграма "А".

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Па рацэ плыве сякера.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 "Гонар маю".
10.40 "Стольці пачуцьця ў напеве родным". Ф/к.
11.10 Ток-шоў "Наўздагад".
11.40 Жарсьці-мардасьці.
12.10 "Чалавек-нябачанка". Тэлеспэкт.
14.10 Яшчэ адна Расея.
14.25 Прысады.
14.50 Мультфільм.
15.10 Спартовы агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 Экспрэс-кіно.
16.35 Дзіцячае ТБ: студыя "Уявi".
17.00 Зэбра.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.20 "Рызыка без кантракту". М/ф.
20.40 "Брава, маэстра!"
20.55 Сьвецкая кроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.45 Раман з героем.
22.15 "Крах інжынэра Гарына". С. 4.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00 М/ф "Цудоўныя гады".
7.50 М/ф "Сьмерць паводле кантракту". С. 1.
8.40 Расейскі альбом. Гурт "Калібры".
9.00, 13.00 Сёньня.
9.15 М/ф "Альфрэда, Альфрэда".
10.55 Лепшыя цыркі сьвету.
11.25 М/ф "Ва ўцёках".
13.15 Фэстываль міні-сэрыялаў. "Таемныя злачынствы".
15.25 Раманса кранальных гукі.
15.45 Крок з кола.
16.05 Інфармацыйны агляд.
16.25 Ток-шоў "Кар'ера".
17.00 "Дзеці супраць монстраў". С. 2.
17.30 Дог-шоў "Я і мой сабака".
18.00, 21.00 Сёньня.
18.30 "Крымінальная Расея: сучасныя кронікі". Д/ф.
19.00 Міні-сэрыял "Таемныя злачынствы".
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 М/ф "Сатырыкон Фэліні".
23.50 Трэцяе вока.
0.35 Начны канал. "Плэйбой".

НЯДЗЕЛЯ, 27

БТ

8.00 Кола часу.
8.30 "Канон".
8.55 Пераможца.
9.15 Студыя "Калыханка".
9.45 Вяршыня сьвету.
10.20 "Усё нармальна, мама!"
10.50 Тураб'ектыў.
11.20 Марсава поле.
11.50 Міжнародны кур'ер.
12.20 Сьвет прыроды і захапленьняў.
12.40 Прэм'ер-кіно.
13.25 Студыя "Вакно".
14.20 "Вайна ў паветры".
14.45 Вас выклікае Спартляндыя.
15.45 Мост.
16.10 Тэатар у фатэлі.
16.50 "Залатыя ключы".
17.30 М/ф "Карусель".
18.40 Кампутарны палігон.
19.05 Абібок.
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартовы тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў "Карамболь".
22.00 М/ф "Галантныя дамы".
24.00 Аксаміта вы сэзон.

ОРТ

7.00 Фільм-казка "Трэці прынц".
8.25 Мультфільм "Чароўная крама".
9.00 Навіны.
9.15 "Непуцёвыя нататкі".
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Ранішняя зорка.
11.00 "Служу Расеі!"
11.30 Грай, гармонік любы!
12.00 Рускі мір.
12.30 Сэрыял "Падводная адысэя каманды Кусто".
13.25 Сьмехапанарама.
14.00 Навіны.
14.20 Зоркі опэры.
15.10 Клюб вандроўнікаў.
15.55 Някк раз.
16.05 Мультфэервэрк.
16.45 "Сам насам".
17.20 Шчасьлівы выпадак.
18.10 Песьня-96.
19.00 Час.
19.40 КВЗ-96.
21.50 Футбольны агляд.
22.20 Навіны.
22.30 Фільм "Сустрэчная цяга".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

7.00 Лукамор'е.
7.30 Мультфільм.
7.50 Спортлято.
8.00 "Мак і Матлі".
8.20 "За воколіцай".
8.35 Пілігрым.
9.00 Вуснамі дзіцяці.
9.30 Прысяга.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Расейская лято.
10.55 Прыз групы "Сава".
11.00 Чалавек на зямлі.
11.30 Кнігарня.
12.00 Тэлетэатар. А.П.Чэхаў. "Шампанскае", "Размова пьянага з цьвярозым чортам".
12.25 Прасыцей простага.
13.00, 23.25 Весткі.
13.20 "Тайна Сахары".
14.15 Нічога, апроч...
14.30 Дыялегі пра жывёлаў.
14.55 Караоке па-расейску.
15.25 Экіпаж кругасьветнага плаваньня.
15.55 Рэпартэр.
16.10 Футбол бязь межаў.
16.40 "Ва ўсіх на вуснах".
17.00 Чароўны сьвет Дысная.
18.00 "Каралева Марго". М/ф.
19.00 Люстэрка.
19.55 Надвор'е на заўтра.
20.00 Рэпартаж ні пра што.
20.15 "Спортлято-82". М/ф.
21.55 "Калізэй".
22.50 У Ксюшы.
23.40 Шпацыр зь Ёганам Штраўсам.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Тата, маці і я — спартовая сям'я.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Оверхайм.
10.40 "Незацугляная Афрыка".
11.10 Храм.
11.40 Увесь гэты цырк.
12.10 "Музычная гісторыя". М/ф.
13.30 "Вайсковая музыка". Ф/к.
14.10 Яшчэ адна Расея.
15.10 Салісты Марыінкі.
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ: "Паласатая музыка", "Казка за казкай".
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбургу.
19.20 "Прысьвячэньне".
19.35 "Трохкутнік". М/ф.
20.55 Ва ўсіх на вуснах.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.20 "Парлядзім".
22.35 "Ідэальная пара". М/ф.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00 М/ф "Цудоўныя гады".
7.50 "Сьмерць паводле кантракту". С. 2.
8.40 Лятынамэнія.
9.00, 13.00 Сёньня.
9.15 М/ф "Плач нявінніца".
10.50 Лепшыя цыркі сьвету.
11.20 М/ф "Дзявоцкасьць".
12.45 Расейскі альбом. Гурт "Наста".
13.15 Міні-сэрыял "Таемныя злачынствы".
14.00 Надоечы.
14.40 Лялькі.
15.25 Пад'ём пераваротам.
15.55 "Бесьсмяротны ваяр".
16.25 Забытыя імёны. Сяргей Дзягілеў.
17.00 "Дзеці супраць монстраў". С. 3.
17.30 "Сто да аднаго".
18.00 Сёньня.
18.30 "Чалавек у масцы".
19.10 "Зьнікłыя цывілізацыі".
20.00 Вынікі.
21.10 М/ф "Кароль камэдыі".
23.00 Лепшыя шоў і вар'етэ сьвету. "Дзяўчаты Парыжу".

21.10 – 27.10

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* – Махнаты сарцаед-2 (камэдыя), 21-27 — 18.30, 20.30 Мэлядрама на экране: Жмуркі, 22-27 — 16.30 Да 60-годзьдзя рэжысэра В.Т.Турава: Нядзельная ноч, 21 — 16.30 Для дзяцей: Акрабат на Паўночным полюсе, 21, 23 — 14.40 Капітанская дачка, 22 — 14.30

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* –

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* – Праз каналізацыю (баявік), 21-26 — 15.20; 27 — 15.20 (ільготны) Каханьне і магія, 21-27 — 18.30, 21.20 Запавет блакітнага дзядзькі (эратычны фільм), 21-27 — 20.05, 21.20 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Усьмешка", 22, 26-27 — 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка, 24 — 21.00 Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30", 25 — 20.30 Кіна-дыскашоў для дзяцей і падлеткаў, 27 — 15.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* – Кінапраграма па прафіляктыцы СНІД: Дакумэнтальны фільм. Аварыя — дачка мянта (мастацкі фільм).
Выступленьне спэцыялістаў рэспубліканскага цэнтру прафіляктыкі СНІД. 16.00; 8, 10 — 14.00
Відэасалён Разборка ў Бронксе Рэж. Стэнлі Тонг, у ролях — Джэкі Чан, Аніта Муі, Франсуа Ўіп. Баявік 1995 г. 7-13 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* – Мастацтва каханьня, 21-25 — 13.00, 19.00, 20.30 Ліхая парачка, 21-25 — 12.00, 16.20, 20.40 Прыватны дэтэктыў, ці Апэрацыя "Каапэрацыя", 21 — 15.00; 22-25 — 15.00, 17.00 Заля індыйскага фільму: Акіян (2 сэрыі), 21-25 — 14.00, 18.00 Да 60-годзьдзя рэжысэра В.Т.Турава: Пункт адліку, 21 — 17.00 Відэапаказ: Дракула мёртвы і задаволены гэтым, 21-23 — 16.00; 24-25 — 14.00 Дасьпехі Бога-2 ("Апэрацыя "Кондар"), 21-23 — 18.00; 24, 25 — 16.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* – Схватка (2 сэрыі), 21-27 — 15.40, 20.20 Дзяўчынка і дэльфін, 21-25 — 14.00, 18.40; 26-27 — 14.00 (ільготны), 18.40

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* – Леапард (прыгоды), 22-25, 27 — 15.00; 26 — 15.00 (ільготны) Дэльта Вэнэры (эратычны), 22-24 — 16.50, 18.40, 20.30; 23, 25-27 — 16.50, 18.40 Відэапаказ, 21-27 — 10.00, 12.00, 16.00, 18.00, 20.00 Для дзяцей: Месяц-44 (баявік), 22 — 13.30 Сяброў знойдзеш заўсёды (мультфільмы), 27 — 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* – Прыдуркі ў Галівудзе, 21-25 — 16.50, 21.10; 26 — 18.40; 27 — 16.40, 21.00 Апошні кінагерой, 21-25 — 19.00; 26 — 16.30, 20.50; 27 — 14.30 (ільготны), 18:50 Для дзяцей: Дыскатэка "Лімпапо", 26 — 14.00; 27 — 12.00

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* – Сабакі пекла (новы стэрэаскапічны трылер), 21 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 22-25 — 14.00, 16.00, 18.00, 19.30; 26-27 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 19.30 Фірма (2 сэрыі), 21 — 17.50; 22-27 — 12.50, 17.50 Правая і левая рука д'ябла, 21 — 21.00; 22-24 — 15.50, 21.00; 25-27 —15.50 Кінацыкаль па вайскова-патрыятычным выхаваньні "Мужнасьці і гераізму прысьвячаецца" (для школаў Партызанскага раёна): Ваўчыная песьня (дакумэнтальны фільм). Палянэз Агінскага (мастацкі фільм), 21 — 15.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 25-27 — з 20.00 да 23.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* – Куля блукае, 21-23, 25-27 — 16.00, 19.15, 21.00; 24 — 16.00 (ільготны), 19.15, 21.00 На халяву, 21-27 — 17.45 За цудоўных дам!, 25 — 14.30 (дабрачынны) Для дзяцей: Сьвет казак (кіналектар), 21-22 — 12.00

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* – Барханаў і ягоны целаахоўнік, 21-27 — 15.00, 17.00 Дзядзька Бак (камэдыя), 21-27 — 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 23-25, 27 — 21.00; 26 — 20.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў, 27 — з 16.00 да 18.00 Дэнс-шоў, 25-26 — з 24 да 6.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* – Чорны шэрыф, 21 — 15.30, 17.10; 22-25 — 13.30, 17.10; 26-27 — 15.10 Ванільна-трускаўковае марозіва, 22-24 — 15.20, 19.00; 25 — 15.20; 26-27 — 17.20 Для дзяцей: Кароль-Драздавік, 21-23 — 10.00 Лунная вясёлка, 21 — 12.00 Чорная курыца, ці Падземныя жыхары, 21 — 14.00 Старая, старая казка, 24-25 — 10.00; 26-27 — 12.00 Вяртаньне з арбіты, 24-25 — 11.50; 26-27 — 13.50 Пінчар Боб і сем званочкаў (мультфільм), 26-27 — 10.30

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* – Сеці рэкету, 21, 23-27 — 18.00 Уцекачы, 21, 23-24 — 16.20, 20.20; 25-27 — 16.20 Музычна-забаўляльная відэапраграма, 25-27 — з 19.00 па 24.00 Відэа-дыска-шоў для падлеткаў, 23 — з 18.00 па 22.00 Клюб знаёмстваў (для тых, каму зза 30), 24 — з 19.30 па 24.00 Відэазаля: Аднойчы праз шмат гадоў (для дзяцей), 23-27 — 16.00 Сэрца тыгра (баявік), 23-27 — 18.00 Жартаўнікі (камэдыя), 23-27 — 20.00 У кінатэатры працуе відэабар

РАКЕТА *(Рабочы зав., 3, тэл. 260-620)* – Маладая лэдзі Чатэрлей, 21-24 — 17.00, 20.30; 26-27 — 15.00, 18.30, 20.10 Вяртаньне ваўчыцы, 21-24 — 18.40; 26-27 — 16.40 Відэапаказ:, 21-23 —16.50, 19.00; 26-27 — 15.30, 17.40

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* – Адзінаццаць дзён, адзінаццаць начэй, 21-25 — 16.00, 19.20; 26-27 — 14.00, 17.20, 20.40 Малыш-каратэ (баявік), 21-25 — 17.40, 21.00; 26-27 — 15.40, 19.00 Начны танцавальны рух, 25-26 — з 21.00 па 6.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* – Блакітная кітаянка ("Злачынства з-за жарсьці"), 21-27 — 16.30, 18.30 Малыш-каратэ, 21-22, 25-26 — 15.00, 20.30; 23-24, 27 — 20.30 Чалавек і закон (кіналектар), 24 — 15.00 Для дзяцей: Сёгун Мазда ("Самурай-целаахоўнік"), 23 — 14.30 Новыя прыгоды капітана Ўрунгеля, 27 — 14.30

СЬЦЯГ *(Вялікаморская, 3, тэл. 211-009)* – Дух помсты, 21-22, 25 — 16.20; 26-27 — 12.20, 16.20 Падстаўная асоба, 21-22, 25 — 18.00, 20.00; 26-27 — 14.00, 18.00, 20.00 Для дзяцей: Вялікія прыгоды Зора, 26 — 10.50 Стрэлы Робін Гуда, 27 — 11.00

УДАРНІК *(Жукоўскага, 15б, тэл. 259-630)* – Ізноў патрапіўся, 21-27 — 15.30 Паварот лёсу, 21-27 — 17.10 Гатэль "Пушнак", 21-27 — 18.50 Для дзяцей: Прыгоды Квэнціна Дорварда, стралка каралеўскае гвардыі, 23 — 14.00 Агнявушка-паскакушка (мультфільмы), 26-27 — 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ *(пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297)* – Дасканалыя бандыты, ці Лясныя браты, 21-27 — 11.00, 14.20, 17.40, 21.05 Дэтэктыў КІД, 21-27 — 12.40, 16.40, 19.25

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* – Шукаецца герой, 21-27 — 12.50, 16.00, 17.40 Памерці за... 21-27 — 14.30, 19.30 І.. як Ікар, 21-27 — 21.00
Для дзяцей: Агонь, воды і медзяныя трубы, 26-27 — 11.30
Відэазаля: Пад прыцэлам (Рэжысэр Расэл Малкэхі, у ролях Дольф Лундгрэн, Конрад Дан, Крыстофэр Хэердал). Шпіёнскі трылер, насычаны псыхалягічнымі роздумамі з філязофскім падтэкстам. Ёсьць прафэсіі, дзе не да сантымэнтаў. І калі прафэсійны кілер, які працуе на заканспіраваную ўрадавую ўстанову, не адважваецца націснуць на курок, ці вычарпаўшы свае псыхалягічныя рэзэрвы, ці задачы сталі далёкімі ад маралі... Таму чарговае заданьне па ліквідацыі для героя-супэрмэна і ягонай прываблівай сяброўкі-навічка стала для іх цяжкім выпрабаваньнем... 21-27 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

"Хаў!"

З 14 па 15 кастрычніка ў сядзібе Беларускага Таварыства дружбы з замежнымі краінамі адбыўся першы міжнародны фэст "Indian Spirit" (Індзейскі Дух). Сюды зьехаліся індзеаністы з Расеі, Украіны ды ўсёй Беларусі. Былі і госьці з Амэрыкі -- самі індзейцы. Навахі з рэзэрвацыяў штату Нэвада распавялі пра свае звычаі, рэлігію, аб сваім паўсядзённым жыцьці. Пасьля адбыўся ўрачысты канцэрт, падчас якога індзейскія пляскі зьмяняліся песьнямі ў стылю кантры групы "Sunrise" з Санкт-Пецярбургу.

Уладзімер Шлапак.
Здымкі аўтара.

ВІДЭА

21–27 кастрычніка 1996 г.

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ:

1. "ЭКСПРЭС ДА БЭЙДЖЫНА"

ЗША, 1996, 97 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.0/4.0, Bullett To Beijin; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Джордж Міхалка, у р. Майкл Кэйн, Джэйсан Конэры, Міа Сара. Цудоўны баевічок, які здолеў сабраць някепскую касу ў кінапракаце - цэлых 7 млн.$! Агент Плямэр 30 гадоў прапрацаваў на спэцслужбе яе Вялікасьці, а зарабіў толькі на мізэрную пэнсію. У самы час падасьпела запрашэньне ад прыватнай асобы з Расеі наведаць Санкт-Пецярбург...

2. "ПОЎНАЧ У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ"

ЗША, 1996, 87 хвіл, ++, Midnight In Saint Peterburg; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Даг Джэксан, у р. Майкл Кэйн, Джэйсан Конэры, Майкл Гэмбан. Працяг прыгодаў спадара Плямэра і ягоных сяброў у Расеі. Пасьля пасьпяховага заканчэньня першай апэрацыі Плямэр вырашыў назаўсёды застацца тут. У Маскве зарэгістраваў сваю прыватную дэтэктыўную кантору, але справы паклікалі ў паўночную сталіцу...

3. "ШКОДА"

ЗША, 1996, 98 хвіл, +++, Rough Magic; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў <CP>. Рэж. Кларк Пінлоў, у р. Брыджыт Фонда ("Няма вяртаньня", "Маленькі Буда"), Расэл Кроў, Пол Радрыгес. Цікавая камэдыя з элемэнтамі містыкі. Сірата Майра навучалася чараўніцтву ў вялікага мага, які зрэдку выступаў ў маленькіх утульных рэстарацыях. Аднойчы на такім выступленьні яна пазнаёмілася з уплывовым нежанатым сэнатарам...

4. "ЧАРОЎНАЯ АТРУТА"

1996, 89 хвіл, ++1/2, Pretty Poison; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Дэвід Бартан Морыс, у р. Грант Шоў, Мішэль Філіпс, Уэндзі Бэнсан. Тэлевізійны крымінальны фільм, сутнасьць каторага можна выразіць аднэй фразай: "Чым больш забруджаная навакольная прырода, тым жудасьней становяцца дзеі людзей, якія жывуць побач"...

5. "ТВАР ЗЛА"

1996, 92 хвіл, +++, Evil Has A Face; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Роб Фрэска, у р. Шон Янг, Уільям Мозэс. Паліцэйскі дэтэктыў-трылер у стылі шырока вядомага фільма "Малявальшчык". Галоўная гераіня — мастак, што працуе ў паліцыі і складае са словаў сьведкаў партрэт падсьледных і злачынцаў...

ФІЛЬМ-БЛІЦ /Пра новыя паступленьні адным радком/:

"Страшылы" (The Frighteners; ужасьцік, зборы ў кіно 20 млн.$!. У р. Майкл Дж. Фокс, Джон Осьцін);

"Павук" (Deadly Run; баявік);

"Кляймо заганы" (Vicious Kiss; баявік);

"Мама, можна спаць зь небясьпекай?" (Mother, May I Sleep With Danger; трылер, у р. Айвэн Сэрджы);

"Кошт каханьню" (Anything for Love; мэлядрама, у р. Дэні Айеля, Эн Арчэр);

"Вочы каханьня" (What Love Sees; драма);

"Адрэналін" (Adrenalin; фантастычны баявік, у р. Крыстофэр Лямбэрт);

"Тое, што ты робіш" (That Thing You Do; комедія, рэж. Том Хэнкс, у р. Том Хэнкс, Кэвін Полак);

"Камэра" (The Chamber; трылер, у р. Джын Хэкман, Крыс О' Донэл);

"Супэрмэн, Апошні сын Крыптана" (Superman, The Last Son Of Krypton; паўнамэтражны фільм студыі WB);

"Ілюзія забойства-4" (F/X: The Illusion 4; тэлесэрыял-баявік);

"Матыльда" (Matilda; фантастыка-камэдыя, рэж. Дэні Дэ Віта, у р. Дэні Дэ Віта);

"Дзень Незалежнасьці" (Independence Day; фантастыка. Поўны экран + лязэрная якасьць!);

"Чаму падаюць самалёты" (Why Planes Go Down; дакумэнтальны фільм пра прычыны авіякатастрофаў);

"U2: Achtung Baby" (музычная праграма).

**Фільмы прадастаўленыя студыяй "TON video" т. (017) 233-92-30.

Углядалася ТОНя ВИДЗЕнкАва

ПРЫСАДА ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ"

— Посьпех "Невыканальнага заданьня" прымусіў Тома Круза ізноў зьвярнуцца да шпіёнскай тэмы. Ягоная ўласная кінакампанія SW Productions набыла правы на раман "Чалавек у люстры" (The Man in the Mirror), які напісаў рэпартэр газэты "Вашынгтон Пост" Дэвід Ігнатыюс. Справа ў кнізе ідзе пра журналіста, які, працуючы пад прыкрыцьцем на ЦРУ, расьсьледуе дзейнасьць свайго вядомага калегі, які падазраецца ў шпіянажу на карысьць Кітая. Таксама Круз зацікаўлены праектам фільма "Пяцігадовы плян" (Five Year Plan), у якім распавядаецца пра абрабаваньне яхтаў, а таксама зьбіраецца разам з рэжысэрам Джонам Ву ("Зламаная страла") экранізаваць раман Калеба Кара "Салдат д'ябла" (The Devil Soldier), які апавядае пра амэрыканскага найміта, што ваяваў у 19-м стагодзьдзі ў Кітаі.

— У Вугоршчыне пачаліся здымкі чарговай кінавэрсіі бесьсьмяротнага раману Віктора Гюго "Сабор Парыскай Божай Маці" для амэрыканскага тэлебачаньня. Гатычныя дэкарацыі і лобнае месца пабудаваны ў невялічкай вёсцы Фот у 20 кілямэтрах на поўначы ад Будапэшта. Ставіць карціну вугорац, які зараз жыве ў Лёс-Анжэлесе — Пэтэр Мэдак. На словы рэжысэра, чый бацька арыштоўваўся ў Вугоршчыне сьпярша фашыстамі, а потым камуністамі, і які эміграваў з краіны пасьля падзеяў 1956 году, лейтматывам фільму стане тэма свабоды. У карціне заняты амэрыканскі актор Мэндзі Пацінкін, акторка мэксыканскага паходжаньня Сэльма Хэйек і брытанец Рычард Харыс.

— Рэжысэры-браты Рыдлі і Тоні Скот стануць выканаўчымі прад'юсэрамі 30-хвілінных кінанавэляў студыі Showtime пад агульнай назвай "Голад" (The Hunger). Так, дарэчы, называлася і першая карціна Тоні Скота. Сюжэты і пэрсанажы кароткіх фільмаў жахаў будуць брацца зь літаратурных твораў дадзенага жанру, выдадзеных за апошнія 60 год.

Дзяжурная па прысадзе

Тоня Відзянкова

Тэатры

22-28 кастрычніка

ТЭАТАР САТЫРЫ І ГУМАРУ "ХРЫСТАФОР"

24 чацьвер – Добра сядзім. Эстрадна-сатырычнае прадстаўленьне.
23 серада – Трэцім будзеш? Безалькагольныя гутаркі з гледачом.

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТАР МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

23 серада – М.Стрэльнікаў. Халопка. Апэрэта ў 3-х дзеях.
24 чацьвер – І.Штраўс. Ноч у Вэнэцыі. Карнавал у 3-х дзеях.
25 пятніца – Ф.Лягар. Вясёлая ўдава. Апэрэта ў 3-х дзеях.
26 субота –М.Рымскі-Корсакаў. Шахеразада. Балет у адной дзеі. Музыка народная. Гішпанскі дывэртысмэнт. Балет у адной дзеі.
27 нядзеля, раніца – С.Баневіч. Гісторыя Кая і Герды. Опэра ў 2-х дзеях.
27 нядзеля, вечар – І.Штраўс. Кажан. Апэрэта ў 3-х дзеях.

ДЗЯРЖАЎНЫ РАСЕЙСКІ ТЭАТАР ІМЯ М.ГОРКАГА

25 пятніца – Д.Фо, Ф.Рамэ. Вольны шлюб. У 2-х частках.
24 чацьвер – Ж.-Ф.Рэньяр. Адзіны спадкаемца. Камэдыя ў 2-х частках.
23 серада – М.Ашар. Хто твой каханак, Жаззфа? Камэдыя-дэтэктыў у 2-х частках.
27 нядзеля – С.Віткевіч. Вар'ят і манашка. Кароткая п'еса ў 3-х дзеях.

Для дзяцей

27 нядзеля – А.Восіпаў. Жылі былі дурні. Казка-буф у 2-х частках.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

23 серада, 24 чацьвер – Прэм'ера.. Ф.Дзюрэнмат. Ромул Вялікі. Гістарычна недакладная камэдыя ў 2-х дзеях.
27 нядзеля – Ж.-Б.Мальер. Нежанаты мнагажэнец альбо залёты пана дэ Пурсаньяка. Камэдыя ў 2-х дзеях.
28 панядзелак – А.Астроўскі. Лес. Камэдыя ў 2-х дзеях.
25 пятніца, 26 субота – Я.Купала. Тутэйшыя. Трагікамічныя сцэны ў 2-х частках.

Для дзяцей

27 нядзеля – І.Карнавухава, Л.Браўсевіч. Пунсовая кветачка. Казка ў 2-х дзеях.Малая сцэна

ДЗЕ-Я

22, АЎТОРАК 12.00, 23, СЕРАДА 12.00 "Дзіва-Казка", В.Остраў.
24, ЧАЦЬВЕР 14.00, 25, ПЯТНІЦА 14.00 "Барановы Кароль", У.Ковель. /казка/
26, СУБОТА 19.00, 27, НЯДЗЕЛЯ 19.00 Прэм'ера монаспэктаклю І.Глушакова "Гісторыя хваробы" на творы М.Булгакава.

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛЯ "МЕНСК"

25 кастрычніка – Новая сольная праграма Аляксандра Разэнбаўма. Працягласьць канцэрту – 3 гадзіны. Клявішы, аранжыроўка – Аляксандар Аляксееў.

Інфарматар Наша Ніва
21.10 — 27.10 1996
N29

ЦІ БУДЗЕ КІТАЙ ДРУГОЙ ЯПОНІЯЙ?

Робэрт Новак

"Хто такі гэты Рып Ван Уінкл?" — запытаўся ў мяне Чэн Ліганг — супрацоўнік міністэрства замежных справаў, прыстаўлены суправаджаць мяне на працягу майго васьмідзённага знаходжаньня ў Кітаі. "Гэта пэрсанаж з раньняй амэрыканскай літаратуры, —адказаў я. — Ён заснуў на дваццаць год, а калі прачнуўся, то ўбачыў, што вакол усё памянялася. Гэтаксама адчуваю сябе і я пасьля паўторнага прыезду ў Кітай усяго праз тузін гадоў". "Мне гэта падабаецца", — сказаў Чэн. — Рып Ван Уінкл! Як гэта пішацца?"

Зьнешні выгляд, агульны настрой і аталяючая абстаноўка ў найбольш населенай краіне сьвету абсалютна перамяніліся з часу маёй першай паездкі сюды 18 гадоў таму, ці нават майго апошняга прыезду 13 гадоў таму. Змрочны, шэры, замкнёны Кітай 70-х гадоў і пачатку 80-х саступіў месца мітусьліваму, кідкаму, рознакаляроваму Кітаю 90-х гадоў. Але таксама зьнікла трапяткое імкненьне да дэмакратыі, якое я ўбачыў у 1978 г., калі студэнты, да якіх далучыліся нешматлікія рабочыя, былі гатовыя дзеля яе рызыкаваць усім. Няўмольныя камуністычныя кіраўнікі ды верныя ім войскі Народна-вызвольнай арміі Кітаю паклалі гэтаму канец у 1989 г. на плошчы Цяньаньмэнь.

Кітай усё яшчэ шмат у чым камуністычная краіна, і для журналіста ўсё яшчэ немагчыма проста так на ўласнае жаданьне атрымаць візу на ўезд ды прыехаць. Дзеля гэтага трэба атрымаць запрашэньне (у маім выпадку прымаючым бокам быў аддзел інфармацыі Міністэрства замежных справаў, якое на маю просьбу выслала мне запрашэньне) і па прыбыцьці строга прытрымлівацца запланаванага й зацьверджанага раскладу знаходжаньня. Летась для кароткатэрміновага наведвальніка краіны сустрэцца са звычайнымі кітайцамі ў неафіцыйнай абстаноўцы было не лягчэй як у 1983 г. ці 1978 г.

Больш за тое, я ўбачыў два Кітаі (прычым я не кажу тут пра Тайвань). Адзін — краіна трэцяга сьвету з болей чым 900 млн. сялянаў, беднымі, страшэнна непісьменнымі, у большасьці сваёй адлучанымі ад таго буму, што распачаўся з абвешчаньнем "рынкавага сацыялізму". Другі — гэта краіна памерам зь Японію з 120 млн. людзей, што кіпіць энэргіяй Бар'ернага рыфу. Вось у такім Кітаі я і мая жонка Геральдын правялі восем дзён.

Пэкін, 11-14 ліпеня

Гэты сталічны горад недзе на 7 млн. стаўся большым чымся я бачыў тады ў 1978 г., і ад яго не засталося ніякіх напамінаў пра пыльную, без травы і дрэваў разрослую вёску васямнаццацігадовай даўніны. Калісьці ціхія вуліцы, па якіх кацілі тысячы ціхіх ровараў і нешматлікія чыноўніцкія машыны, цяпер пакутуюць ад пастаянных транспартных затораў. Раварысты таксама ёсьць, але да іх яшчэ дадалася, пераважна для карыстаньня іншаземцамі, незьлічоная колькасьць таксі, якіх у колькасьці перагналі маленькія недарагія аўтамабільчыкі ("аранжавыя кузуркі"), якія раптоўна зьявіліся на вуліцах літаральна некалькі гадоў таму, і выкарыстоўваюцца пераважна звычайнымі кітайцамі.

Зьнiклі аднапольныя сінія мааісцкага стылю касьцюмы, што раней панавалі на вуліцах. Мужчыны носяць футболкі (звычайна з надпісамі на ангельскай мове) ды спартовыя кашулі. Падчас майго наведваньня краіны ў 1978 г. я ня бачыў аніводнай кітайскай жанчыны, якая б насіла сукенку; сёньня жанчыны дэманструюць свае вабноты ў адзеньні заходніх фірмаў. Цяпер рэдка сустрэнеш калісьці ўсюдыпрысутных салдатаў Народна-вызвольнай арміі ў сваёй балотна-зялёнай уніформе.

Таксама пазьнікалі мамантавых памераў каляровыя і звычайна парныя, як тыя браты-блізьняты, карціны з выявамі Маркса ды Энгельса, Леніна ды Сталіна, Мао ды Джао. Але таксама зьнікла й "Сьцяна дэмакратыі", на якой у 1978 г. маладыя кітайцы прымацоўвалі плякаты з надпісамі пра тое, чаго нельга было гаварыць, ды просьбамі пра тое, чаго нельга было прасіць —дэмакратыі

ды свабоды.

Цяпер вуліцы запоўнілі прыватныя харчовыя кіёскі ды розныя крамы. Далягляд зараз аздоблены шматлікімі шыкоўнымі гатэлямі. "Palace", у якім мы спыніліся, вызначаўся найраскошнейшым зьнешнім выглядам, сэрвісам, і асабліва коштамі.

Трохі менш пажаданыя перамены, наколькі я мог заўважаць, адбыліся з чыноўнікамі. На часе майго візыту ў 1978 г. я быў адзіным амэрыканскім журналістам у Кітаі і атрымаў, нават не папрасіўшы пра гэта, магчымасьць дзьвюхгадзіннага інтэрвію з Дэнам Сяапінам. Праз пяць год я ня здолеў сустрэцца з Дэнам, як я таго прасіў, але ўзяў інтэрвію ў вельмі важнага ўрадоўца — першага віцэ-прэм'ера Яо Яліна. Сёньня амэрыканскі журналіст ужо не навіна.

З маіх афіцыйных інтэрвію з функцыянэрамі сярэдняга зьвяна я адчуў несумяшчальнасьць існаваньня кампартыі з эканамічным выбухам. На іронію лёсу гэтая несумяшчальнасьць пачынаецца з палітычнага генія Дэна, чыя аддаласьць ленінскім догмам вяршынства Партыі ніколі не хісталася нават нягледзячы на трохразовыя чысткі і панізжэньні. Пасьля цяньаньмэнскай разьні ён мог бы замацаваць дамінаваньне Партыі праз вяртаньне да артадаксальнага марксізму-ленінізму. Замест гэтага ён абвесьціў курс на "рынкавы сацыялізм", які спалучае палітычную дыктатуру з эканамічнай свабодай, што далі Кітаю самы высокі ў сьвеце рост эканомікі.

Дэн зрабіў невялікую сэмантычную замену: прадпрыемствы і надалей застануцца дзяржаўнымі, але ўжо ня будуць кіравацца дзяржавай. Гэта не зусім прыватызацыя, але такая магчымасьць для падвойнага тлумачэньня дазволіла стварыць новую клясу кітайскіх мэнэджэраў, што паўсталі па-за шэрагамі партыйных кадраў ды адкрыла шлях для сумесных прадпрыемстваў з іншаземцамі, якія найчасцей і прымаюць асноўныя кіраўнічыя рашэньні.

Выглядае, што тыя камуністычныя функцыянэры, у якіх я браў інтэрвію, цалкам апанаваныя гэтым і пазбавіліся стандартных ідэалягічных адказаў, якімі яны карысталіся на працягу ўсіх гадоў іх кар'еры. Яны казалі пра неабходнасьць пераразьмеркаваньня даходаў з тым, каб 900 млн. у дру-

гім Кітаі маглі б пасьпяваць за тымі, што ў першым. Дзеля

гэтага прапануюцца адмысловыя падаткі. Яны казалі пра

неабходнасьць ахалоджаньня перагрэтай эканомікі і здушэньня інфляцыі праз "манэтарную палітыку"; яны прапанавалі падвысіць стаўкі па працэнтах. Іх развагі нагадвалі хутчэй Джона Кэйнса ды Мільтана Фрыдмана, чымся таварыша Мао.

Але гэтыя ж самыя чыноўнікі пачыналі выкручвацца, калі я настойваў, каб яны растлумачылі, як імкненьне да атрыманьня прыбытку сумяшчаецца з вучэньнем Карла Маркса. Нягледзячы на некаторую расплывістасьць партыйнай лініі, падобна на тое, што яны трымаюцца догмы, што Маркс ніколі не памыляўся, хаця ягоныя пасьлядоўнікі маглі і мець памылкі. "Я ня думаю, што ў мінулым мы цалкам зразумелі Маркса", — сказаў намесьнік дырэктара дзяржаўнай камісіі па рэструктурызацыі эканомікі Ванг Шыян. Здаецца, што старшыня Дзяржпляну Вэй Лікуань быў трохі нецярплівы са мною, калі настойваў на тым, што "сыстэма ўсё

яшчэ застаецца марксісцка-ленінскай", дадаўшы, што Кітай знаходзіцца на раньняй стадыі сацыялізму і "дасяг-

неньне камунізму ёсьць нашай доўгатэрміновай мэтай".

Нікога, апроч упартых партыйных кадраў і дапытлівых заходніх рэпартэраў, не хвалююць такія тэарэтычныя пытаньні. Падобна на тое, што будучыня Кітая не зьвязаная ні з камуністычнымі ідэолягамі, ні з падаўленымі дэмакратычнымі дысыдэнтамі. Замест гэтага ўсё будуць вырашаць адукаваныя на Захадзе тэхнакраты, якія самі працуюць у сыстэме і відавочна яе зьмяняюць.

У тэлевізіі CNN выступіла эканаміст Дзяржаўнага камітэту па рэканструкцыі эканомікі доктар Лі Куінгуань. Да трагедыі на Цяньаньмыньскай плошчы ні ў кога нельга было ўзяць інтэрвію для амэрыканскай тэлевізіі. І зараз у краіне, дзе ні урадавыя чыноўнікі, ні шараговыя грамадзяне не адважваюцца шчыраваць, доктар Лі была надзвычай шчырай.

Чаму ў Кітаі столькі карупцыі? Лі назвала "адсутнасьць юрыдычных рамак ды манапольнае становішча многіх арганізацый".

Лі прызнае, што эканамічным рэформам павінны папярэднічаць палітычныя рэформы. Якія палітычныя рэформы? Тут пераважала асьцярожнасьць. Яна выказала "надзею", што да 2000 году сьвет будзе лічыць Кітай дэмакратычнай краінай.

Шанхай, 15-16 ліпеня

Гэты злы пэрл Усходу, збудаваны эўрапейскімі заваёўнікамі, і слынны як месца дзеяньня ў шматлікіх папулярных на Захадзе прыгодніцкіх раманах, расчараваў мяне ў 1983 г. Тады ён падаўся мне аднастайным, шэрым ды бязрадасным, як і

Пэкін таго часу.

Але таго болей няма. Горад з насельніцтвам у 14 млн. чалавек ажыўлены нэонавымі надпісамі, плотным дарожным рухам (дзе прысутнічаюць забароненыя ў Пэкіне матацыклы), перапоўненымі крамамі, прыгожымі кабетамі, лесам хмарачосаў, дарагімі гатэлямі ды рэстарацыямі, дыскатэкамі ды ажыўленым гандлем. Нават бурлівы Пэкін у параўнаньні зь ім выглядае вёскай. Адзін стары, які прыехаў сюды яшчэ да японскай акупацыі ў 1938 г., сказаў мне, што сёньняшні Шанхай нагадвае яму той, які быў паўстагоддзя таму — "добры й дрэнны". Добры сваім гандлем, вытанчанасьцю ды жыцьцядзейнасьцю. Дрэнны карупцыяй, распустай, выраджэньнем.

Калі я знаходзіўся ў Шанхаі Партыя заклікала сваіх членаў "мацаваць партыйны дух ды змагацца з карупцыяй". Гэта як раз тое, чым яны не займаюцца. Карупцыя публічна з гонарам выстаўляе сябе праз з выклікам элегантна апранутых маладых кітайцаў, што сядзяць за рулём новенькіх Mercedes'аў ды BMW. Мне сказалі, што яны зусім не прадпрымальнікі, а нашчадкі слынных камуністычных апаратчыкаў, якія набіваюць свае кішэні і не хаваюць свайго багацьця. Дзяржаўныя прадпрыемствы маюць сваімі партнэрамі па сумесных прадпрыемствах амэрыканскія канцэрны, якія прыносяць добрыя грошы, што дае дзяржчыноўнікам някепска жыць. Адзін інтэлектуал-некамуніст выказаў мне сваю заклапочанасьць тым, што Партыя захоўвае абсалютную ўладу, але страчвае этычныя стандарты. Аднак, выглядае, што мільёны тых, хто жыве ў Шанхаі гэта ня надта хвалюе. У іх занадта шмат справаў.

Шэньджэнь, 17-18 ліпеня

У 1978 г. я прыехаў у камуністычны Кітай цягніком з Ганконгу і рабіў перасадку да Кантону на станцыі Шэньджэнь. Тады гэта было невялікае рыбалавецкае мястэчка зь менш як 20-тысячным насельніцтвам, і вялікага ўражаньня яно на мяне не зрабіла.

Зараз Шэньджэнь — вялікі горад з трохмільённым насельніцтвам, з хмарачосамі ды шыкоўнымі гатэлямі. Горад знаходзіцца ў абмежаванай для большасьці кітайцаў свабоднай эканамічнай зоне і ўяўляе зь сябе пастаянную будоўлю, дзе рабочыя працуюць нават у выходныя, калі астатні бізнэс адпачывае. Як і ў Шанхаі, у Шэньджэні ёсьць свая фондавая біржа.

Марксісцка-ленінскія догмы тут выглядаюць яшчэ больш забытымі, чым у Пэкіне. Мой 42-гадовы спадарожнік зь Міністэрства замежных справаў містэр Чэн зьдзівіў сваю 24-гадовую каляжанку з Шэньджэню місіс Чын тым, што ў Пэкіне ён і ягоныя калегі ўсё яшчэ час ад часу зьвяртаюцца адзін да аднаго як "таварыш". Яна засьмяялася ды перапытала: "Няўжо гэта праўда?"

Адзін муніцыпальны чыноўнік пахваліўся мне, што людзі тут складаюць элітную групу, якія хутка асвоілі камэрцыю ў адрозьненьне ад заторканых сялянаў у асноўнай частцы Кітаю. Але Шэньджэнь ёсьць прыкладам таго, як кітайская эканоміка падаграецца замежнымі інвэстыцыямі — асабліва ад кітайцаў, што жывуць за межамі. У замежных інвэстыцыях дамінуе Ганконг, на другім месцы ідзе Тайвань, ЗША займаюць няшчаснае трэцяе месца, толькі абышоўшы Японію.

Калі ў Шанхай вярнуліся старыя заганы, то Шэньджэнь набыў новыя "радасьці" памежнага гораду: прастытуцыю, злачыннасьць, наркаманію. Вядома ж, ён па-старому зьяўляецца часткай паліцэйскай дзяржавы, але на гэта не выглядае.

Ганконг, 19 ліпеня

На працягу 70-х гадоў Ганконг здаваўся выспай цывілізацыі, поўнай лішку ды камфорту. Кантраст з камуністычным Кітаем быў відавочны. Але цяпер зьнешніх адрозьненьняў ня шмат. Ідэя зьліць гэты аазіс капіталізму з камуністычным маналітам не выглядае нагэтулькі жудаснай. Дэн Сяапін заключыў зьдзелку з кітайскімі рэфарматарамі: дазвольце нам мець аднапартыйны ўрад, а мы дазволім вам кіраваць эканомікай. Праблема такога гандлю заключаецца ў тым, што пры адсутнасьці якой-небудзь палітычнай апазыцыі кіруючую кампартыю разьядае карупцыя.

Тым не менш камуністычны Кітай і Ганконг патрэбны адзін аднаму, і за тыя 50 гадоў пасьля далучэньня Ганконгу да КНР у 1997 г., падчас якіх Ганконг будзе захоўваць адмысловы статус у межах КНР, хутчэй за ўсё, што сам Кітай пачне выглядаць як Ганконг, а не наадварот. Нават калі і існуюць сумневы наконт таго, ці ёсьць сапраўдная зацікаўленасьць у дэмакратыі з абодвух бакоў, можна спадзявацца, што дэмакратызацыя ўрэшце рэшт будзе мець месца па меры таго, як эканамічнае ажыўленьне закране і 900 млн. кітайскіх сялянаў. У канчатковым выніку гэта азначала б канчатковае ўзьяднаньне Кітаю —кантынэнтальнай часткі, Ганконгу і Тайваню — дэмакратычнага, мірнага і капіталістычнага.

E&N Political Report

Падрыхтаваў
Уладзімер Бараніч

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Купала Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Т.2. Вершы, пераклады 1908-10. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 342 с., іл. 6000 ас. ISBN 5-340-01335-9

Савік Л. Космас беларуса: жыцьцяпіс Барыса Кіта, асьветніка, вучонага, патрыёта. — Менск: Пейто, 1996. — 384 с.: іл.

Шамякін І. Крыніцы: Раман. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 351 с. 6000 ас. ISBN 985-02-0331-5

Аналёгіі на палях новай кнігі

Міхнюк Уладзімер. Арыштаваць у высылцы: дакумэнтальны нарыс пра Алеся Дудара. — Менск: БелНДІДАС, 1996. — 150 с. Наклад 200 ас.

Гэтая кніга мяне прыемна зьдзівіла. Ня зьместам, а сваім зьяўленьнем — прыватнаю ініцыятывай, якасьцю друку, энцыкляпэдычнымі камэнтарамі. А зьмест выклікаў безьліч аналёгіяў. З кнігі, якая пабудаваная на матэрыялах гэпэушных справаў Алеся Дудара (паэта арыштоўвалі тры разы), можна даведацца пра малавядомыя падрабязнасьці літаратурнага жыцьця 20-х гадоў. Аднак агульнае маё ўяўленьне і пра паэта, і пра літаратурную сытуацыю таго часу істотна не зьмянілася. Адзінае, што я крыху іншымі вачыма паглядзеў на "Маладняк". Увогуле, 20-я гады — цікавая старонка гісторыі беларускай літаратуры. І самая драматычная.

Як вядома, першы раз Алесь Дудар быў арыштаваны за верш "Пасеклі наш край папалам" у сакавіку 1929 году. Старшыня ГПУ Беларусі Р.Піляр у дакладной запісцы на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б Я.Гамарніка пісаў наступнае:

"Недели две-три назад ГПУ Бел. получило сведения, что в интеллигентных кругах Минска, главным образам среди писателей, "ходит по рукам" какое-то антисоветское стихотворение. Наша агентура, согласно данного ей задания, спустя несколько дней доставила экземпляр интересующих нас стихов, которые при сем прилагаем (Приложение N1). Считая написание подобного стихотворения и его распространение актом контрреволюционным, ГПУ занялось выяснением автора произведения и круга его распространения. Нами было установлено, что стихи написаны поэтом Дударем".

Сам Дудар у паказаньнях да справы "Саюзу вызваленьня Беларусі" так патлумачыў матывы напісаньня свайго крамольнага верша: "Калі ішоў працэс Грамады ў Заходняй Беларусі, сярод беларускіх нацыянал-дэмакратаў адчуваўся пэўны ўздым. Даходзіла да таго, што нават Ластоўскі, які, як мне даводзілася чуць, знаходзіцца ў асабістай сварцы з Луцкевічам, сядзеўшым тады на лаве падсудных, апублікаваў у друку нейкую заяву, дзе адмаўляў гэту варожасьць. Александровіч нават назваў свайго сына Радаславам у чэсьць Астроўскага, што ён ня раз падкрэсьліваў. Пісаліся палкія вершы, прымаліся рэзалюцыі і г.д. Уздым гэты тлумачыцца тым, што ў Грамадзе беларускія нацыянал-дэмакраты бачылі ня толькі рэвалюцыйную, але і нацыянальную арганізацыю... (...) Калі быў абвешчаны прысуд, уздым дасягнуў свайго апагею. У Менску ў той дзень адбывалася вялікая дэманстрацыя пратэсту. І вось тады нехта пусьціў чутку, быццам бы з Масквы прыйшла тэлеграма аб тым, каб не дапускаліся асаблівыя дэманстрацыі. У той час вяліся перамовы з Польшчай аб заключэньні гандлёвага дагавору, і Масква быццам бы баялася, каб залішнія дэманстрацыі не пашкодзілі справе. (...) ... Раніцою Андрэй Александровіч прынёс у рэдакцыю ("Савецкай Беларусі", якая на той час была беларускамоўнай. — А.А.) "контррэвалюцыйны" верш пад назваю, наколькі помню, "Тэлеграма". Верш гэты ён пакінуў у рэдакцыі, а Камлюк (супрацоўнік "СБ" — А.А.), якому даручана было часова сакратарства ў рэдакцыі, пераслаў гэты верш у аддзел друку. Адтуль, паводле чутак, верш трапіў у ГПУ; і ГПУ стала шукаць аўтара. Вакол Андрэя Александровіча ў вачах тых, хто ведаў пра гэту справу, пачаў ствараціа некаторы арэол, тым больш, што ніхто не лічыў гэтага верша контррэвалюцыйным. Вось пад уплывам гэтага напісаў і я свой верш".

Пасьля першага арышту Алесь Дудар быў высланы "из пределов БССР как социально опасный элемент" у Смаленск.

Другі раз Алеся Дудара арыштавалі ў ліпені 1930 года. Паэт быў этапаваны ў Менск з ссылкі. Цяпер яму "шылася" справа "Саюза вызваленьня Беларусі". Менавіта падчас другога арышту Дудар напісаў разгорнутае гэпэушнае пакаяньне, якое цалкам надрукавана ў кнізе. Гэтыя нататкі раскаянага нацыянал-дэмакрата — каштоўны дакумэнт свайго часу (і мастацкі твор, бо напісаны майстрам слова). Праўда, у Дударава была магчымасьць пісаць іншыя творы і ў іншым месцы. Пасьля гучнай справы зь дзёрзкім вершам у эміграцыйным друку было шмат шуму на гэты конт. Дудар нават атрымаў прапанову (і парады) зьехаць у Літву. Аднак пралетарскі паэт вырашаў стаць на сьцяжыну ідэалягічнага выпраўленьня. Актыўнае выкрыцьцё нацдэмаўшчыны дазволіла Дудару пажыць на волі зь ліпеня 1931-га да 31 кастрычніка 1936 году (калі яго арыштавалі трэці раз) і напісаць свае самыя пралетарскія творы. Але паэту з "падмочанай" рэпутацыяй ужо нічога не дапамагло. Жыцьцёвы і творчы шлях Алеся Дудара завяршыўся расстрэлам 29 кастрычніка 1937 году ў ваколіцах Менску разам зь яшчэ сямю беларускімі пісьменьнікамі.

У справе Алеся Дудара знаходзяцца некалькі крамольных вершаў. Усе яны "сопровожаются" расейскімі перакладамі — сьледчыя ня ведалі беларускай мовы. А гэпэушная споведзь паэта надрукаваная на казённай расейскай машынцы па-беларуску бязь "і" і "ў". (Сьледчы КГБ Сакольчык, які вёў справу Славаміра Адамовіча, паказаньні паэта запісваў па-расейску ва ўласным перакладзе, гэткім чынам, парушаючы правілы вядзеньня сьледзтва).

Аналёгіі, чытаючы кнігу, можна працягваць.

Сярод крамольных вершаў са справы Дудара ёсьць верш "Я радзіўся за хатай пад плотам...", які сканчаецца наступнымі радкамі:

Беларус я — радзіўся пад плотам,
Дзе з крапіваю шэпчацца вецер.
Родны край мой — лясы і балоты
Даражэй мне за ўсё на сьвеце.

Гэта таксама лічылася крыміналам.

Алесь Аркуш

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:

1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 40.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыхаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 488 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаворкія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

навінка

Фрагмэнт сьвятла

Выйшаў першы нумар новага квартальніка, поўная назва якога "ФРАГМЭНТЫ філязофіі, культуралёгіі, літаратуры. Сярэднеэўрапейскі культурны агляд". Выдавец часопіса — "Эўрафорум", галоўны рэдактар —Ігар Бабкоў.

"ФРАГМЭНТЫ" — першы беларускі квартальнік, прысьвечаны мысьленьню ў самых розных "рэалізацыях", школах, практыках". Тут — незалежная беларуская думка, найноўшыя пераклады, клясычны беларускі правапіс.

Восеньскі распродаж

З *45.000* да *35.000* (плюс 5000 руб. на паштовыя выдаткі) зьніжаныя кошты на апошнія 100 асобнікаў кніжкі Адама Глёбуса **"Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы"**. Гэта першая кніжка з сэрыі *"Сучасная літаратура"*, і яна цікавая менавіта сучаснаму чалавеку.

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна пабачыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Унівэрсытэту).

МАЛАДЭЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале).Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Паліткніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" і "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

Касэты — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй, там, налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі "Нашай Нівы" вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні: №1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць сабе ксэракопію любога нумару.

Зьвяртайцеся на адрас:

Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч,
Менск 220094, а/с 89.

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезены шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не пакідаў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон **239-78-49.**

Даеце крылы і адразу падразаеце



Гэты тэст прызначаны для жанчын. Вам бо ня ўсё адно, ці разумееецеся вы зь дзіцём. У нейкай меры гэта можна высьветліць, адказаўшы на нашыя пытаньні-сьцьверджаньні.

1. Калі ў дзяцей зьявіліся праблемы ці яны закахаліся, як Вы пра гэта даведаліся? а) яны самі мне пра гэта сказалі; б) яны паведамілі пра гэта бацьку ці іншаму блізкаму чалавеку; в) я — маці, і я гэта адчула; г) даведалася пра гэта выпадкова.

2. Сябры ці сяброўкі вашага дзіцяці ставяцца да Вас: а) як да другой маці; б) насьцярожана і замыкаюць ці пераводзяць размову на іншыя тэмы, калі я ўваходжу; в) з павагай, але халодна; г) з павагай і любоўю.

3. Ці запрашалі Вас дзеці хаця б аднойчы туды, дзе яны зазвычай зьбіраюцца зь сябрамі? а) зрэдку "выводзяць" мяне ў кіно; б) не, бо не жадаюць нідзе быць са мной; в) запрашалі, але я не пагадзілася; г) тыя месцы, дзе яны звычайна зьбіраюцца, не падабаюцца мне.

4. Многія бацькі скардзяцца, што іхныя пасталелыя дзеці часта бяруць у іх рэчы, каб панасіць. У Вашым выпадку: а) гэтага не адбываецца, рэчы ім не падыходзяць; б) гэтага не адбываецца, бо для іх яны ўжо выйшлі з моды; в) мне ўвесь час даводзіцца шукаць свае рэчы ў іхняй шафе; г) не дазваляю гэтага рабіць, лічу, што кожны павінен насіць свае рэчы.

5. Вы даведаліся, што Вашыя дзеці зацікавіліся адной з тэлеперадачаў. У гэтым выпадку: а) я пытаю іх, ці падабаецца ім праграма; б) мне нецікава тое, што яны глядзяць; в) спадзяюся, што яны мне што-небудзь распавядуць пра гэтую праграму; г) некаторы час гляджу перадачу, а потым абмяркоўваю зь дзецьмі.

6. Колькі разоў з таго часу, як нарадзіліся Вашыя дзеці, Вы казалі: "У мой час было ня так": а) адзін ці два разы, але я разумею, што ўсё мяняецца; б) столькі разоў, што не памятаю; в) няшмат, бо паўтарэньнямі я нічога не дамагуся; г) я ім гэтага не казала, але размаўляла пра гэта са сваімі знаёмымі.

Падсумуем вынікі.

Ад 4 да 6 адказаў (варыянт "а"). Без усялякага сумненьня, Вы —маці-сяброўка для сваіх дзяцей. Вы хутчэй належыце да тых людзей, якія лічаць, што любоў і павага цудоўна дапаўняюць адно аднаго.

3 адказы ці меней (варыянт "а"). Неабходна ўстанавіць больш шчыльныя адносіны са сваімі дзецьмі. Паспрабуйце болей даведацца пра іхныя цікавасьці, сяброў.

Ад 4 да 6 адказаў (варыянт "б"). Увага! Вы не знаходзіце ўзаемапаразуменьня. Не дазваляйце ўзроставаму бар'еру ўставаць паміж вамі.

Калі вашыя адказы супалі з варыянтамі "в" і "г", — гэта вельмі небясьпечна. Верагодна, Вы "даеце дзецям крылы і адразу іх падразаеце". Гэта нараджае ў іх няўпэўненасьць.

АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАНЬНІ ЧЫТАЧА

Новая рубрыка

Атрушкевіч Алег, сталы падпісчык "Нашай нівы":

Якая працягласьць Лёнданскага мэтро і колькі станцыяў налічвае?

Паважаны Алег, самай разьвітай сеткай валодае мэтро Нью-Ёрку (першая сэкцыя была адчыненая 27 кастрычніка 1904 г.), працягласьць каторай складае 372,93 км. У 1988 г. яно абслугоўвала 1,073 млрд. пасажыраў. Адлегласьці паміж ягонымі 466 станцыямі меншыя, чым адлегласьці паміж станцыямі лёнданскага мэтро.

Самым ажыўленым у сьвеце зьяўляецца маскоўскае мэтро — 3,3 млрд. пасажыраў на год. Яно мае 141 станцыю, даўжыня шляхоў складае 226,7 км. У 1990 г. Маскоўскім мэтрапалітэнам у сярэднім за суткі карысталася 9 млн. чалавек. Найбольшыя пасажырскія перавозкі прыпадаюць на апошнія дні сакавіка, у пэрыяд школьных вакацыяў і дасягаюць 10 млн. чалавек.

Сярод самых доўгіх транспартных тунэляў сьвету знаходзіцца Лёнданскі мэтрапалітэн (Лёндан, станцыі Іст-Фінчлі-Мордэн). Даўжыня Паўночнага радыюсу (чыгуначнага) складае 27,84 км. Мэтрапалітэн быў адчынены ў 1939 г.

У наступным нумары мы паведамім Вам, колькі станцыяў налічвае лёнданскае мэтро.

Качан Сяргей, прадпрымальнік, Горадня.

Скажыце, калі ласка, што рабіць калі Вы атрымалі выканаўчы ліст?

Такім чынам, па Вашай справе вынесена рашэньне, і на Вашу карысьць з адказчыка спатрабуецца пэўная сума. Што адбываецца далей?

Абавязкі судовага выканаўцы

Грамадзянская канцылярыя таго суда, дзе разглядалася справа, выдае вам выканаўчы ліст, дзе ўказаныя: суд, які вынес рашэньне; справа, па якой выдадзены выканаўчы ліст; дата вынясеньня рашэньня; сума, якую Вам павінны выплаціць; даты ўступленьня рашэньня ў законную сілу і выдачы выканаўчага ліста; найменьне і адрэсы зыскоўца і адказчыка.

Выканаўчы ліст выдаецца Вам на рукі ці, па Вашай просьбе, накіроўваецца для выкананьня судом, які вынес рашэньне, у суд на месцы знаходжаньня адказчыка. Калі Вашая справа першапачаткова разглядалася ў судзе на месцы знаходжаньня адказчыка, то выканаўчы ліст напросту пяройдзе з аднаго пакоя суда ў іншы.

Выкананьнем (спагнаньнем грошай па выканаўчым лісьце) будзе займацца судовы выканаўца.

Калі выкананьне рашэньня спосабам, указаным у выканаўчым лісьце, аказваецца немагчымым, выканаўца можа прапанаваць суду зьмяніць спосаб і парадак выкананьня рашэньня.

Гэтае ж права маеце і Вы. Пытаньне вырашаецца на судовым паседжаньні і афармляецца вызначэньнем суда, якое таксама можна абскардзіць.

Паводле агульнага правіла, судовы выканаўца заўсёды пачынае з таго, што пасылае вінаватаму прапанову выканаць рашэньне добраахвотна напрацягу пяці дзён. У выпадку неабходнасьці адначасова з уручэньнем прапановы судовы выканаўца можа накласьці арышт на маёмасьць вінаватага.

Добраахвотнае выкананьне — гэта самы ўдалы варыянт як для Вас, так і для судовага выканаўцы. Калі гэтага не адбудзецца, то судовы выканаўца будзе вымушаны пераходзіць да ажыцьцяўленьня асноўнай часткі сваіх абавязкаў — прымусоваму выкананьню рашэньня суда. Для таго, каб спагнаць грошы па выканаўчым лісьце, судовы выканаўца мае права:

1. Зьвярнуць спагнаньне на грашовыя сродкі і маёмасьць даўжніка, што знаходзяцца ў іншых асобаў (у тым ліку, на рахунку вінаватага у банках).

Гэта самае распаўсюджанае дзеяньне судовага выканаўцы. Яно патрабуе ад яго мінімум турботаў: накіраваць у пэўны банк выканаўчы ліст з патрабаваньнем зьняць пэўную суму з пэўнага рахунку і чакаць адказу.

Банк прысылае адпіску пра тое, што на гэтым рахунку грошай няма, і вяртае выканаўчы ліст. Судовы выканаўца, у сваю чаргу, вяртае выканаўчы ліст укладчыку з актам, дзе ўказана, што грошай няма.

Разам з гэтым выканаўца можа, як ужо адзначалася, зьвярнуцца ў суд з просьбай зьмяніць спосаб выкананьня, бо апроч зьняцьця грошай з рахунку вінаватага судовы выканаўца валодае і іншымі магчымасьцямі прымусовага выкананьня судовага рашэньня.

2. Зьвярнуць спагнаньне на маёмасьць вінаватага — гэта значыць накласьці арышт на маёмасьць, а потым прадаць яе.

Праўда, арышт маёмасьці і арганізацыя гандлю патрабуе ад судовага выканаўцы пэўнай затраты сіл і часу.

3. Зьвярнуць спагнаньне на разнастайныя віды прыбытку вінаватага.

4. Забраць у вінаватага і перадаць зыскоўцу пэўныя прадметы, што ўказаныя ў рашэньні суда.

5. Ужыць іншыя меры, указаныя ў рашэньні.

Мода

СЬВЕЖЫЯ НАВІНЫ ДЛЯ АДЗЕНЬНЯ

Матэрыялам для гэтай камізэлькі ды сукенкі паслужылі самыя сьвежыя навіны некаторых вядучых агульнабрытанскіх газэтаў. Строй прынёс добрыя навіны ейнаму дызайнэру Грэхему Томасу, які падчас тыдню моды, што нядаўна праводзіўся ў Лёндане, заваяваў тытул "Другасыравіннага Дызайнэра Году".

"Mulberry" — 25 гадоў найлепшага брытанскага стылю

Кампанія "Mulberry", якая спэцыялізуецца на разнастайных скураных вырабах і модным адзеньні, ўсім сьвеце заслужыла рэпутацыю вытворцы непаўторных, высокаякасных тавараў.

Стваральнік "Mulberry" Роджэр Саўл пачаў распрацоўваць скураныя дзяжкі 25 гадоў таму на кухонным стале сваёй лёнданскай кватэры. Сёньня "Mulberry" з аб'ёмам продажаў па ўсім сьвеце ў 81 млн. фунт стэрлінгаў сталася брытанскай легендай посьпеху.

Фірма налічвае болей за 50 крамаў у Эўропе, ЗША, Скандынавіі і на Далёкім Усходзе, якія прадаюць тавары ў выразна брытанскім стылі. Асартымэнт уключае ў сябе адзеньне для мужчын і жанчын, калекцыю для сям'і і выхадаў, вытанчаную скургалянтэрэю і абутак.

Новая форма для паліцыі

Тыя, хто прыедзе ў паўночна-заходнюю Англію неўзабаве здолеюць першымі пабачыць, што знаёмыя плашч і шлем брытанскага палісмэна саступілі месца больш практычным куртцы і нагавіцам новага дызайну.

Новае адзеньне заменіць традыцыйную ўніформу, што існавала яшчэ з 1863 г. Яно было распрацаванае пасьля месяцу кансультацыяў з паліцыянтамі, якія й будуць яго насіць. Першыя распрацоўкі на працягу шасьці месяцаў выпрабоўвалі блізу 60 палісмэнаў.

Наваўвядзеньне ёсьць адрознай рысай мадэрнізацыі адзеньня й абсталяваньня брытанскай паліцыі ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі сучаснасьці. Куртка вырабляецца зь лёгкай воданепранікальнай, "дыхаючай" тканіны, а нагавіцы і кашуля, нягледзячы на традыцыйны выгляд, цяпер зробленыя з поліэстэрава-ваўнянай тканіны. Будуць замененыя

шлемы і жаночыя капелюшы. Куртка будзе таксама разьлічаная на нашэньне схаванай куленепрабівальнай падкладкі.

Па матэрыялах

LONDAN PRESS SERVICE

пераклаў У.Бараніч

Натальля Бабіна

Лепш кланяцца сваёй дупе...

••• чымся чужой галаве. Гэта добрая заказанская прымаўка. Са слова «Заказанка» пачынаецца кожная думка.

Калі ты жывеш на мяжы, гэта пакідае пэўны адбітак: твая прастора сягае адно на ўсход. На захад, «за паласу», вольна лётаюць толькі шулякі, што б'юць курэй у заказанскім лесе. Мой дзед Рыгор, маючы пад восемдзесят, паспрабаваў праз тую «паласу» перайсьці. Пэўна, так закарцела яму глянуць на сваю зямлю ля Буга, на лес, на вербы, якія садзіў, што не стрываў стары... Натуральна, памежнікі яго перахапілі... Дзядзька Валодзя, калі дызэль «Берасьце — Уладава» падыходзіў да мяжы блізка-блізка, засёды ўставаў на дыбачкі і цягнуў шыю, каб хоць на імгненьне пабачыць той кавалачак маладосьці...

Не адразу я зразумела сутнасьць таго, праз што пасьля вайны прайшлі жыхары Заказанкі, Прылукаў, Кастамалотаў —соцень надбужанскіх вёсак. Чаму раней Заказань стаяла ў іншым месцы? Чаму і як сям'я бацькі апынулася ў сухім стэпу пад Адэсай? Чаму і хто разбурыў хату матчынай сям'і? Адказы на гэтыя пытаньні бянтэжылі яшчэ да таго, як пачула назоў: «Апэрацыя «Вісла»...

... Бульба на гэтым полі цёмная ад мулістай зямлі, што стагодзьдзямі наносіў сюды Буг, і бабуліны рукі спрытна кідаюць яе ў кошык: «Нас з Гантоном та малэю прыняв до сэбэ Броварнык, а батька мого з матэрію выправылы гэть за Брэст, в Будякы. А Наталка, сэстра, жыла тогды в Костомолотах — замужом там була. Аж то прыносыть хтось лыста од йійі: так і так, зара мы в Ольштынському воєводстві...» Я на хвілінку распростваюся, абапіраюся на матычку. За калючым дротам, над Бугам, над жоўтымі густымі купамі дрэў, кружляюць шулякі...

У пэўны дзень ты праводзіш шулякаў зайздросным вачыма... Потым ты пачынаеш цягнуцца на дыбачках, калі дызэль «Берасьце —Уладава» падыходзіць да мяжы блізка-блізка... Твой позірк набывае адчужанасьць і беспрытульнасьць, па якіх неўзабаве ты навучысься адрозьніваць такіх, як і ты, надбужанаў, што ніколі ня бачылі Буга...

Неяк уначы, у дзьве гадзіны, наша машына выбіраецца зь лесу на шашу, і вось мы ўжо на памежным пераходзе. Тут, у чарзе з 150 — 170 машынаў мы прастаім да дванаццаці гадзінаў дня, і гэтае стаяньне, быццам наўмысна арганізаванае, каб прапускаць без чаргі тых, хто плаціць, страшэнны бруд на дарозе ды фэкаліі на адкосах ледзь не выводзяць нас зь сябе, але бацька трапна і дарэчы цытуе Коласа: «Ото ж паны! О Божа мілы! Якія гладкія ў іх рылы!», «І як ня кляў я гэту п'яўку, а мусіў даць рубель за справку».

На мытні пры нас у машыне з расейскім нумарам знаходзяць дэтанатар — яшчэ паўгадзіны затрымкі. На польскім баку мы амаль адразу становімся сьведкамі страшнай аўтакатастрофы...

* * *

Зацятыя пошукі згубленага раю часьцей за ўсё ператвараюць жыцьцё чалавека ў суцэльнае пекла... Вось Буг мільгануў зьлева, вось праехалі Жукі — бабуля працавала тут у арандатара на агурках,— вось заблішчалі падазрона вочы бацькі, вось шуляк крылом ледзьве не крануўся ветравога шкла...

Зьдзіўляе мяне бацькава памяць: пакуль павольна, на першай хуткасьці, едзем уздоўж Буга, ён успамінае — і наваколны сьвет паўстае адбітым у вачах шасьцігадовага хлопчыка, і сьлёзы навяртаюцца ўжо на мае вочы...

У высылку кастамалотцаў везьлі па чыгунцы, у вагоне; назад, з дазволу Хрушчова, вярталіся сваім ходам — месяц і шэсьць дзён побач зь непадкаваным канём цягнула падводу карова...

* * *

Ведаеце, як пахне ў Кастамалотах час? Воскам, мокрым дрэвам, пылам. Такі пах ва ўніяцкай царкве Сьв. Мыкіты. Ёй 400 гадоў. Тут дзед быў старастам. Тут хрысьцілі бацьку. Гэтай царкве бабуля засталася верная да скону. Ніколі і нідзе не хадзіла яна ў праваслаўныя храмы, і хаваць наказала сябе без папа...

Тут Сьв. Мыкіта — на абразе ў яго знаёмыя, трохі адчужаныя вочы — і з пачуцьцём, якое нельга перадаць, я ўсьлед за айцом Раманам чытаю царкоўную вязь: 365 гадоў таму, дзеля шанаваньня Божага, абраз падаравала гэтай царкве Тэадора з сынам зь сяла Прылукі...

Брат Андрэй — прыхаджанін прыходу Маці Божай Нястомнае Дапамогі менскай уніяцкай царквы. Ён ведае, што, ўвайшоўшы ў царкву, уніят цалуе абраз. У маленечкай царкве яго постаць здаецца надта моцнай і вялікай, а бацька на імгненьне апускае галаву, з узьбітымі, бы ветрам, не такімі ўжо і густымі валасамі. Царкоўныя кнігі пахнуць таксама, як пахне час.

* * *

Трэба вяртацца. Мяккае сьвятло дня патроху згасае.

Богу дзякаваць, па гэты бок Буга няма дачнікаў. Тут мы не пабачылі сьмецьця. На палях ня высеклі дрэваў «у мэтах павелічэньня плошчы», і не зжылі са сьвету хутарцы...

Але ж і памяць у бацькі! Вось так стаяла хата, вось так —клуня. Вось тут была РЭМІЗА, дзе моладзь ладзіла спэктаклі ды канцэрты. Вось тут у садзе расьлі парэчкі, а на гэтым во месцы маленькі Васілько зарабіў ад бацькі дубца за тое, што бег за канём на поле, не хацеў вяртацца дадому... Паўвека помніцца ўсё.

Трэба вяртацца. Чарга з польскага боку рухаецца ў пяць разоў хутчэй, чымся з савецкага — то бок, беларускага. Узрушаны, бацька гаворыць і гаворыць...

Пастка не спрацавала, — думаю я.— І не спрацуе ніколі. Недзе за мной або нада мной — 400 гадоў уніі, і душа бабулі, пахаванай без папа. Гэта — як апора, як лекі супраць атруты. Такая ці іншая, нашая высылка яшчэ наперадзе. І высылка, і голад дзяцей, і разьбітыя работай рукі — усё паўторыцца, і чым горшая або лепшая я за бабулю?

Мая прастора прасягаецца не адно на ўсход, і пункт апоры ёсьць. Дык што мне за справа да прэзыдэнта расейскіх шавіністаў ды беларускіх легкаверкаў? Я такая, як ёсьць — і мы такія, як ёсьць, і раней ці пазьней, а кожны з нас усьведаміе, што лепш пакланіцца сваёй дупе, чымся чужой галаве, няхай і сто разоў братняй, і ісконна-рускай.

Я шчыльней агортваю цэлафанам буклет пра кастамалоцкую царкву — няхай пах часу захаваецца на ім як мага даўжэй.

Ганна Матусэвіч

Дзёньнік без канца

11-12.10. З галадухі занесла расейскамоўнага ваеннага Шамякіна на продаж. Адразу сказалі, што не бяруць. Занесла перакладзеныя па-расейску замежныя дэтэктывы ды «Серце Бонивура». «А ніхто дурную ня сватае»! І гэта для Беларусі добры знак. Сватаюць цяпер, як і ва ўсе часы, маладосьць ды хараство. Тое, што забараняюць, асабліва салодкае. Ах, які малайчынка наш самаробны прэзыдэнт! Вось паглядзіце, ён зробіць тое, чаго й Пазьняку ня сьнілася!

12-13.10. Падрастае мой Віталік і становіцца занадта пераборлівым. Выцягнуў з закутка на белы сьвет куртку. Вырашыў, што яна яму О.К. Толькі забракаваў... «бабскую нашыўку». Вось сяджу цяпер поначы, як тая Сора, што шык ды пора, фастрыгую сыну замест квяцістай laткі бел-чырвона-белы сьцяг на сьпіну. «Цьвяток Радзімы...»

14.10. Закруціў мяне Касьмічны Віхор. Ня ведаю спакою ні ўдзень, ні ўночы. Жменямі глытаю таблеткі. Гэты Славамір — ці не Максім ён? Бо і мне ж было паказана, што некалі я была арыстакраткай.

Усё мяняецца на процілегласьць, і вось шчыры вернік становіцца шчырым бязбожнікам толькі з тым самым Нябесным Агнём у грудзёх, каб тварыць справы Боскія. І з Славамірам я пeражыла тое, што было ў мяне з Максімам некалі. Але ж я жыву на зямлі і ведаю, што воўк травы ня есьць... О, я цяпер удзячная Богу, што пeражыла тады, увесну, гэты неймаверны жах... (Бо сказана: хто ведаў Радасьць, той будзе ведаць і Жах. «За краіну радзімую жах». Шырэй ужо: за ўсю Зямлю, каб не ўзарвалі яе неразумнікі.) Бог такім чынам загартоўваў мяне. Інакш я ня вытрымала б цяперашняга не па маіх сілах напружаньня. А што ўжо да Знакаў, яны сыплюцца на мяне ці не штохвілінна.

Не разьбіраю ні дня, ні ночы, устаю з пасьцелі з чыгуннай галавой. Ні на што не стае часу. У хаце — рэзрух, дзеці — на волі. І дакранаецца ўвесь час да майго твару Нябесная павуцінка. Махну рукой — нічога няма. Так было са мною ўжо ўвесну, калі ратавала Віцю Амбражэвіча...

14-15.10. Лёгкі на ўспамін! Уваліліся ў нашую хату п'яненькія Алег Куксік зь Віцем Амбражэвічам. А Віцю я й ні разу ня бачыла дагэтуль. (Ды я, наогул, нікога ня бачыла: ні Максіма, ні Славаміра, ні Сяргея, ні Адама... З адным Зянонам толькі сфатаграфавалася ў Курапатах некалі. Ды там ён стаіць са сваёй жонкай, а я зь Віталікам збоку-прыпёку.) З выгляду Віця —горкае дзіця. Ды ён і ў сярэдзіне такі! Пачаў агітаваць майго мужа, каб той перабег рабіць начальнікам на тартак да Кадлубовіча Леаніда. Таго самага, што вываліў грошыкі на рэфэрэндум. Маўляў, дадуць катэдж і зямлю, і коней, і сьвіней... А я вінны склеп зачыніла: на чорта мне Вашае сьвінства! І выставіла апівошаў з хаты.

Дзіўна, але мая галава неяк працьвярозела пасьля візыту п'янтосаў. І я ўспомніла сьмешную і мудрую бываліцу, што расказвала мне сьвякроў. Некалі ў «Зьвязьдзе» праводзіўся конкурс зьлягчаных бываліцаў. А я паслала ім некастрыраваную. Яны зрабілі такую фасоністую міну, што той пан Быкоўскі, які не хацеў танчыць мужыцкіх танцаў. Але конкурс я зашыла, як шпаку дупу. (Зараз раскажу.)

Быў у аднаго дужа далікатнага пана шпак, які ўмеў гаварыць. І пан яго дужа шанаваў. Трымаў у залатой клетцы, карміў адмысловымі стравамі, спэцыяльнага чалавека прыставіў даглядаць за гэтай цацай. Пан быў далікатны, як я ўжо казала, то й выхаванец ягоны таксама. Каб ужо якое слова брыдкае сказаць — ані блізка! Але ж і ўеўся шпак, брыда гэткая, панскім служкам у пячонкі! Што ні ляпнуць яны па дурасьці сваёй — шпак усё даносіць пану. Бойся й рот разявіць! Тады ўчынілі парабкі скоры суд над панскім гаваруном. Накінуліся скопам і бяз брыдкага слова зашылі яму дупу. Бачыць пан: нядобрае нешта творыцца зь ягоным улюбёнцам. Нэрвуецца, крыльлем лапоча ды крычыць: «зашылі, зашылі!» І ніхто ня мог даць анiякай рады небараку. Так і сканаў ён. А каб ведаў поўгаловак той ключык, тое чароўнае брыдотненькае слоўца — жыў бы! Не пакідайце ж нашых шчырых брыдкіх словаў, каб ня ўмёрлі!

Зацемкі тутэйшага этнографа

Дзед Макар

Уладзімер Лобач

Гэтую вёску я ўпадабаў адразу, як толькі ўгледзеў яе на мапе. У адрозьненьне ад іншых, што мясьціліся сярод палёў ды лугавінаў, яна з трох бакоў была аточаная лесам. Гэта добры знак. Як правіла, людзі, што маюць за спрадвечнага суседа лес, не падобныя да «палевікоў», якія такога суседа згубілі. Жывучы на пэрыфэрыі, ускрайку поля, яны дагэтуль захоўваюць сваю таямніцу суіснаваньня з сусьветам у нязьменнай традыцыйнай чысьціні, бо сам сьвет, што разьлёгся навокал, амаль такі самы, як і тысячу гадоў таму, а гэта значыць, жывы і сапраўдны.

Ісьці было даволі далёка — больш за 15 кілямэтраў. Я ўдзячны небу, што рацыянальныя матывацыі перамагаюць далёка не заўсёды. Калі выпраўляесься ў дарогу ў пошуках таямніцы, першае, што трэба зрабіць, дык гэта... забыцца пра яе. Ідзі сабе спакойна, углядайся ў краявіды, сьпявай, рэфлексуй ці жартуй, калі ёсьць з кім. Толькі ня думай пра тое, што цябе чакае там, бо нічога ня спраўдзіцца. Прыкладам, ты ўжо дурэеш ад прадчуваньня вялізнага аб'ёму навуковае інфармацыі, які табе адкрыецца ў вёсцы Сьвяціца. Ужо мрояцца сьвятыя камяні ды прошчы, неверагодныя легенды й паданьні. Узбуджаны, ты прыходзіш у вёску і... бачыш адны толькі наетыя пысы піцерскіх «дачников». Тваёй мары, тваёй вёскі чамусьці няма...

Мы прыйшлі ў вёску надвячоркам. Студэнты, упершыню пакрыўшы пехам такую адлегласьць, прытаміліся. Гэта было заўважна па кволых, манатонных пытаньнях, якія яны задавалі ў першай хаце. Бабуля, пачуўшы пра нашыя зацікаўленьні, толькі разводзіла рукамі, альбо давала стандартныя караценькія адказы. Маўляў, сьпявалі, сьвяткавалі — нічога ня памятаю. Як водзіцца, на разьвітаньне мы запыталіся пра найстарэйшых людзей вёскі, якія б маглі нам нечым дапамагчы. Назваўшы імёны дзьвюх суседак і нават згадзіўшыся правесьці да іх, бабуля раптам перайшла на шэпт зь вельмі загадкавай, таямнічай інтанацыяй:

— Вам да Макара схадзіць нада. Ён многа знаіць, — некалькі імгненьняў бабуля вагалася, — ён чараўнік. Толькі не гаварыце, што я паслала...

Невысокі, але крамяны й каржакаваты, з кароткай срэбнай сівізной на галаве і пранізьлівым позіркам цёмных вачэй, што раз-пораз выстрэльваў з-пад ілба — дзед нібы сышоў са старонак этнаграфічных апісаньняў А.Шлюбскага, прысьвечаных моцным чараўнікам Віцебшчыны 1920-х гадоў. Надалей супадзеньне тэкставай рэальнасьці і явы стала настолькі неверагодным, што, задаючы пытаньне, я, у прынцыпе, ведаў адказ.

Дзед Макар — выбітны музыка. Скрыпка, якую зрабіў ён сам, вісела на сьцяне побач з дарагімі сямейнымі фатаздымкамі. Замест звычайных у такіх выпадках адказаў, маўляў, ня йграць — паміраць ужо трэба, дзед сваім глухаватым голасам зазначыў, што ня зможа нам «паказаць» скрыпку, бо парвалася струна, і цяпер прыйдзецца ехаць па яе ў раён.

Дзед Макар — выбітны пчаляр. Ён разумее, паважае і любіць пчалу: «Пра пчалу нельга гаварыць «здохла», а нада «памерла», як чалавек. Пчала — божае стварэньне, і Бог яе любіць». Дзед наракаў на дажджлівае лета — «не далі пчолцы папрацаваць», і тым ня менш, пачаставаў нас цэлай місай мёду. Мы трушчылі мёд вялізнымі лыжкамі, запіваючы яго халоднай вадой, а гаспадар уважліва назіраў за намі. Было зразумела, што трэба пераходзіць да «асноўнага», папытацца пра СІЛУ дзеда. Але пасьля мёду здарылася нечаканае. Пад пільным позіркам дзеда ў прыцемках ягонае хаты, прапахлай мёдам, прапалісам і зёлкамі, усе ўтрох мы пачалі засынаць. У адно імгненьне павекі наліліся нечым цяжкім, а скіўцы пачалі разьдзірацца неверагоднымі позяхамі. Уласны голас даносіўся да розуму нібы праз ватную сьцяну.

Я так і ня ўцяміў, колькі працягваўся гэты стан гіпнатычнае «падвешанасьці», але скончыўся ён гэтак жа раптоўна, як і пачаўся. Нібыта трэснулі кулаком па старым тэлевізары, і ў тым адразу зьявіўся якасны гук і выразная карцінка. А потым мы гаварылі пра сілу дзеда Макара. Сіла ягоная была «прыроднай» («бацька мог, дзед мог») і, канешне ж, ад Бога. Каб пацьвердзіць гэта, дзед расшпіліў каўнер кашулі і пачаў выцягваць з-пад яе тоўсты, з паўпальца, ланцужок зь белага мэталу. У дзедавай далоні заблішчэў адпаліраваны «георгіеўскі крыж».

— Камандзір на фронце прасіў, каб я яму на зубы аддаў. Я ж —не, гэта памяць па бацьку.

Бог дзеда — не хрысьціянскі бог. Таму дзед Макар і ня ведае малітваў ды ў царкву ня ходзіць. Ягоны Бог — такі самы стары і сівы, як і ён, што ў сваёй даўгой белай кашулі ходзіць па нашай зямлі. Праўда, апошнім часам усё радзей і радзей.

Спытаўшы пра хваробы, якія можа «адрабіць» дзед, мы пачулі ў адказ упэўненае: «Усе». Хоць праз хвіліну ён і скарэктаваў свой адказ: «Толькі таберкулёз не магу і рак, а яшчэ... — лоб дзеда зморшчыўся, — гэтага, сьпіду не магу. Ня знаю, што за балесьць такая».

Гараджанам не зразумець гэтых жывых, напаўмагічных нітак, што зьвязваюць на вёсцы «ведзьмакоў», «чараўнікоў», «знахараў», «песнахорак», «простых людзей» у рэальнасьць зусім іншага кшталту, дзе пачуцьці і інтуіцыя йграюць значна большую ролю, чым бяспройгрышная для горада рацыянальнасьць.

Жонка дзеда Макара неяк разам зь сенам занесла на двор вялікую гадзюку. Рэакцыю большасьці з нас няцяжка прадказаць, бо паміж намі і дзедам ня толькі ўзроставая мяжа:

— Я ўзяў яе пальцамі за галаву. Пагаварыў і выпусьціў з двара. Нам жа забіваць іх ніяк нельга. Тым, хто УМЕЕ... Я, калі ў лес пайду і вужаку ўгледжу, дык магу так вось, кругом яе, лінію правесьці, словы сказаць, і хоць цэлы дзень яна там будзе, нікуды ня дзенецца. А як варочаюся назад, словы скажу, і во тады яна ўжо паўзе куды хоча.

Дзед роўны з усім жывым на сваёй зямлі, бо калісьці ягоны далёкі продак адшукаў на Купальле Папараць-кветку і быў адораны найвялікшым скарбам — здольнасьцю разумець мову ПРЫРОДЫ (Лесу). І ён стаў моцны гэтаю ведай, і ён стаў чараўніком. Дзед Макар чакае, калі пасталее ягоны ўнук (неба ня дала яму сыноў), каб перадаць яму СІЛУ, бо яе ня можна ўпусьціць проста так, як ваду ў пясок, бо яна яшчэ вельмі патрэбная на гэтым сьвеце.

Разьвітваючыся, мы выйшлі на ганак. Я сфатаграфаваў гаспадара на памяць. Расчулена дзед зазначыў, што мы добрыя людзі і пашкадаваў, што ня мае пляшкі, каб пагаварыць з намі яшчэ болей. А потым ён, 82-х гадовы дзед, упершыню папрасіў: «Вы ж па дзераўнях ходзіце, дык паглядзелі б мне бабы». Калі жывы — жыцьцё мусіць быць напоўніцу.

Віліс Лацыс

КРАІНА

Ягонная эксцэленцыя міністар юстыцыі і ўнутраных справаў Тарабумбіі Бурбуліс* сядзеў у сваім службовым кабінэце і паглыбляўся ў справаздачы ведамстваў. Усё было ў парадку, выдаткі да цэнта сходзіліся з прыбыткамі, апошняя драбніца адпавядала нормам бюджэту.

Бурбуліс ужо другі год кіраваў міністэрствам унутраных справаў і юстыцыі Тарабумбіі. Цяпер яму падпарадкоўваўся ўвесь выканаўчы апарат: паліцыя, грамадзянская міліцыя, суды і турмы. І зь дзіўнай празорлівасьцю ён ужо думаў пра падпарадкаваньне сваёй кампэтэнцыі трэцяга — вайсковага ведамства. Усе ўзброеныя і юрыдычныя сілы ў адных руках! Бурбуліс — камандзір на зямлі, моры і ў небе!

У цішы кабінэта гэты чалавек захапляўся марамі, годнымі Напалеона. Праўда, ён ня ўмеў камандаваць палкамі, стратэгія і тактыка былі для яго чужымі паняцьцямі, але ў гэтым стагодзьдзі не заўсёды лёс народаў вырашаўся на полі бітвы.

Міністар гартаў адну за адной старонкі справаздачы, там-сям ставіў чырвоным алоўкам запытальнік, падкрэсьліваў адну-другую лічбу. Раптам Бурбуліс зварухнуўся, ажывіўся і зь непрыхаванай цікаўнасьцю нахіліўся над аркушам паперы.

«Дзяржаўныя турмы далі чыстага прыбытку 846255 франкаў».

Ягоную эксцэленцыю вельмі ўразіў гэты факт, гэта гучала амаль неверагодна. Бурбуліс паглыбіўся ў падрабязнасьці справаздачы турэмнага ведамства. Вялікія прыбыткі паступілі зь месцаў катаржнай працы, каменяломняў і тарфяных балотаў, але таксама й турэмныя майстэрні далі прыбытак.

— Гм...

Міністар глыбока задумаўся. Турмы аказаліся выгадным прадпрыемствам — нават пры той прымітыўнай арганізацыі, пры якой яны існавалі дагэтуль. Але каб там правесьці рэформы... усталяваць усё на асновах сучаснага грамадзтва...

Бурбуліс ускочыў, пачаў нэрвова крочыць па кабінэце. У ягоных мазгах зьявілася нейкая ідэя, настолькі сьмелая і бліскучая, што ў яе стваральніка пацямнела ў вачах ад захапленьня. Вялікая мара, — мара пра ўладу, — здаецца, збывалася.

Бурбуліс энэргічна націснуў кнопку на пісьмовым стале. Увайшоў сакратар.

— Я сёньня не прымаю. Нікога, абсалютна нікога. Паклапаціцеся, каб мне не перашкаджалі.

— Пастараюся, Ваша эксцэленцыя!

Як толькі за чыноўнікам зачыніліся дзьверы, Бурбуліс сеў за пісьмовы стол і пачаў працаваць.

* Бурбалка (латыск.)

Віліс Лацыс (1904-66), латыскі пісьменьнік. Аўтар трылёгіі «Бскрылыя птушкі», раманаў «Сын рыбака», «Бура» і іншых. Казка «Краіна турмаў» напісаная ў 1933 г. Друкуецца зь нязначнымі скарачэньнямі.

2

На пісьмовым стале ўзрастаў стос аркушаў. Позна ўначы Бурбуліс паставіў апошнюю кропку і ўздыхнуў з палёгкай.

«Ну вось і гатова. Цяпер толькі арганізаваць і запусьціць машыну...» Ён узважыў пачак паперы, усьцешаны, што зрабіў вялікую працу. Гэта быў вялізны плян, геніяльны праект, зусім новая канстытуцыя дзяржавы. Усё было пабудавана на, здавалася б, непрыкметных заўвагах у гадавой справаздачы міністэрства.

«Дзяржаўныя турмы далі чыстага прыбытку 846255 франкаў».

Турмы прыносілі дзяржаве прыбытак — ня толькі маральны, у сэнсе грамадзкай бясьпекі, але й матэрыяльны, у прыгожых звонкіх франках. Выгаднае прадпрыемства трэба было пашыраць да магчымых межаў, каб дзяржава атрымлівала з турмаў яшчэ больш прыбытку. Плян Бурбуліса прадугледжваў паступовае пераўтварэньне турмаў у грандыёзнае грамадзкае прадпрыемства.

Прадугледжвалася заснаваць апарат спэцыяльнай службы на чале з дырэкторыяй і генэральным дырэктарам. Гэты пост Бурбуліс вырашыў пакінуць за сабой. У дырэкторыю ён хацеў запрасіць асабліва карысных, дасьведчаных і ўладалюбных асобаў. Гэта былі генэральны пракурор Вярхоўнага суду Тарабумбіі Цылпа, старшыня парлямэнцкай заканатворчай камісіі Упіс, камандзір арміі і начальнік генштаба Дурэ, вярхоўны камісар грамадзкай міліцыі Вілкс, прэзыдэнт выдавецкага канцэрну Вейш і прафэсар народнай гаспадаркі Скайтліс*.

«Генпракурор Цылпа атрымае пасаду адміністрацыйнага дырэктара... — вырашыў Бурбуліс. — Яму трэба перадаць жывую сілу, працоўную армію. Парлямэнтарыст Упіс стане юрыдычным дырэктарам прадпрыемства і паклапоціцца пра прыняцьце ў парлямэнце патрэбнага нам закону. Генэрал Дурэ возьме на сябе абавязкі дырэктара па бясьпецы і прымусіць свабодных грамадзянаў Тарабумбіі паважаць аўтаномнае турэмнае прадпрыемства, а калі неабходна, нават увядзе ў дзяржаве вайсковае становішча. Вярхоўны камісар Вілкс зоймецца падтрыманьнем дысцыпліны і парадку ў сьценах прадпрыемства; яму будуць падпарадкаваныя ўсе турэмныя наглядчыкі. Прэзыдэнт выдавецкага канцэрну Вейш будзе лічыцца дырэктарам асьветы і будзе настройваць грамадзянаў прыхільна да нашых рэформаў. Прафэсар Скайтліс узначаліць грамадзкі аддзел дырэкторыі. Але я сам буду загадваць усім».

Прыняўшы рашэньне, Бурбуліс уласнаручна напісаў шэсьць лістоў аднолькавага зьместу:

«Вельмішаноўны пан! Пэўная надзвычай цяжкая справа (у маштабах усёй дзяржавы) прымушае мяне зьвярнуцца да Вас з просьбай зьявіцца на прыватную сустрэчу ў маёй рэзыдэнцыі 19 красавіка гэтага году а 21 гадз. Вельмі пажаданая пэўная канспірацыя, прынамсі, не афішуйце візыт.

З шанаваньнем міністар юстыцыі і ўнутраных справаў К.Бурбуліс».

19 красавіка ўвечары, ад якога гісторыкі Тарабумбіі пачынаюць новую эпоху ў гісторыі сваёй дзяржавы, вядомую ў падручніках пад назвай «Турэмны пэрыяд», у рэзыдэнцыі міністра Бурбуліса сабраліся ўдзельнікі нарады. У зачыненым кабінэце разьмясьціліся будучыя дзяржаўныя дырэктары. Ім падалі каву з каньяком. Тады ініцыятар сустрэчы Яго эксцэленцыя Бурбуліс узяў слова і пазнаёміў прысутных з сваім плянам. І пакуль ён гаварыў, паноў ахоплівала ўсё большае ўсхваляваньне. Прафэсар Скайтліс цёр нос, парлямэнтарыст Упіс чухаў сваю бародку італьянскага маркіза, вярхоўны камісар Вілкс ня зводзіў бліскучых вачэй з Бурбулісавага твару, а генэрал Дурэ гуляўся з ордэнамі на сваіх надзьмутых грудзях. Шэф прэсы Вейш тое-сёе запісваў у нататнік. Толькі генпракурор Цылпа сядзеў спакойна, як сфінкс, не выдаючы сваёй усхваляванасьці.

* Празьвішчы чыноўнікаў: Пятля, Філін, Кулак, Воўк, Вецер, Лічба (латыск.)

Калі Бурбуліс скончыў, паны як на каманду ўсталі і працягнулі рукі міністру:

— Мы зробім усё, што ў нашых сілах.

Быў падпісаны ўжо загадзя падрыхтаваны акт аб заснаваньні «Ўзорнай дзяржаўнай гаспадаркі». Дырэктары занялі свае кіраўнічыя пасады, і пасьля гэтага ім падалі напоі — халодныя і гарачыя.

Тарабумбія спала глыбокім сном, не здагадваючыся, што гэтай ноччу зьявілася новая ўлада, большая за ўсе ранейшыя, невядомая, нябывалая і страшная сваёй непрыкметнасьцю.

«Вось ён — адзіны дыктатар, правадыр...» — ганарліва думаў Бурбуліс, углядаючыся ў люстра пасьля адыходу дырэктараў. І здавалася так дзіўна, — неверагодна і сьмешна, — што гэты маленькі, тоўсьценькі чалавечак, што глядзеў насупраць вузкімі прыжмуранымі вочкамі, цяпер быў невядомым уладаром лёсу ўсёй дзяржавы, мільёнаў людзей і вялікіх гарадоў.

Потым ён пайшоў спаць і бачыў сны: Папа Рымскі яго каранаваў на загадчыка Сусьветнай Турмы. Зьвязка ключоў была ягонай рэгаліяй, замест дзяржавы Бурбуліс трымаў у руцэ кайданы. А скіпэтар... Тут ён прачнуўся. На двары яшчэ чарнела ноч. За вокнамі вецер шамацеў у дрэвах, і яны нізка згіналіся, нібыта засьведчваючы сваю пакорлівасьць дыктатару. Гэта было прыемна.

3

На наступны дзень усе газэты Тарабумбіі запоўніліся зьвесткамі пра зьдзейсьненыя ў дзяржаве злачынствы. Уварваньні, забойствы, гвалтаваньні, крывавыя сутычкі сп'яна і злосныя хуліганствы па ўсёй Тарабумбіі ад краю да краю... Старонкі газэтаў стракацелі яркімі апісаньнямі злачынстваў. Многія забойствы былі зьдзейсьненыя з жудасным зьверствам — ад адных апісаньняў сэрца мірнага грамадзяніна трымцела са страху.

Гэта быў адзін бок. З другога шалелі палітычныя элемэнты, разбуральнікі дзяржавы, шпіёнскія арганізацыі, фанатыкі-анархісты і падбухоршчыкі бунтаў, страйкаў і галодных шэсьцяў. Цэлы тыдзень працягвалася гэтая плынь страшных зьвестак. Здавалася, Тарабумбію канчаткова акупавалі масы злачынцаў, ніводзін грамадзянін ужо ня мог быць пэўны сваёй маёмасьці і жыцьця, — дзяржава знаходзілася на парозе нябывалага хаосу і разбурэньня.

— Чаму парлямэнт і ўрад ня рупяцца пра лёс нашай краіны? — гучалі адчайныя «галасы грамадзтва».

— Трэба пачакаць колькі дзён, — сказаў Бурбуліс. — А тады хай прагучыць «голас народу».

У газэтах сярод новых апісаньняў злачынстваў зьявіліся доўгія артыкулы, у якіх грамадзкія работнікі, юрысты і псыхіятры выказвалі свае думкі пра тое, які можна перамагчы крымінальную навалу. Калі такім чынам быў створаны неабходны настрой у народзе, Упіс вынес на разгляд у парлямэнце пытаньне аб узмацненьні барацьбы супраць злачыннасьці.

— Мы бачым, якое ўзбуджэньне ахапіла народ! І гэта зразумела: жыць у такой злавеснай атмасфэры, калі кожную хвіліну трэба чакаць найгоршага, згубіць жыцьцё або назапашаную за доўгія гады маёмасьць, — гэта не па сілах ніводнаму з нас. Ня можа быць гутаркі пра мірную працу, пра сумленнае выкананьне сваіх абавязкаў у цяню сьмерці і зьнішчэньня. Доўга гэта працягвацца ня можа, гэтай паніцы трэба пакласьці канец! Народ чакае ад нас, — ягоных прадстаўнікоў, — што мы зноў забясьпечым нармальныя ўмовы жыцьця!

Потым ён зачытаў новы законапраект. За кожны праступак былі прадугледжаныя фантастычныя прысуды — доўгія гады катаргі. Прысуды на арышт і зьняволеньне былі адмененыя, на іхняе месца ўведзена катаржная праца, прычым гэта тычылася таксама й асуджаных раней. Беручы пад увагу сёньняшняе становішча, тыя, хто адбыў свой тэрмін, не вызваляліся, бо іхняе вяртаньне на волю толькі пагражала грамадзкаму спакою і парадку. Іх трэба было абсьледаваць спэцыяльна. Дзеля гэтай мэты была заснаваная псыхіятрычная камісія, якая вызначала ступень іхняй схільнасьці да злачынства і прымала рашэньне аб вызваленьні або затрыманьні ў месцы зьняволеньня.

Законапраект быў прыняты ў тэрміновым парадку пераважнай большасьцю галасоў. Шэф прэсы Вейш і парлямэнтарыст Упіс справіліся са сваёй працай. Тады пачаў дзейнічаць генпракурор Цылпа. Судовы апарат працаваў у шалёным тэмпе. Кожны дзень засуджвалі вялікіх і малых шкоднікаў. Крадзяры, задзіры, дробныя махляры ды хуліганы з прадмесьцяў селі на лаву падсудных разам з адпетымі рэцыдывістамі. Паліцыя абкружала начлежкі, піўнухі, прытоны і маліны і без разбору саджала ўсіх, хто там трапляўся. За бадзяжніцтва пагражалі два гады катаргі — найменшы тэрмін паводле новага закону. Суд асабліва не цырымоніўся. За кароткі час лічба вязьняў у Турабумбіі падвоілася. Разам з тым падвоіліся таксама кадры наглядчыкаў, работнікаў туды набіралі з грамадзянскай міліцыі.

Каб эфэктыўна выкарыстаць засуджаных, былі пашыраныя торфаздабыча і каменяломні. Камяні і торф у значнай меры выкарыстоўвалі тут, у Тарабумбіі, але частку экспартавалі за мяжу. Пры кіраўніцтве турмаў заснавалі грамадзкі камітэт, які ўзначаліў прафэсар Скайтліс. А тады ўзяліся за вялікую працу: лесапавал, будаўніцтва чыгунак, мастоў і ТЭЦ. Дзяржава дала прыярытэт ува ўсіх сваіх працах грамадзкаму камітэту кіраўніцтва турмаў — так атрымлівалася таньней. Каб засуджаных лепш выкарыстоўваць, ім штодня ўколвалі дозу нядаўна вынайдзенай «сыроваткі працавітасьці», якая цалкам здымала стому, санлівасьць і ляноту. Дзякуючы гэтай сыроватцы катаржнікаў можна было выкарыстоўваць па шаснаццаць гадзінаў у дзень на самай інтэнсіўнай працы.

Пры пашырэньні фронту працы асабліва адчуваўся брак розных спэцыялістаў. Непазьбежна трэба было арыштаваць і засудзіць шмат інжынэраў, архітэктараў ды іншых спэцоў. Тайныя агенты грамадзянскага камітэту зьбіралі зьвесткі пра адпаведных работнікаў. Шмат хто зь іх быў беспрацоўным, але рэдка каму можна было «прышыць» які-небудзь з артыкулаў новага закону.

— Гэты закон недасканалы... — сказаў Бурбуліс на тайным паседжаньні дырэкторыі. — Нам трэба яго перарабіць. Але сьпярша выслухаем паведамленьне прафэсара Скайтліса пра грамадзкае становішча і працу прадпрыемства.

Прафэсар гаварыў больш за гадзіну.

— Цяпер у турмах Тарабумбіі знаходзіцца 15% усіх жыхароў дзяржавы. Усе яны занятыя на стваральнай працы. Нашае прадпрыемства па частках пераймае ўсю горную, лясную і торфаздабыўчую прамысловасьць. На многіх вялікіх фабрыках працуюць толькі вязьні. Цяпер вядуцца перамовы з фэрмэрамі аб выкарыстаньні засуджаных у сельскагаспадарчай працы. У сярэднім кожны засуджаны каштуе дзяржаве, — уключна з аховай і апаратам кіраўніцтва, — 1 франк 20 цэнтаў у дзень, але ягоная праца дае 3 франка 15 цэнтаў. Значыць чысты прыбытак з кожнага засуджанага 1 франк 95 цэнтаў у дзень. Апошнім часам у нас адкрыліся новыя напрамкі працы і зьявілася патрэба ў новых работніках. Але паводле зьвестак статыстычнага бюро ўвесь кантынгент злачынных элемэнтаў ужо вычарпаны. Новых вязьняў няма адкуль браць. Грамадзяне, што знаходзяцца на волі, жывуць у строгай адпаведнасьці з патрабаваньнямі дзяржаўных законаў. У такіх абставінах мы вымушаныя адмовіцца ад многіх грандыёзных праектаў, рэалізацыя якіх патрабуе многіх тысячаў рабочых рук.

Прафэсар змоўк. Генэральны дырэктар Бурбуліс хвілінку падумаў, потым спытаў з рэзкай інтанацыяй ў голасе:

— Ці ня мае што сказаць нам дырэктар Цылпа. У ягоныя абавязкі ўваходзіць забесьпячэньне працоўнай сілай.

Генпракурор шморгнуў носам, устаў і сказаў:

— Я не забыўся пра свае абавязкі. Але няхай пан дырэктар не забывае, што кожны абавязак залежыць ад права і гэтак далей. Уладу, дадзеную мне законам, я выкарыстаў ува ўсёй паўнаце. Кожнаму злачынцу прысудзіў максымальны тэрмін і толькі дзякуючы маёй пасьлядоўнасьці цяпер за кратамі 15% усіх грамадзянаў дзяржавы. Вы пытаецеся, адкуль узяць новых вязьняў? На маю думку, гэта вельмі простая справа. Калі рыбак ловіць рыбу надта рэдкай сеткай, тады ён можа злавіць толькі буйную рыбу — уся драбнейшая праходзіць скрозь сетку. Калі мы хочам сеткай сваіх судоў налавіць грамадзянаў, якія дагэтуль бяз шкоды выбіраліся адтуль, тады нам трэба сплесьці сетку з грубейшага льну і гэтай сеткай ахутаць усё жыцьцё тарабумбійцаў.

Прафэсар Скайтліс прапанаваў прызнаць беспрацоўе за злачынства, маўляў, дабрабыт дзяржавы грунтуецца на працы грамадзянаў. Абавязак кожнага грамадзяніна спрыяць росквіту сваёй дзяржавы. Але хто не працуе, той шкоднік, сабатажнік, небясьпечны паразыт, які сваім кепскім прыкладам можа сапсаваць таксама й працавітых грамадзянаў. Цяпер, калі працягваецца крызыс, беспрацоўныя складаюць прыкладна 20% ад усіх жыхароў Тарабумбіі...

Якраз 19 красавіка, праз год пасьля заснаваньня акцыйнага таварыс-

ТУРМАЎ

Казка XX стагодзьдзя

тва, выйшаў новы закон, які ўступаў у сілу з дня публікацыі. У адну ноч былі арыштаваныя 60000 беспрацоўных. На працягу тыдня пахапалі і ўсіх астатніх. 35% грамадзянаў Тарабумбіі былі цяпер ператвораныя ў вязьняў і насілі паласатую арыштанцкую вопратку.

4

Калі сьцьвярджаць, што ўсё адбывалася спакойна, без супраціву і пратэсту, гэта была б няпраўда. Ужо на пачатку пэрыяду рэформаў, калі пачаліся прысуды на доўгі тэрмін, і калі тыя, хто адбыў тэрмін, ужо не вызваляліся з заключэньня, у прэсе зьявіліся неспакойныя разважаньні, але яны толькі сталі прычынай для новага закону, які забараніў крытыкаваць захады кіраўніцтва. За невыкананьне закону пагражалі катаржныя працы да пяці гадоў. На працягу месяца былі ізаляваныя ўсе апазыцыйныя журналісты.

Вялікія хваляваньні ўзьняліся пасьля прыняцьця закону аб беспрацоўных. Прафсаюзы правялі сходы пратэсту, на палях і ў парках зьбіраліся дэманстранты, на мітынгах па-рознаму падбухторвалі супраць небывалага гвалту, які падмінаў кожны дзень усё большыя масы людзей. Але дырэкторыя толькі й чакала гэтага: адзін за адным прымаліся новыя захады. Прафсаюзы распусьцілі, арыштаваўшы ўсіх членаў; сходы і рознага роду дэманстрацыі забаранілі — за ўдзел у падобных справах пагражала катаржная праца на нявызначаны тэрмін. Гэты закон меў зваротную сілу, і тады былі кінутыя за краты многія тысячы незадаволеных грамадзянаў. Іх зьмясьцілі ў спэцтурмы, у строгую ізаляцыю, каб яны не маглі сваёй палітычнай агітацыяй сапсаваць шчырыя масы крымінальных злачынцаў.

Пасьля таго Бурбуліс скіраваў свой удар супраць парлямэнту, дзе шумелі розныя радыкалы, сацыялісты і дэмакраты. Бачачы, што знайсьці кампраміс з гэтым наўтопам немагчыма, Бурбуліс зьвярнуўся да выпрабаванага сродку: ён разагнаў парлямэнт, абвясьціўшы, што гэта непатрэбная сучаснаму грамадзтву ўстанова. Дэпутатаў пасадзілі. Так была адсунута апошняя перашкода.

Дырэкторыя, узяўшы на свае плечы ня толькі паўнату ўлады, але таксама й народнае прадстаўніцтва, магла распачаць рэалізацыю вялізнага пляну. Перш за ўсё яна зьліквідавала дзяржаўны кантроль як шкодны для інтарэсаў дзяржавы. Потым забараніла працаваць адвакатам, вельмі дасьціпна вырашыўшы гэтую праблему. Кожны адвакат, які абараняў у судзе несправядлівую справу, атрымліваў такі самы прысуд, як і ягоны кліент. Але ж генпракурор Цылпа засуджваў усіх, хто толькі трапляў у суд, таму адвакаты прызналі за разумнейшае ня брацца больш за вядзеньне справаў.

Войска ператварылі ў батальён турэмных наглядчыкаў, пакінуўшы толькі трэцюю частку для аховы межаў. Ува ўсіх канцах дзяржавы праводзілася вялікая перабудова. Вялізныя гарадзкія будынкі ператвараліся ў турмы, у полі будаваліся канцэнтрацыйныя лягеры. Гарады абкручвалі калючым дротам з токам высокага напружаньня.

Прадпрыемства расло, як рак, ахопліваючы сваімі клюшнямі ўвесь дзяржаўны арганізм. Рукі дырэкторыі дабраліся да ўсёй вытворчасьці дзяржавы, бо дзяржава лічылася адзіным спадчыньнікам маёмасьці засуджаных. Сялянаў падпарадкавалі строгай працоўнай дысцыпліне. Яны аралі, сеялі і жалі пад наглядам узброеных ахоўнікаў; кожны дзень пасьля абеду спэцыяльны фэльдшар уколваў кожнаму «сыроватку працавітасьці». Статус вязьня пачалі кваліфікаваць як ганаровы. І, на дзіва, не бракавала грамадзянаў, якія дабраахвотна працягвалі рукі, каб на іх накладалі кайданы.

Але на сьценах будынкаў, платоў і ўсіх грамадзкіх прыбіральнях зьявіўся бессаромны надпіс:

«Бурбуліс, прасьпіся ад ачмурэньня ўладай!»

Гендырэктар не зьвяртаў увагі на такія дробязі. Ён толькі афіцыйна абвясьціў сваю дыктатуру і ўзяў на сябе кіраваньне ўсімі міністэрствамі. Ад дзяржаўнага бюджэту кожны год заставалася рэшта, якую пераводзілі ў сакрэтны фонд дырэкторыі. На пачатку пятага году турэмная справа была законна прызнаная найбольш адпаведнай формай грамадзкага ладу, і ўсе грамадзяне Тарабумбіі абвешчаныя вязьнямі пажыцьцёва.

З грамадзкай думкай дырэкторыі ўжо не выпадала лічыцца, таму што не было ніякага грамадзтва, а толькі вязьні, а яны, — як прынята ўва ўсіх культурных краінах, — не лічыліся за грамадзтва.

Хоць лічылася, што ў дзяржаве ёсьць толькі адна кляса —вязьні, на самой справе іх было дзьве: правамоцныя і неправамоцныя. Правамоцная ўключала надзейных для дырэкторыі турэмных наглядчыкаў, наглядчыкаў за працай і праслойку адказных спэцыялістаў, якім для бясьпекі час ад часу гіпнозам уводзілася пакорлівасьць у дачыненьні да кіруючай клікі. Неправамоцныя падзяляліся таксама на касты абсалютна ненадзейных і трошкі надзейных. Апошнія карысталіся многімі перавагамі: ім давяраліся адказныя галіны працы, сярод іх набіралі маракоў і транспартных рабочых. Акрамя маракоў і дыпляматаў ніводзін грамадзянін Тарабумбіі ня мог пакінуць тэрыторыю сваёй дзяржавы.

Дзяржава квітнела. Тайны фонд дырэкторыі павялічваўся.

— Дыктатура — гэта найвышэйшая форма свабоды! — казаў Бурбуліс.

5

Доўгі турэмны тэрмін зьмяніў тарабумбійцаў духоўна і цялесна: гэта было зборышча мізэрных рабоў зь вялікімі, як з голаду апухлымі галовамі, па-ідыёцку аднастайнымі тварамі, змучанымі, тусклымі вачыма. Працуючы па шаснаццаць гадзін у дзень, гэтыя людзі хутка зношваліся, і да сарака гадоў станавіліся бясьсільнымі старымі.

Высокае становішча закруціла галаву гендырэктару Бурбулісу, што тлумачылася ягоным спадчынным малакроўем. Чым больш станавіліся багацьці дырэкторыі, тым больш расло і ўладалюбства Бурбуліса. Ён ужо не цярпеў побач з сабой нікога роўнага. Адно за адным ён ліквідаваў прывілеі, якімі былі надзеленыя дырэктары, турэмныя наглядчыкі ды адказныя спэцыялісты. Ён зьняў з пасады генэрала Дурэ, вярхоўнага камісара Вілкса, і генпракурора Цылпу, узяўшы на сябе іхнія абавязкі і правы. Шэф прэсы Вейш ужо даўно быў абвінавачаны ў маладушнасьці, і яго скіравалі на катаржную працу ў далёкую турму. Парлямэнтарыст Упіс памёр, а прафэсар Скайтліс захварэў на старэчую прыдуркаватасьць.

Сьвятароў закавалі ў кайданы, а турэмныя наглядчыкі мяняліся зь вязьнямі — іхнія абавязкі па чарзе выконвалі самі вязьні. Тады кожны меў магчымасьць паўладарыць над іншымі. Гэтая завядзёнка з самага пачатку паказала сваю большую карыснасьць і надзейнасьць, чымся сталы інстытут турэмных наглядчыкаў, таму што ніхто ня ведаў штучак і хітрыкаў вязьняў лепш за саміх вязьняў.

Такім чынам Бурбуліс зрабіў, на ягоную думку, вялікую працу: з усіх вяршалін ён саштурхнуў змучаны народ у бездань. Урэшце дыктатар перажыў дзень вялікага трыюмфу, калі ён адзіны ўзьняўся над наўтопам, гуртом рабоў, — неабмежаваны ўладар і адзіная вяршаліна. Але вялікі правадыр пайшоў яшчэ далей: Тарабумбію ён абвясьціў Бурбуліяй, таму што так гэта гучала больш прыемна, і ў гэтай назьве быў вядомы ўнутраны сэнс. Сталіцу ён перайменаваў у Бурбульград, як і многія іншыя значныя гарады, кожнаму зь якіх дзеля адрозьненьня надаўшы свой нумар, напрыклад, Бурбульград 1 і г.д.

6

Вынішчыўшы прывілеяваную праслойку, Бурбуліс дапусьціў вялікую памылку, наступствы якой яму трэба было б убачыць у прыкладах з сусьветнай гісторыі, — ён не захаваў прынцып раўнавагі. А зь перадгістарычных часоў да нашых дзён бачна, што самыя вялікія аўтакраты і дэспаты сваю ўладу абапіралі на пэўных клясах і праслойках людзей: войску, шляхце, царкве, буржуазіі. У сьляпым імкненьні да самаўладзьдзя Бурбуліс пакрыўдзіў усіх грамадзянаў, абразіў усіх і падштурхнуў на бунт: ён не клапаціўся пра падзел масы, пра тое, каб клопат прывілеяваных за захаваньне свайго выключнага становішча быў супрацьвагай нянавісьці прыгнечаных. І такім чынам дыктатар застаўся зусім адзін супраць усяго народу, сам са сваёй прыдуманай моцай, якая хутка аказалася фіктыўнай.

Сярод вязьняў, нягледзячы на доўгія гады, праведзеныя на катарзе, яшчэ знайшліся сьветлыя галовы, якія ўважліва сачылі за кожным крокам дырэкторыі. Калі Бурбуліс у сваёй палітычнай блізарукасьці зьліквідаваў усе грамадзкія групы, яны зразумелі, што надышла гадзіна свабоды. У турмах пачалася палкая агітацыя. Замест казаньняў кожны вечар па ўсёй Бурбуліі гучалі палымяныя прамовы бунтаўнікоў. І павольна, але грунтоўна вязьні пачалі разумець, што дыктатар — нуль, што за ім не стаіць рэальная сіла, што магутны толькі той, за кім ідзе народ. Ад яго самога залежыць — пагадзіцца з рабствам або скінуць кайданы.

На пятнаццатыя ўгодкі Бурбулійскай турэмнай дзяржавы здарыўся выпадак — зьнешне непрыкметны, але вельмі важны для далейшай гісторыі дзяржавы. Дыктатар загадаў усім сталічным вязьням сабрацца перад сваім палацам на вялізным полі, якое з усіх бакоў было абнесенае высокай загароджай з калючага дроту. З гаўбца палацу ўладар прамовіў да народу. Ён расказаў, як прамінулі пятнаццаць гадоў турэмшчыны, які парадак і спакой пануюць цяпер па ўсёй дзяржаве.

— Няма страйкаў. Усе падаткі адмененыя, бо дзяржава ўсё пакрывае з сваіх сродкаў. Галовы маладых не пакутуюць ад непатрэбных ведаў. Няма ўжо ні багатых, ні бедных, ёсьць толькі вязьні, якім даступны аднолькавы для ўсіх жыцьцёвы стандарт. Таму зьнікла зайздрасьць, узаемная нянавісьць ды іншыя злачынныя страсьці, якія нараджаюцца з чалавечай сквапнасьці. Пачалося залатое стагодзьдзе гісторыі Бурбуліі. Каб ушанаваць рэфарматара, я заклікаю прысутных гукнуць у мой гонар: «Няхай жыве Бурбуліс!»

Ён змоўк, гатовы з бацькоўскай дабрынёй выслухаць радасныя крыкі наўтопу.

Але наўтоп маўчаў. Сотні тысячаў твараў нема глядзелі на дыктатара. Бурбуліс здрыгануўся ад страшнага прадчуваньня. Тады ён закрычаў:

— Вязьні! Я вам загадваю крыкнуць у мой гонар «Няхай жыве!»

Гукаўзмацняльнікі разьнесьлі гэтыя словы па ўсім полі. Але наўтоп не зварухнуўся, ніводныя вусны не раскрыліся для крыку. Панавала такая ціша, што можна было пачуць подых людзей.

Гэта была дзіўная, небывалая, нечувальная, але страшная катастрофа. Народ не падпарадкоўваўся. Тады ў наўтопе загучаў голас:

— Што тут стаяць, пайшлі дадому!

І адразу маса зварухнулася, праз усе брамы пачала выплываць на вуліцы, павольная, спакойная і нястрымная. Дыктатара душыў страшны гнеў. Як малпа ў клетцы, ён кідаўся з аднаго кута гаўбца ў другі, махаў рукамі і крычаў:

— Назад! Я загадваю! Я ваш уладар, і вы павінны падпарадкоўвацца мне! Улада належыць мне!

Вецер сьмеху прашамацеў па вуліцах і полі. Народ трушчыў агароджы з калючага дроту, нішчыў цяжкія кайданы, ламаў замкі камэраў і пастарункаў і цэлымі вазамі вёз гэта на рэчку тапіць. На тым месцы вырас востраў. На турэмных дварах успыхнулі вогнішчы, на якіх палілі партрэты дыктатара. Нешта падобнае на веснавую паводку кацілася па вызваленай зямлі.

Дыктатар бегаў ад адной турмы да другой, даваў адзін загад за другім, сыпаў прысуды налева і направа, але народ не зьвяртаў на яго ўвагі, быццам гэта быў пусты, нябачны дух, які насіўся навокал.

— Я ваш уладар, а вы павінны мне падпарадкоўвацца! —надрываўся Бурбуліс. — Улада належыць мне!..

Народ зьнішчыў Бурбуліса поўным ігнараваньнем. Даў яму бегаць, буяніць, дэманстраваць паўсюль пустую, абстрактную сутнасьць улады і толькі пасьмейваўся з фанабэрыстых паводзінаў старога.

... Прайшлі гады. Турэмная дзяржава рухнула, і на яе руінах вырасла новая, вольная Тарабумбія. Адназвіліся навука і мастацтвы, квітнела народная супольнасьць. Усе грамадзяне сталі роўнымі перад правам і абавязкамі. Але па дарогах Тарабумбіі яшчэ доўга туляўся нейкі звар'яцелы дзядзька, брудны, зарослы шчацінай і сьмярдзючы. Ён уваходзіў у вёскі і затрымліваў кожнага сустрэчнага, гаварыў рэзка і ўладарна пра свае адабраныя правы і пагражаў.

Людзі спачувальна ўсьміхаліся і казалі:

— Гэта ж стары Бурбуліс. Той, прыдуркаваты...

Яму давалі есьці і сьцялілі дзенебудзь на падлозе. Гэта ўсё ён прымаў з урачыстым выглядам, як належнае. З раніцы ён цягнуўся далей — самотны, незразумелы і звар'яцелы.

Пераклаў з латыскай Валеры Буйвал

Занатоўкі эгаіста

Адам Глёбус

Цытаты з камэнтарамі

Сьвята любові

Прачытаў у вялікага Іса: «Жыцьцё ўсіх істотаў і стварэньняў, нават блыхі і вошы, павінна цаніцца нароўні з жыцьцём чалавека. Забіць жывое падчас злучэньня — найвялікшы грэх».

І ўспомніўся аповед дачкі пра тое, што суседка Наташа забіла злучаных белых матылькоў.

— А яны ж маглі й пажаніцца на сьвяце любові, — ушчувала васьмігадовае дзіця.

Праўда

«Да жывых варта ставіцца дабразычліва, а вось пра мёртвых трэба гаварыць толькі праўду», — прачытаў у Вальтэра і зазначыў вельмі рацыянальны падыход да ўласных паводзінаў. Адзінае, што варта дадаць, — калі зьбіраесься гаварыць праўду пра мёртвых, памятай пра ўласную сьмерць.

Півоня

«Гайдаюцца хвалямі грудзі пяшчотныя, і кроплі жаданай расы імкнуцца да самага сэрца півоні», — сказ з кітайскага рамана «Цзынь, Пін, Мэй» ілюструе асабіста для мяне дык і вельмі ярка півоню як сымбаль жаночага ўлоньня.

Гонар і слава

«Гонар больш каштоўны за славу», — сьцьвярджае Шамфор. І можна было б зь ім пагадзіцца, каб толькі займець першае і другое ў дастатковай колькасьці.

Цела

«Нябожчыкаў трэба выкідаць хутчэй, чым гной», — гаворыць Геракліт. Пярэчыць ня варта. Трэба апекавацца ўласным целам ня толькі пры жыцьці, але й пасьля яго. Варта ўслухацца ў беларускае параўнаньне — прыгожы, як труна.

Жаданьні

«Ня лепш было б людзям, каб спаўнялася ўсё, што яны пажадаюць», — заўважыў Геракліт. Сапраўды. Людзі, чые запаветныя жаданьні споўніліся, нагадваюць інвалідаў-жабракоў.

Паўсонны стан

«Ня трэба дзейнічаць і гаварыць нібыта ў сьне», — павучае Геракліт. І можна было б не спрачацца са старажытным грэкам, што толькі «для нядрэмных існуе адзіны й агульны космас (а той, хто сьпіць, павернуты ў свой уласны сьвет)», каб не паўсонны стан, у якім ты пішаш ці чытаеш таго ж Геракліта.

Пытаньне

«Толькі няправільныя, павярхоўныя пытаньні маюць адказ, а правільныя, глыбінныя адказу не знаходзяць», — казаў Крышнамурці, які спытаў: «Як гучыць хлапок адной далоні?»

Вежа

«На высокую вежу можна ўзьняцца толькі па вінтавой лесьвіцы», — афарызаваў Бэкан. Наіўны, ня ведаў ліфта.

Дзеля каго?

«Дзеля каго падмалёўвае бровы жонка сьляпога?» — пытаецца Томас Фулер. Дзеля таго самага Дон Жуана, дзеля якога сьпявае жонка глухога.

Імпэрыя

«Цяжка сабе ўявіць, што адбылося б з чалавекам, калі б ён жыў у дзяржаве, населенай літаратурнымі героямі», — піша Джозэф Адысон. На што можна сказаць наступнае... Кожны пісьменьнік шмат часу праводзіць менавіта ў такіх дзяржавах і не шкадуе, бо літаратурныя імпэрыі лепшыя за рэальныя, іх можна пакінуць у адно імгненьне.

Сяброўства

«О сябры мае, няма болей ніводнага сябра!» — любіў паўтараць Арыстотель. Падобны сумны выраз можна вымавіць толькі ў пэўным узросьце, асабіста я паўтарыў арыстоцелеву думку ў 37.

Якой веры?

Вынікі конкурсу

1. Менск. Харальная сынагога. Гэтая юдэйская бажніца была пастаўленая ў 1901 г. на колішняй вуліцы Серпухаўскай, цяпер — Валадарскага. Да яе на гэтым месцы існавала сынагога, пабудаваная ў 1879 г., але значна меншая. Такім чынам, бажніца, якую Вы бачыце на здымку, — гэта рэканструяваны на пачатку XX ст. помнік стагодзьдзя мінулага. Як слушна ўдакладніла наша чытачка Іна Гардзіевіч, новы будынак сынагогі быў фундаваны Язэпам Лунцам, менскім лекарам з дапамогаю ўсёй жыдоўскай супольнасьці Менску.

Новая Харальная сынагога адчыніла свае дзьверы для вернікаў у 1906 г. У 1923 г. яе перарабілі ў рабочы клюб. Вельмі падрабязна пра гэты помнік напісаў нам Сяргей Грынцэвіч: «... на базе рабочага клюбу пазьней быў адкрыты Дом Культуры Сакратарыяту Ц.В.К. імя Фрунзэ. У 1926 г. тут пачаў працаваць кінатэатар «Культура». У дзень яго адкрыцьця, 25 сьнежня 1926 г., тут адбылася прэм'ера першага беларускага фільма «Лясная быль» Юрыя Тарыча!». Па вайне згарэлы будынак быў перабудаваны і перададзены Дзяржаўнаму раейскаму тэатру БССР, які ў 1947 г. пераехаў у Менск. І да сёньня ў гэтым будынку месьціцца расейскі тэатр (з 1955-га — імя Горкага). Той, хто ня верыць, што гэта будынак колішняе самае вялікае сынагогі ў Беларусі, няхай зойдзе ў двор тэатра...

2. Вільня. Царква Знаменьнья Божае Маці. Была ўзьведзеная рупнасьцю Віленскага Сьвята-Духавага брацтва, якое ў 1897 г. пастанавіла збудаваць царкву. 14 кастрычніка 1899 г. архіяпіскап Віленскі і Літоўскі Ювеналій высьвяціў закладаньне бажніцы.

Будаўніцтва найбуйнейшае ў краі бажніцы ператварылася ў апафэоз ахвярнасьці і самаадданасьці праваслаўнага люду. Зямлю, якая тады каштавала 50 тыс. рублёў, ахвяраваў пад забудову апошні ўладальнік урочышча, якое тады называлася Александрыя, вядомы віленчук Мартынсон. Свой фундуш унёс і цар Мікалай II. Буйныя сумы грошай ахвяравалі масквічы: прафэсар Крукаў і інжынэр Васільеў...

Будаўніцтва царквы было закончанае ў 1903 г., у чэрвені адбылося высьвячэньне.

У інтэр'еры Знаменскае царквы знаходзіцца старасьвецкі іканастас, выраблены з моранага дубу віленскім разьбяром і жывапісцам Малокіным. У левай частцы іканастасу зьмешчаны абраз Курскае Божае Маці. Ахіяпіскап Ювеналій быў родам з Курску і хацеў мець у Вільні напамін пра сваю радзіму.

Большасьць нашых карэспандэнтаў ня здолелі слушна вызначыць гэты помнік, нягледзячы на падказку — «самая буйная праваслаўная бажніца ў краі...» Часьцей за ўсё гэты помнік блыталі з Казанскай царквою ў Менску, якая знаходзілася недалёка ад вакзалу, акурат там, дзе сёньня трамвайнае кальцо на вуліцы Мясьнікова.

3. Горадня. Лютэранская кірха. Будынак гэтае бажніцы паўстаў у 1912 г. на колішнім Якаўлеўскім праспэкце, сёньня — вуліца 1 мая.

Традыцыйна лютэране належалі ў Беларусі да нямецкае меншасьці, аднак апроч немцаў і беларусаў, лютэранства, а дакладней, эвангеліцтва (так завецца насамрэч гэтая канфэсія), вызнавалі ў нашым краі латышы, мазуры, эстонцы. Сёньня, за сьмугою часу, мы не прыгадваем, што, да прыкладу, толькі ў Менску ў Дваранскім сходзе, лютэранаў засядала 18 працэнтаў. У тым жа Менску, у сярэдзіне мінулага стагодзьдзя, былі тры лютэранскія прыходы. На пачатку XX ст. іх засталося два: Сьвятога Марціна ў раёне Лютэранскай і Нова-Нямецкай вуліцаў (сёньня раён Люксэмбург і Лібкнэхта), і Кангрэгацыі — у раёне паміж сёньняшнімі менскімі вуліцамі Маркса і Энгельса. Нашая карэспандэнты ўсе беспамылкова назвалі месца тае бажніцы, якая выяўлена на здымку — гэта Горадня...

4. Навагрудак. Мячэт. Апроч Даўбучышак, гэта другі мячэт у Беларусі, які — джума-мячэт. Гэта азначае, што ён меў уласнага муфтыя (галаву рэлігійнае і этнічнае суполак, абранага людзьмі), і паводле ісламскага права зь яго прыступак абвяшчаліся пастановы духовага і грамдзкага суду. І гэтых прыступак было заўсёды сем...

Драўляны будынак мячэта паўстаў на гэтым месцы ў 1786 г. Але пасьля ваенных навалаў і расейскіх рабаваньняў XIX ст. новы будынак навагрудзкага мячэту ўзьвялі дзякуючы фундушу Аляксандра Асановіча. Той выгляд, які Вы бачыце на здымку, мячэт набыў у пачатку XX ст. пасьля пажару 1903 г. Крыху пазьней, у 1928 г. мячэт быў паноўлены. Па вайне пашкоджаны будынак быў прыстасаваны пад амбуляторыю, а з 1952 г. у ім зробленыя кватэры.

З 1992 г. у Навагрудку дзейнічае ісламская рэлігійная суполка, якая дамагаецца вяртаньня будынку.

Досыць разгорнута пра гісторыю ісламу ў Беларусі нам напісалі і Сяргей Грынцэвіч, і Іна Гардзіевіч, і Сямён Ванькович і многія іншыя... Насуперак уяўленьням, беларускі іслам — зусім не геаграфічная навіна для тых, хто чытае «НН».

5. Слабодка. Касьцёл Сэрца Езуса. Нягледзячы на глыбокую аддаленасьць ад буйных цэнтраў, гэты касьцёл добра вядомы кожнаму, хто цікавіцца нашай спадчынай. Здымкі касьцёлу і нават асобных яго частак, а менавіта славутае каванае брамы парталу, часта зьяўляліся і на паштоўках, і на постарах, і ва ўнівэрсальных выданьнях. Таму ня дзіва, што абсалютная большасьць нашых чытачоў пазнала помнік. Касьцёл Сэрца Езуса, пабудаваны ў 1903 г. у вёсцы Слабодка на Браслаўшчыне, стаў правобразам тузіну касьцёлаў у беларускім Паазер'і.



На просьбу вызначыць стыль гэтае бажніцы адгукнулася шмат чытачоў. Ніхто не памыліўся — гэта помнік нэараманскага стылю.

Сталы ўдзельнік конкурсу Сяргей Грынцэвіч нагадаў, што такі самы паводле стылю касьцёл, пад гэткай самай назвай у 1903 г. быў пабудаваны і ў вёсцы Старыя Васілішкі на Шчучыншчыне.

6. Відзы. Царква стараверaў. Ізноў Браслаўшчына... Рэдка які кут Беларусі да такой ступені насычаны памяткамі старасьвеччыны.

Адносна гэтай бажніцы розначытаньні цалкам зразумелыя. Нашыя карэспандэнты падзяліліся ў адказах і на конт часу пабудовы і наконт канфэсійнае прыналежнасьці. Справа ў тым, што гэтая стараверская царква была закладзеная ў 1910 годзе, аднак высьвячэньне яе будоўлі адбылося ў 1912. Праект, паводле якога будаўніцтва было завершанае, склаў славуты беларускі дойлід Леў Вітан-Дубейкаўскі ў 1921 годзе!... І нарэшце, царква была адчыненая толькі ў 1923 г., а высьвечаная ў 1924-м. З-за гэткіх пэртурбацыяў даты, якія падаюцца ў спэцыяльнай літаратуры, часьцяком пярэчаць адна адной. Большасьць карэспандэнтаў памылкова прылічылі гэтую бажніцу да праваслаўнае царквы.

Сярод усіх удзельнікаў пераможцам выйшаў наш новы карэспандэнт, Іна Гардзіевіч зь Менску. Віншуем! Чакаем Вас у рэдакцыі.

Сяргей Харэўскі

Музыка

Будзе рок-н-рольны цэнтар

з жывым гукам

Фэстывальны цэнтар «Акварыюм», больш вядомы як адна зь лепшых менскіх «танцулек», выйшаў на шлях рок-н-ролу. У мінулую сераду тут гаспадарылі Алег Шараваў і «Жалезны» Глеб — людзі вядомыя сярод беларускіх фанаў. Праграма, якую прапанавалі арганізатары новага менскага клюбу ў гэты вечар, была не зусім звычайная.

Першы на сцэну выйшаў гурт «Гырб і Сын», які апошні раз выступаў у такім складзе. Пад музыку, разьлічаную на падлеткаў, дружна скакалі салідныя дамы з сваімі малінавапінжачнымі кавалерамі.

Зьдзівіў публіку і Вільям Язі, сапраўдны індзеец з племені навахa, які выконваў на флейце традыцыйныя мэлёдыі. Праўда, госьць быў прыняты без энтузіязму і хутка пакінуў сцэну.

А вось пад музыку наступнага гурта — «Partyzone» патанчыць ужо не давялося. «Цяжкі» саўнд, зграбныя кампазыцыі і вакал Уладзіміра Гнутава... Публіка брала аўтографы.

Пасьля перапынку канцэрт завяршыла вядомая ў Менску бітавая каманда «Мэтэор».

Прысутныя засталіся задаволеныя, а Алег Шараваў у канфідэнцыйнай размове паведаміў, што «Акварыюм» хутка набудзе рэпутацыю рок-н-рольнага цэнтру, тут неўзабаве прытуліцца «гасьцёўня» гурта «Крама», а гэта — цэлы шэраг канцэртаў цікавых гуртоў і жывы гук.

С.Ю.Г.В.

На здымках: «Partyzone»

Расея — зблізку

Манускрыпты зьнікаюць

Сотні бясцэнных габрайскіх рукапісаў зьніклі невядома як з Расейскай Дзяржаўнай Бібліятэкі. Справай цікавіцца контрразьведка, але сьледзтва не распачатае.

Маскоўская газэта «Коммерсант» апублікавала вынікі рэвізіі, якая праводзілася з пачатку гэтага году ў былой Бібліятэцы імя Леніна: сярод 450 тыс. рукапісаў «не знаходзілася на месцы» аж 258. У рэвізійную групу, акрамя архівістаў, уваходзілі афіцэры контрразьведкі.

Былога дырэктара бібліятэкі Ігара Філіпава звольнілі з працы ў студзені безь ніякіх канкрэтных абвінавачаньняў — за тое, што «не адпавядае займанай пасадзе». Цяпер Міністэрства культуры жадае, каб Філіпаў быў прыцягнуты да судовай адказнасьці. У той жа час контрразьведка лічыць, што няма падставаў для ўзбуджэньня сьледзтва.

Большасьць згубленых рукапісаў паходзіць з калекцыі рабіна Шнэерсона, духоўнага правадыра хасыдзкага руху Любавічэраў, а таксама габрайскага прамыслоўца з Масквы Ашэра Гінзбурга. У абедзьвюх калекцыях знаходзяцца кнігі і рукапісы хасыдаў з абшараў Вялікага Княства Літоўскага, а таксама арабскія рукапісы, што маюць дачыненьне да гісторыі габраяў. У 1991 г. расейскі Арбітражны Суд пастанавіў вярнуць калекцыю Шнэерсона ягоным сваякам, аднак Бібліятэка адмовілася. Праз год суд зьмяніў сваё рашэньне і пастанавіў пакінуць калекцыю ў Маскве.

Зь бібліятэкі — некалі найважнейшай ва ўсім СССР — зьніклі таксама рукапісы з т.зв. трафэйных фондаў, прывезеных у СССР пасьля Другой сусьветнай вайны галоўным чынам зь Нямеччыны ды Вугоршчыны. Ніхто аднак дакладна ня ведае, што згінула, бо для трафэйных зборaў ніколі не вяліся каталёгі.

— Рукапісы скралі, і гэта не сакрэт, — сказаў журналістам звольнены дырэктар Філіпаў. Зь ягоных словаў, фонды пачалі губляцца ў 70-я гады, «пры былой дырэкцыі». Часта рукапісы не клаліся на месца. — Дзьве каштоўныя кнігі мы знайшлі толькі праз 15 гадоў. Аказалася, што іх аддалі на кансэрвацыю, —цытуе Філіпава «Коммерсант».

Увосень 1994 г. дырэктар ізраільскай Габрайскай Нацыянальнай Бібліятэкі паведаміў Філіпаву, што яму прапануюць купіць рукапісы з калекцыі Гінзбурга. Шацман адмовіўся. Другі раз —увесну сёлета — Шацману прапанавалі купіць ужо ня толькі рукапісы Гінзбурга, але таксама арабскія манускрыпты і рукапісы з трафэйных фондаў. Тады Шацман праінфармаваў Інтэрпол.

Філіпаў сьцьвярджае, што пасьля атрыманьня сыгналу ад Шацмана ён паведаміў пра ўсё міністру культуры. Той спалохаўся не на жарты, бо расейскія ўлады, здаецца, двойчы абяцалі амэрыканскаму віцэ-прэзыдэнту Альбэрту Гору, што габрайскія калекцыі будуць добра захоўвацца. У той жа час у бібліятэцы тайна працуюць некалькі супрацоўнікаў контрразьведкі, але яны — нават калі нешта знайшлі — нічога ня кажуць.

Аднак супрацоўнікі бібліятэкі запэўніваюць, што габрайскія манускрыпты знаходзяцца ў будынку, але схаваныя недзе ў ягоных сутарэньнях. Схаваў іх, паводле іх словаў, памерлы сёлета дырэктар Аддзелу манускрыптаў Віктар Дзярагін. Кажуць, ён быў антысэмітам і баяўся, што калекцыі ўрэшце атрымаюць іхнія габрайскія ўладальнікі.

Конкурс

Крывіцкая Мэкка

Віленскія двары... Яны і сёньня могуць распавесьці больш, чым залітыя сьвятлом вітрынаў, чыста прыбраныя вуліцы. Сёньня віленскія вуліцы носяць іншыя назвы. Уявіце сабе, каб Багушэвіч дазнаўся, што вуліца, на якой стаяла ягоная хата, завецца ўжо ня Конскай, як яна звалася паўтысячы гадоў, а Арклю, як гэтая назва гучыць па-літоўску... А двары ніяк не называлі, а таму й не перайменоўвалі.

У дварах усё па-ранейшаму. Кажуць, што на Зарэччы ў дварах да сёньня сохне бялізна, вывешаная сто гадоў таму...

Віленскія двары зьвязаныя з Імёнамі... Тут Вам пакажуць дворык, дзе жыў Юлiюш Славацкі, альбо той, дзе жыў Рамэн Гары. А ў гэтым двары — «цэля Конрада», а ў гэтым — друкарня Скарыны... А вось у гэты двор перад арыштам апошні раз без кайданоў прыйшоў уначы Каліноўскі...

Перад Вамі адзін з самых славутых віленскіх двароў. Дзе ён знаходзіцца і зь якімі імёнамі ён зьвязаны?

Чакаем адказаў...

Сяргей Харэўскі

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны у друк 19[55], 20/10/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку" Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 6756 Кошт свабодны